Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛЮТАГА 2016 г. АЎТОРАК № 29 (28139) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Патрыярх беларускага мастацтва**

СТАР. 8



**Магілёўскае барока ці класіцызм?**

СТАР. 12




**Спартыўны старт чатырохгоддзя**

СТАР. 15

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр гандлю:**

*«Не трэба чакаць усплёску цэн. Мы вельмі доўга ішлі да той сістэмы, якая сёння існуе, пастурова, выверана прымаючы рашэнні па лібералізацыі цэнаўтварэння. Са студзеня цэны не рэгулююцца ні ў вытворцы, ні ў прадаўца. Застаўся адзін механізм для рэгулявання цэн — увядзенне маратория на асобныя групы тавараў тэрмінам да 90 дзён. Гэтыя рашэнні будуць прымацца на аснове маніторынгу, аналізу сітуацыі. Яны прымаюцца на ўзроўні пастановы Савета Міністраў. Дарэчы, па выніках студзеня цэны на прамысловыя і харчовыя тавары выраслі зусім нязначна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21892,00 | ▼ |
| Еўра | 24532,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 281,34 | ▲ |
| Укр. грыўня | 826,89 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Жыццядайнае святло



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора праваслаўныя вернікі адзначылі свята Стрэчання Гасподняга. У народзе яго завуць яшчэ Грамніцы. Лічыцца, што свечкі, прынесеныя ў гэты дзень з храма, надзелены сілай абараняць дом і ўсіх, хто ў ім жыве, ад хвароб і няшчасцяў. У сталічным прыходзе храма Іконы Божай Маці «Мінская» ўчора было шмат вернікаў.

■ Экспартны патэнцыял

# ЧАС ЗАРАБЛЯЦЬ ДОБРЫЯ ГРОШЫ

## Створаны будаўнічы холдынг, з дапамогай якога нашым прадпрыемствам стане прасцей выходзіць на буйныя праекты за мяжой

**А ўвогуле міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоль Чорны ўпэўнены, што сёлета будаўнічая галіна павінна сур'ёзна наладзіць далейшую дыверсіфікацыю тавараў і паслуг на знешнія рынкі, а для жыхароў краіны — узводзіць жыллё з мінімальнай «накруткай».**

### ДЗЯСЯТКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ — У АДНОЙ ЗВЯЗЦЫ

«Літаральна на днях мы зарэгістравалі холдынг, у які ўвайшлі 18 нашых прадпрыемстваў з агульнай колькасцю супрацоўнікаў каля 35 тысяч чалавек», — сказаў міністр. Новая структура атрымала назву «Белбудцэнтр». Холдынг створаны менавіта для развіцця экспарту будаўнічых паслуг. Кіраўніцтва галіны не збіраецца перападпарадкоўваць прадпрыемствы, бо яны застаюцца юрыдычнымі асобамі, працягваюць весці сваю эканамічную дзейнасць і ўнутры краіны і працуюць самастойна. Але дывідэнды, якія налічваюцца на працягу года, будуць ісці ў агульны фонд і назапашвацца на рахунках, каб мець эканамічныя гарантыі пры выхадзе на буйныя экспартныя праекты. Анатоль Чорны нагадаў, што сёння пры ўдзеле ў тэндарах трэба даць альбо банкаўскія гарантыі, альбо заклады (ад 5 да 10% ад кошту аб'екта).



А гэта пытанне складанае. Сёння не ў кожнага прадпрыемства ёсць магчымасць атрымаць банкаўскую гарантыю, да таго ж шэраг з іх мае вялікую дэбіторскую запазычанасць. Самастойна выходзіць на знешнія рынкі з такім эканамічным багажом праблематычна. «А цяпер у холдынгу будзе свой бюджэт, і ён зможа гэтыя грошы выкарыстоўваць як гарантыю, а значыць, удзельнічаць і перамагаць у тэндарах», — лічыць міністр.

СТАР. 6

■ Беражыце сябе!

# Своечасова пастаўлены дыягназ выратуе жыццё

## Галоўны анколаг краіны — пра дыягностыку, лячэнне і тое, як не трапіць у рады безнадзейна хворых

**Дыягназ «рак» — самы страшны для большасці людзей, пачуць яго ў свой адрас не жадае ніхто. Тым не менш толькі ў 2014 годзе з ім сутыкнуліся 46 тысяч беларусаў.**

**Ці ёсць у гэтых людзей надзея? Так, таму што на ранніх стадыях амаль любое ракавае захворванне можа быць вылечана. На ўліку ў анколагаў стаіць амаль 272 тыс. чалавек — гэта кожны 37-ы жыхар нашай краіны — і сярод іх больш за 50% пражылі пяць і больш гадоў з моманту пастаноўкі дыягназу. Пра гэта «Звяздзе» расказаў дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук прафесар Алег СУКОНКА.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Знаёмячыся са статыстыкай, разумееш, што хутка, мабыць, у нашай краіне не застанецца ніводнай сям'і, якая б не сутыкнулася тым ці іншым чынам з гэтай страшнай хваробай...***

— На жаль, рак — біч усяго чалавецтва. Традыцыйна на першым месцы заўсёды былі сардэчна-сасудзістыя захворванні. Але ўжо ў 28 краінах свету (прычым гэта вядучыя краіны) на першае месца сярод прычын заўчаснай смяротнасці выйшлі анкалагічныя захворванні. Анкалогія сёння — напрамак нумар адзін у медыцыне, самы значны па выдатках, але і самы запатрабаваны.

СТАР. 5

# Эпідэміі грыпу няма і не прадбачыцца

## Аб гэтым заявіў міністр аховы здароўя Васіль Жарко падчас даклада Прэзідэнту

**Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам міністра аховы здароўя, выказаў занепакоенасць узроўнем захворвання на грып і ВРВІ ў суседніх краінах і запатрабаваў аб'ектыўных звестак па сітуацыі ў Беларусі.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яго вельмі насцярожвае інфармацыя, якая паступае з суседняй Расіі, дзе фіксуецца вялікая колькасць людзей, якія памерлі ад ускладненняў грыпу. Вельмі няпростая сітуацыя складваецца і ва Украіне. Як было дакладжана Прэзідэнту, у Беларусі няма і не прадбачыцца эпідэміі грыпу і іншых прастудных захворванняў. Больш за тое, узровень захворвання на 10% ніжэйшы за аналагічны перыяд мінулага года. Такіх вынікаў удалося дасягнуць за кошт высокага ўзроўню імунізацыі насельніцтва ад грыпу.

Аляксандр Лукашэнка таксама быў праінфармаваны аб сітуацыі на фармацэўтычным рынку краіны, дзе па выніках 2015 года доля айчынных лекаў склала 52,6% у доларавым эквіваленце. Прэзідэнт запатрабаваў не дапускаць неабгрунтаванага росту цэн у аптэках. «Вядома, я не за тое, каб мы загналі аптэкі або іншых вытворцаў у страты. У адваротным выпадку мы будзем вымываць наменклатуру тавараў і лекаў, мы страцім гэтую наменклатуру. Ніхто ў страту працаваць не будзе, але і нажывацца за кошт гэтага, асабліва гандлюючым арганізацыям, дазволіць нельга», — перакананы кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што сітуацыя з цэнамі ў аптэках застаецца кантралюемай, але заклікае не пакідаць яе без увагі і надалей.

Акрамя таго, па выніках даклада Прэзідэнт даручыў міністру аховы здароўя сумесна з кіраўніцтвам Гомельскай вобласці прадметна прапрацаваць пытанне будаўніцтва ў Гомелі абласной дзіцячай клінічнай бальніцы, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

# СУСТРЭЧА ТЫСЯЧАГОДДЗЯ

## Як яна адаб'ецца на жыцці вернікаў і ўсяго свету?

**Днямі адбылася эпахальная падзея. Упершыню ў гісторыі дзвюх хрысціянскіх Цэркваў сустрэліся Папа Рымскі Францыск і Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл. Як гэта сустрэча паўздзейнічае на нашу рэлігійную супольнасць, грамадства і ўвогуле свет?**

— Неабходнасць сустрэчы наспела ўжо даўно і абмяркоўвалася не першы год, — гаворыць **старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускага Экзархата протаіерэй Сергій ЛЕПІН.** — Магчымай яна стала менавіта цяпер, а раней яе правесці не ўдавалася. Напрыклад, нябожчык Патрыярх Алексій ІІ яшчэ ў 1997 годзе планаваў сваю сустрэчу з Папам Янам Паўлам ІІ у аўстрыйскім Грацы, але сустрэча так і не адбылася, бо не атрымалася ўзгадніць праект рэзалюцыйнага дакумента ў пунктах, якія тычацца ўніяцкага пытання.

Па словах Сергія Лепіна, зараз зрабіць крокі насустрач адзін аднаму двух іерархаў змативала сучасная міжнародная абстаноўка. Гэта, у першую чаргу, сітуацыя на Блізкім Усходзе, дзе хрысціяне ўсіх канфесій тысячамі становяцца ахвярамі рэлігійных пераследаў і нават фізічнага знішчэння. У той жа час протаіерэй прызнаецца, што «для нас вельмі важны тэкст Сумеснай заявы Папы Рымскага Францыска і Найсвяцейшага Патрыярха Кірыла». «Ён нагадвае нам пра тое, што мы, нягледзячы на розніцу ў дактрынах, усё роўна застаёмся братамі, аб'яднанымі агульнай Традыцыяй першага тысячагоддзя існавання хрысціянства», — лічыць айцец Сергій.

У тэксце таксама падкрэсліваецца неабходнасць сумеснай працы католікаў і праваслаўных у справе абвяшчэння Евангелля ва ўсім свеце. «Мы не сапернікі, а браты: з гэтага разумення мы павінны зыходзіць ва ўсіх нашых дзеяннях у адносінах адзін да аднаго і да навакольнага свету», — гаворыцца ў дакуменце. Па словах Сергія Лепіна, прынцыповым для Царквы з'яўляецца і тое, што ў заяве асуджаецца унія як метад аб'яднання праваслаўных і католікаў.



На пытанне «Звязды», ці паўплывае сустрэча на адносіны паміж беларускімі праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі, старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела БПЦ адказвае так: «Гэта адно з тых пытанняў, на якое варта адказваць фразай «час пакажа». У сапраўдны момант праваслаўна-каталіцкія адносіны ў Беларусі і так дастаткова цёплыя, хоць, зразумела, няма мяжы дасканаласці. Спадзяюся, што праведзеная сустрэча паспрыяе справе міру — як палітычнага, так і канфесійнага».

**Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкай Царквы,** выказаў сугучную думку, каментуючы сустрэчу прадстаяцеляў: «У католікаў і праваслаўных на Беларусі заўсёды былі добрыя адносіны, але яны будуць развівацца яшчэ больш дынамічна пасля гэтай сустрэчы. Я ўпэўнены ў гэтым, таму што і католікі, і праваслаўныя павінны браць прыклад з двух пантыфікаў».

Па яго словах, падчас сустрэчы іерархі ахапілі вельмі шырокі спектр пытанняў — ад стану хрысціян на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы да падтрымкі сямейных каштоўнасцяў. Асаблівую ўвагу прадстаяцелі звярнулі на праблему вырашэння сучасных канфліктаў. «Папа і Патрыярх сумесна ўзнеслі свой голас у справе ўсталявання трывалага міру ў гэтым рэгіёне шляхам перамоў, а не эскалацыі канфлікту. Пры гэтым яны падкрэслілі, што ў нашу трывожную эпоху неабходна развіваць міжрэлігійны дыялог і ніколі не апраўдваць злачынства рэлігійнымі лозунгамі», — падкрэсліў Тадэвуш Кандрусевіч.

На думку мітрапаліта, асабістая сустрэча іерархаў «будзе спрыяць зняццю бар'ераў для больш эфектыўнага супрацоўніцтва паміж католікамі і праваслаўнымі». Вынікі гістарычнай сустрэчы Папы і Патрыярха ўжо вядомыя і «цяпер неабходна маліцца, каб свет, які стаіць на краі бездані, услухаўся ў іх голас».

— Гэта сустрэча сапраўды гістарычная для абодвух бакоў, — лічыць **Абу-Бекір ШАБАНОВІЧ, муфцій Беларусі, кіраўнік Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь.** — Я ацэньваю яе станоўча. Мы бачым, што хрысціянскі свет сёння абудзіўся дзеля не толькі ўмацавання рэлігіі, але і падтрымкі сваіх вернікаў. Зараз гэта неабходнасць. Бо мы перажываем часы выпрабаванняў, невядомых дагэтуль свету вернікаў. Яны дайшлі на такой кропкі, што неўзабаве можа распачацца вайна. І, на жаль, у яе могуць быць уцягнуты і вернікі. Бо ўсе мы адказныя за тое, што адбываецца вакол: і іудзеі, і мусульмане, і хрысціяне. Усе канфесіі. Усявышні не адрозніваe нас па веравызнанні. Толькі па сіле нашае веры і стаўленні да іншых.

Па словах муфція Беларусі, таксама вельмі важна, што сустрэча прадстаяцеляў прайшла на роўных. «Будзем прасіць Бога, каб такія крокі рабілі ўсе, у тым ліку і мусульмане. Мы таксама часта праводзім канферэнцыі, форумы, семінары, але гэта мала агучваецца і ўсе заклікі застаюцца паміж намі. Варта на ўвесь свет заяўляць, даваць ацэнкі пэўным падзеям. Напрыклад, тым, што адбываюцца зараз на Блізкім Усходзе. Яны ганьбуюць сапраўдны іслам», — упэўнены Абу-Бекір Шабановіч. На яго думку, варта было б праводзіць сумесныя сустрэчы ўсім вядучым сусветным рэлігіям і супольна даваць адказы на пытанні, якія ставіць перад грамадствам сучаснасць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# НА ЗЯМЛІ І Ў КОСМАСЕ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Дзяржаўнага ваеннапрамысловага камітэта Сяргея Гурулёва.**

Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб выкананні дадзеных ім раней даручэнняў. Гаворка ішла ў тым ліку пра перспектывы эксплуатацыі спадарожніка «Белінтэрсат-1», пасля вага запушчанага з кітайскага касмадрома «Січан» 15 студзеня гэтага года. У дачыненні да спадарожніка праводзяцца наладачныя, карэкціровачныя работы. Усе яго сістэмы знаходзяцца ў спраўным стане. З 1 красавіка ён паступіць ва ўпраўленне беларускага боку.

На тэрыторыі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці створаны наземны комплекс кіравання. Афіцыйны старт яго рабоце будзе дадзены 12 красавіка пасля планавых арбітальных выпрабаванняў «Белінтэрсата-1».

Паслугі сувязі, якія дзякуючы спадарожніку прадастаўляе Нацыянальная сістэма спадарожнікавай сувязі і вяшчання, будуць запатрабаваны як у Беларусі, так і за мяжой. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Кітай ужо заключыў з беларускім бокам дагавор на выкарыстанне 15-20% рэсурсу «Белінтэрсата». «Мы плануем праз некалькі гадоў атрымаць добры прыбытак ад работы нашага спадарожніка», — сказаў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што Беларусь даўно заслужыла права называць сябе касмічнай дзяржавай.

Аляксандру Лукашэнку таксама было даложана аб выкананні яго даручэнняў па развіцці ракетабудавання ў Беларусі. Дзяржкамваенпрам сумесна з Мінабароны працуе над стварэннем ракетнага комплексу залпавага агню дальнасцю больш за 200 км. Гэтую задачу плануецца выканаць на працягу 2016-2017 гадоў. Што тычыцца ўжо створаных ракетных сістэм залпавага агню «Паланэз», то яны прыняты на ўзбраенне і будуць пастаўлены ў войскі да 1 ліпеня.

Прэзідэнт нагадаў, што Ваенная дактрына Беларусі носіць абаронны характар. У той жа час, па словах кіраўніка дзяржавы, «трэба мець зброю, якая б усё ж такі перасцерагала патэнцыяльнага праціўніка ад таго, каб ваяваць з Беларуссю». «Мы павінны мець зброю, якая можа нанесці непрымальны ўрон гіпатэтычнаму праціўніку», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб іншых перспектыўных праектах абароннага комплексу, развіцці ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва з Расіяй, выніках фінансава-эканамічнай дзейнасці Дзяржкамваенпрама за пяцігоддзе і за 2015 год.

■ Тры пытанні да ўлады

# ХТО, ЯК НЕ МЫ?

**Мінулы год для Жодзіна быў даволі складаным. Тыя працэсы, што адбываліся ў сусветнай эканоміцы, у значнай ступені паўплывалі на работу буйных прадпрыемстваў: БелАЗа, адкрытых акцыянерных таварыстваў «Кавальскі завод цяжкіх штамповак», «Світанак». На пачатку пяцігодкі прамысловасць горада сур'ёзна развівалася, ды ў 2012 годзе пачаўся пэўны спад вытворчасці. Але кіраўніцтва горада, прадпрыемстваў і арганізацый паказала сваю дзеяздольнасць, уменне прымаць нестандартныя рашэнні, канцэнтраваць намаганні на тых напрамках, якія даюць найбольш эканамічны эфект. Як вынік, не было выпадкаў затрымкі заработнай платы, у тым ліку работнікам культуры, адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай сферы.**

**Што чакае вытворчасць сёлета і ў цэлым аб перспектывах развіцця значных для горада сфер дзейнасці, такіх, напрыклад, як жыллёва-камунальная гаспадарка, гутарка са старшынёй гарвыканкама Міхаілам АМЕЛЬЯНЧУКОМ.**



***— Міхаіл Міхайлавіч, відаць, што і гэты год будзе для эканомікі горада не менш складаным, чым папярэдні. На вашу думку, што трэба зрабіць, каб прамысловасць, так бы мовіць, утрымалася на паверхні?***

— Цяжка казаць пра тыя прадпрыемствы, якія падпарадкоўваюцца непасрэдна канкрэтным міністэрствам, як напрыклад, БелАЗ. Але відавочна адно: там працуюць даволі кваліфікаваныя кадры, моцны кіраўнічы персанал, якія сёння вядуць перамовы з многімі краінамі свету — патэнцыяльнымі спажыўцамі тэхнікі. Да нас таксама прыязджаюць шматлікія дэлегацыі, як прадстаўнік гарадской улады я ўдзельнічаю ў гэтых сустрэчах. Бясспрэчна, намячаюцца шляхі паляпшэння сітуацыі, але ад прыняцця рашэнняў да іх рэалізацыі патрэбны час, паколькі на замежных рынках сёння да ўсяго адносяцца вельмі асцярожна. Таму вытворцам складана прагназаваць дзеянні на больш-менш доўгатэрміновую перспектыву.

Разам з тым, зрухі да лепшага ёсць, што відаць на прыкладзе Кавальскага завода цяжкіх штамповак, які заключыў дагавор з расійскім КамАЗам на вытворчасць лонжэронаў — у аўтамабілю, вагонаў і лакаматываў гэта адзін з важных элементаў рам (шасі). Мяркуецца паставіць расіянам прадукцыі на 38 млрд рублёў, што азначае двухмесячны аб'ём работы для завода. Перамовы ішлі вельмі цяжка, але мы змаглі даказаць, што здольны выпускаць прадукцыю высокай якасці. Да гэтага часу 70% лонжэронаў КамАЗу пастаўляла Бельгія, а сёння завод цалкам адмовіўся ад паслуг замежных пастаўшчыкоў. Цяпер прапрацоўваецца пастаўкі трох відаў прадукцыі ў Фінляндыю. Пэўныя зрухі па рэалізацыі выпабаў ёсць і на «Світанку». Выпабляць якасныя тавары мы ўмеем, але бяда ў тым, што не навучыліся іх прадаваць. У гэтым плане, так бы мовіць, гарвыканкам пастаянна цярэбіць кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый. І па магчымасці аказваем ім дапамогу.

***— Жодзіна — бадай, ці не адзіны ў Беларусі горад, дзе практычна ліквідаваны праблемы ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Ці не так?***

— Ну, гэта перабольшванне, але шмат робіцца для таго, каб яна працавала больш эфектыўна. Сапраўды, сістэма ЖКГ была не ў найлепшым стане. У 2010 годзе, калі я заступіў на пасаду старшыні гарвыканкама, паступала шмат скаргаў на работу камунальнікаў ад жыхароў. Перш за ўсё мы зрабілі акцэнт на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. За гэтыя гады набылі дастаткова тэхнікі, што дазваляе аператыўна вырашаць праблемы. Напрыклад, падчас снегападаў не было затрымак з расчысткай асноўных магістраляў, дваровых тэрыторый. Што тычыцца гарадскіх дарог, то тут хутчэй за ўсё наспела праблема разгрузкі іх ад транспарту. Таму актыўна працуем з жыхарамі, аўтауладальнікамі, каб выслабаніць па першым часе хоць бы асноўныя праезды да дамоў.

Другі кірунак, якому ўдзяляем значную ўвагу, — эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў. У прыватнасці, працягласць гарадскіх цеплавых сетак складае больш як 200 кіламетраў. Што пайшлі па шляху іх дэцэнтралізацыі. Камунікацыі, што пракладзены ў прыватным сектары, перавялі на індывідуальныя ацяпляльныя сістэмы, а гэта 33 кіламетры. На магістральных сетках замянілі трубы на больш эканамічныя — папярэдне ізаляваныя.

Такім чынам, калі ў 2010 годзе расход вады для падпіткі сістэмы быў каля 200 тон, то цяпер зменшыўся да 25-27 тон. Падчас надаўніх маразоў скаргаў, што ў кватэрах холадна, ад жыхароў не паступала, не было ні збояў, ні аварый на цеплатрасе.

Яшчэ адзін важны аспект — цеплавая рэабілітацыя жылых дамоў, сацыяльных аб'ектаў: школ, дзіцячых дашкольных, лячэбных устаноў. За кошт уцяплення будынкаў «шубай» атрымліваем пэўную эканомію. Дазваляе эканоміць на энергарэсурсах і пераход на індывідуальныя цеплавыя пункты, як у шматкватэрных дамах, так і аб'ектах сацыяльнага, грамадскага прызначэння.

Акрамя таго, на мясцовай цеплаэлектрацэнтралі, якая забяспечвае горад цяплом і гарачай вадой, устаноўлены кацёл на мясцовых відах паліва, што дае магчымасць знізіць выдаткі на энергарэсурсы.

Такім чынам, комплекс мер дапамог стабілізаваць энергетыку. Але работы пакуль у стадыі завяршэння. Думаю, на працягу гэтага года праблемы цалкам вырашым.

***— Многія рэгіёны краіны скардзяцца на якасць вады — непрыдатная для піцця. У Жодзіне, без перабольшвання, можна сказаць, яна адмысловая. Таксама заслуга мясцовай улады?***

— Хутчэй, падарунак прыроды. Жодзіна — адзіны горад у Беларусі, дзе п'юць чыстую, нічым не апрацаваную ваду. Па меркаванні спецыялістаў, у гэтым няма патрэбы: па сваіх санітарных, хіміка-біялагічных паказчыках яна цалкам прыдатная для спажывання. Мы яе нават разліваем у бутэлькі. Па даручэнні старшыні Мінаблвыканкама Сямёна Шапіры наладзілі рэалізацыю ў Мінску.

Што тычыцца водазабеспячэння горада, то тут таксама праведзена значная работа. У нас адзін вадазабор, які здольны выдаць каля 32 тыс. кубаметраў вады ў суткі. Цяпер яго загрузка каля 20 тыс. кубоў. Так што ў нас ёсць значны запас вады. Вось толькі б навучыцца яе эканомна, беражліва расходаваць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# Выпрабаванне цыклонам «Ульрыка»

## З серады ўначы пахаладае да мінус 10-12 градусаў

**Ужо сёння паўднёвы цыклон «Ульрыка» прынясе на тэрыторыю краіны мокры снег і дождж. Гэта будзе дзень з максімальна складанымі ўмовамі надвор'я на гэтым тыдні, паведаміў <u>начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ</u>.**

Спецыяліст адзначыў, што пэўныя цяжкасці чакаюць нас ужо раніцай у аўторак, бо ўначы на 16 лютага ў многіх раёнах прагназуюцца моцныя ападкі, месцамі наліпанне мокрага снегу, туман і слабы галалёд. Мацней усяго цыклон пагаспадарыць у паўднёва-ўсходніх раёнах краіны, дзе магчыма слабая мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Днём месцамі па ўсходзе Беларусі чакаецца ўзмацненне ветру да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, а па паўднёвым усходзе будзе да 6-8 цяпла.

Не вельмі моцна палепшыцца надвор'е і ў сераду. У гэты дзень цыклон адыдзе на тэрыторыю Расіі, а на яго месца завітае антыцыклон з боку Балтыйскага мора. Надвор'е адносна стабілізуецца, але пры гэтым панізіцца тэмпература паветра. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у крайніх паўднёва-заходніх раёнах магчымы невялікі мокры снег. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 9 градусаў, а па паўночнай палове месцамі — да 10-12 марозу. Праўда ўдзень будзе ўжо ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

Амаль паўсюдна будзе гаспадарыць антыцыклон і ў чацвер. Таму будзе пераважна без ападкаў, толькі па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж), месцамі туман і галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Уначы і раніцай месцамі па захадзе Беларусі чакаецца ўзмацненне ветру да 15-18 м/с. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе мінус 2-9 градусаў, па паўночным усходзе будзе 10-12 марозу, а па паўднёвым захадзе — каля нуля. Удзень чакаецца ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

Кароткачасовыя ападкі ў выглядзу мокрага снегу і дажджу чакаюцца месцамі і ў пятніцу. Тады магчымы туман і слабы галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па ўсходзе — да 9 марозу, а ўдзень — ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

### НА ЛЁД ЛЕПШ НЕ ВЫХОДЗІЦЬ

**На большасці рэк краіны працягваецца рост узроўняў вады з інтэнсіўнасцю 1-12 сантыметраў за суткі, адзначаюць у Гідраметцэнтры Мінпрыроды.**

Цяпер вада знаходзіцца на пойме на рэках Нёман каля вёскі Беліца, Нараў каля вёскі Нямержа, Бярэзіна ў горада Беразіно, Случ каля вёскі Ленін. Спецыялісты адзначаюць, што і ў бліжэйшыя дні такі рэжым на рэках захаваецца.

Эксперты растлумачылі, што за выхадныя ачысціліся ад лёду Заходняя Дзвіна ў Віцебску і яе прыток рака Дзісна каля гарадскога пасёлка Шаркаўшчына, а таксама Нёман каля горада Масты, прытокі Прыпяці — рэкі Гарынь каля вёскі Малыя Вікаравічы і Убарць каля вёскі Краснабярэжжа. У бліжэйшыя дні ледастаў з палонкамі і закраінамі захаваецца на большасці ўчасткаў Заходняй Дзвіны, Дняпра, Бярэзіны, Сожа і некаторых іх прытоках. Таўшчыня лёду паменшылася і складае на рэках 15-19 сантыметраў, на вадаёмах — 18-26 сантыметраў. У сувязі з гэтым, у Гідраметцэнтры папярэджваюць, што выходзіць на лёд вельмі небяспечна, бо яго трываласць паступовa памяншаецца за кошт паступлення цяпла на паверхню ад нагрэтага паветра і талай вады.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя дні надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты, што рухаюцца з боку Заходняй Еўропы, і зноў больш цёплыя паветраныя масы Атлантычнага паходжання. У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (пераважна мокры снег). У асобных раёнах магчымы туман і слабы галалёд. Месцамі на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла, па паўночным усходзе пры праясненнях чакаецца да 10 марозу. Удзень прагназуецца ад мінус 1 градуса да 4 цяпла.

Дзмітрый Рабаў адзначыў карэспандэнту «Звязды», што гэта непрацяглае паніжэнне тэмпературы паветра сапраўдную зіму на тэрыторыю Беларусі не верне. Сярэдняя тэмпература паветра на гэтым тыдні ўсё роўна застанецца на 4-6 градусаў вышэй за кліматычную норму.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ВЫБІРАЕМ КНІГУ, А НЕ КАМП'ЮТАР

**«Чытаем разам з Белай Руссю» — так называецца новая акцыя, што стартавала сёлета. Дэталі праекта яшчэ прадумваюцца, але ўжо вядома, што ўвесь Год культуры ў гэтай арганізацыі пройдзе разам з добрай кнігай. Чакаюцца самыя розныя мерапрыемствы, прысвечаныя пісьменнікам, чытачам — усім аматарам добрай літаратуры.**

**Намеснік старшыні «Белай Русі» Аляксандр ШАЦЬКО** адзначыў, што да акцыі плануецца далучыць факультэт пачатковых класаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, педагагічныя каледжы, іншыя ўстановы адукацыі. Будзе праведзены конкурс "Залатое пяро", у якім зможа паўдзельнічаць моладзь да 21 года. Сёлета ключавой будзе тэма пад умоўнай назвай «Любіць кнігу». Аляксандр Шацько адзначыў:

— Асаблівую ўвагу мы плануем скіраваць на тую катэгорыю студэнтаў, якія праз хуткі час пойдуць працаваць як настаўнікі пачатковых школ, да дзетак шасці — сямі гадоў. Гэта той узрост, калі самы час прывучаць малых любіць кнігу. Бо камп'ютар — тая рэч, што прызначана больш для дарослых. А дзецям трэба сябраваць з літаратурай. Будзем далучаць да справы спецыялістаў, што працуюць у педагагічных установах адукацыі. Каб падказалі, як лепш гэта зрабіць, дапамаглі выпрацаваць пэўную метадалогію. Каб сённяшнія студэнты заўтра прыйшлі на месцы працы падрыхтаванымі і навучылі дзяцей любіць кнігі.

У межах акцыі адбыўся майстар-клас **дзіцячай пісьменніцы Наталлі ІГНАЦЕНКІ** для студэнтаў факультэта пачатковых класаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Наталля Ігнаценка перакананa:

— Калі граматна прадставіць дзіцяці кнігу — яго можна адараваць ад дысплея. Але калі ўвесь час казаць малому: «Ідзі вазьмі кнігу, пачытай», — то гэта будзе мець зваротны эфект. Менавіта з дзіцячай кнігі пачынаецца паўнавартаснае жыццё малога чалавека.

Тэлеканал «Беларусь 3» рыхтуе серыю перадач для дзяцей, дзе будуць выкарыстаны тыя адукацыйныя тэхналогіі, па якіх працуе гэтая аўтарка.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# Памяць сэрца



Фота БЕЛТА.



**15 лютага на востраве Мужнасці і смутку адбыўся ўрачысты мітынг у памяць пра загінулых пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку. На мерапрыемстве прысутнічалі намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ, міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.**


УВЕДОМЛЕНИЕ

**Наблюдательный совет**

**ОАО «Универсам Рига»**

**сообщает о проведении очередного Общего собрания акционеров, которое состоится 22 марта 2016 года в 13.00 со следующей повесткой дня:**

1. Об итогах работы Общества в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
2. Отчет Наблюдательного совета и ревизионной комиссии о проделанной работе в 2015 году.
3. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках за 2015 год.
4. Утверждение порядка распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, за 2015 год, размера и даты выплаты дивидендов за 2015 год.
5. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, на 2016 год.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Собрание состоится по адресу:
**г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».**

Регистрация акционеров (их представителей) будет проводиться в день собрания **с 12.30 до 13.00.**

<u>При регистрации акционеры обязаны предъявить</u> документ, удостоверяющий личность; представитель акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100299678 ***Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига».***


■ Рынак працы

# МОЛАДЗЬ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ СКАРАЧАЦЬ НЕ БУДУЦЬ

**Нягледзячы на эканамічна складаны год, месцаў для маладых спецыялістаў хопіць. Пра гэта заявіў старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ падчас І Форуму працоўнай моладзі. «Я кантактую з кіраўнікамі: маладыя людзі ў апошнюю чаргу разглядаюцца як кандыдаты на звальненне. Нам не хапае ініцыятывы, новых поглядаў на развіццё вытворчасці, сучасных падыходаў у маркетынгу».**

Вакансій, адзначыў мэр сталіцы, у горадзе дастаткова. Больш за тое, сёлета запланавана стварэнне 13 тысяч новых працоўных месцаў. «Але чалавек сам павінен быць зацікаўлены. Не трэба сядзець і чакаць, пакуль нехта прапануе вам працу, а варта самому праяўляць ініцыятыву. Актыўнай моладзі, якая хоча паспрабаваць сябе ў прыватным сектары, дзяржава гатова аказаць садзейнічанне. У тым ліку і стымуляваць з бюджэту, каб чалавек выпускаў нейкую прадукцыю ці аказваў паслугі і быў карысным для горада», — запэўніў Андрэй Шорац.

Мэр закрануў таксама праблему кадравага рэзерву кіруючых работнікаў.

— На жаль, «лаўка запасных» пакідае жадаць лепшага. Я год таму прасіў: пакажыце мне рэзерв. Мякка кажучы, склад беднаваты быў, як па якасці, так і па колькасці. Таму сёння казаць пра тое, што гэтыя рэзервы працуюць, не даводзіцца. Хоць хацелася б, каб былі такія актыўныя людзі, якіх можна хоць заўтра ў бой. І ў нас узнікаюць часам праблемы, калі патрабуецца кіраўнік на тое ці іншае прадпрыемства або ў адміністрацыю.

Адабраць людзей, гатовых па сваіх прафесійных якасцях стаць у рэзерв, даручылі Савету працоўнай моладзі Мінска. Андрэй Шорац у сваю чаргу паабяцаў прадаставіць магчымасць праходзіць стажыроўкі ў адміністрацыях раёнаў, гарвыканкаме і на прадпрыемствах.

Падчас форуму абмяркоўвалася і жыллёвае пытанне. Па словах **памочніка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЯКАБСОНА,** самы надзейны спосаб атрымаць свае «метры» — назапасіць сродкі і пабудаваць кватэру самому, каб ні ад каго не залежаць.

— Былі часы, калі чалавек ведаў, што абавязкова ад дзяржавы атрымае жыллё, па чарзе. Гэта чарга, як правіла, доўжылася ад 15 да 25 гадоў. Сёння ад такой практыкі адышлі, і правільна зрабілі. Так, напэўна, цяпер не ўсе могуць зарабіць на кватэру, таму прапануюцца варыянты з арэндным жыллём, ільготныя крэдытамі. У Мінску пабудавацца, вядома, складаней. Затое ў сельскай мясцовасці ёсць гатовае, добраўпарадкаванае жыллё, ёсць праца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# МАРАФОН МУЖНАСЦІ СТАРТАВАЎ У БРЭСЦЕ

**У Брэсце распачаўся маладзёжны патрыятычны праект «Марафон мужнасці». Воіны-памежнікі, навучэнцы кадэцкіх класаў, актывісты маладзёжных арганізацый сабраліся каля помніка «Героям мяжы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй зрабілі крок у бессмяротнасць», каб ускласці кветкі і запаліць лампадкі. Потым удзельнікі марафону зазірнулі да ветэрана памежных войск Мікалая Мікітавіча Мельніка і павіншавалі яго з 90-годдзем.**

У гэты ж дзень юнакі і дзяўчаты наведалі памежныя заставы Брэсцкага раёна «Цэрабунь» і «Агароднікі», дзе правялі сустрэчы з вайскоўцамі, пазнаёміліся з побытам застаў і зладзілі канцэрты.

Па словах супрацоўніцы абкама БРСМ Святланы МІРЧУК, асноўная мэта праекта заключаецца ў захаванні памяці пра гераічнае мінулае, сцвярджэнне ў маладзёжным асяроддзе павагі да гісторыі свайго народа. Марафон мужнасці прадоўжыцца да канца чэрвеня. Яго шляхамі моладзь наведае ўсе імянныя памежныя заставы, месцы баёў, будуць ускладзены кветкі да мемарыялаў і помнікаў, масавых пахаванняў. Запланаваныя сустрэчы з ветэранамі вайны і відавочцамі падзей ваеннага ліхалецця. На заставах адбудуцца патрыятычныя канцэрты.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# Кніга ў пашане

## За дні работы XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу яе наведалі больш як 40 тысяч чалавек

**Пра гэта паведаміў падчас урачыстай цырымоніі закрыцця кірмашу першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар ЛУЦКІ.**

Развітвацца заўсёды сумна. Дні працы выставы — своеасаблівыя, непаўторныя. Тут распачынаюцца важныя праекты, заводзяцца знаёмствы, напачатку зусім чужыя госці сталіцы расстаюцца сябрамі. У кірмашовай мітусні, бясконцым коле прэзентацый, сустрэч, аўтограф-сесій і майстар-класаў цяжка прыпыніцца нават на гадзіну, каб асэнсаваць, зразумець і для сябе падсумаваць пачутае і пабачанае.

Цяпер, калі кірмаш завяршыўся і экспаненты раз'ехаліся па родных гарадах, можна пагартаць набытыя кнігі, перагледзець фотаздымкі... Але пасля выставы застаюцца яшчэ і падарункі, сувеніры, а таксама ўзнагароды і дыпломы.

Фінальным акордам выставы-кірмашу стала ўрачыстая цырымонія ўручэння дыпломаў за найлепшыя экспазіцыі і дапамогу ў арганізацыі XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу. Дыпломы выканаўчай дырэкцыі за ўдзел у арганізацыі выставы атрымалі Міністэрства інфармацыі Беларусі, «Белкніга», Міністэрства культуры Арменіі, якое садзейнічала прадстаўленню краіны — ганаровага госця, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Генеральная дырэкцыя міжнародных кніжных выставак і кірмашоў Масквы, пасольствы Германіі, Францыі, Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, ЗША, Ірана ў Беларусі.

Дэпартамент сродкаў масавай інфармацыі і рэкламы Масквы быў узнагароджаны дыпломам за найлепшую экспазіцыю. У ліку адзначаных — стэнды Інстытута імя Гётэ ў Мінску, Паліграфкамбіната імя Якуба Коласа, выдавецтва «Аверсэв».

Падводзячы вынікі працы XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, першы намеснік міністра інфармацыі Ігар Луцкі нагадаў таксама, што бягучы год, Год культуры, вельмі важны для ўсіх кніжнікаў. Ён праходзіць і пад зоркамі выдатных пісьменнікаў, мастакоў, дзеячаў, чые юбілеі святкуюцца сёлета. Ігар Уладзіміравіч выказаў спадзяванне, што з завяршэннем выставы не скончыцца любоў да кнігі, а сустрэчы з пісьменнікамі працягнуць збіраць вялікую колькасць наведвальнікаў.

Кожная кніжная выстава — гэта не толькі свята, але і вялікае выпрабаванне, праверка грамадскай зацікаўленасці кнігай, спроба вызначыць узровень шырокай увагі да яе. Паказчыкі сёлетняга кірмашу — амаль рэкордныя — сведчаць пра тое, што беларусы застаюцца нацыяй, якая чытае, а нашы партнёры з розных краін з павагай ставяцца да мінскага кніжнага форуму.

Таму да сустрэчы ў 2017-м, калі наша краіна будзе адзначаць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# ГОСЦІ З ДАЛЁКАГА ПАКІСТАНА

**У Выдавецкім доме «Звязда» прайшлі перамовы з прадстаўнікамі пакістанскіх мас-медыя і навукі гэтай далёкай краіны.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Кіраўнік адной з тэлевізійных кампаній спадар празаік і публіцыст Атта-уль Хак і прэзідэнт Акадэміі літаратуры Пакістана спадар Касім Бугхія пазнаёмілі з станам інфармацыйнай прасторы ў сваёй краіне. Выказалі намер разглядаць Выдавецкі дом «Звязда», дзяржаўную літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні як пляцоўку для знаёмства і з літаратурай Пакістана, і ў цэлым — з жыццём народа і далёкай ад Беларусі краіны. Дамовілена, што першым выпускам твораў у перакладзе з урду (афіцыйная мова Пакістана) праз англійскую як мову-пасярэдніцу стане падборка твораў паэтэс Пакістана. Госці паабяцалі пазнаёміць са сваёй нацыянальнай літаратурай праз артыкулы навукоўцаў, якія яны ў бліжэйшы час дашлюць для часопісаў «Полымя» і «Маладосць».

У сваю чаргу мы хацелі б прапанаваць і часопіс «Нёман» разглядаць як камунікат у знаёмстве з пакістанскай літаратурай, — заўважыў удзельнік сустрэчы намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей Чарота. — Мы вельмі часта звярталіся да публікацый з літаратур краін Азіі, у тым ліку — Індыі, Кітая, Японіі. А вось Пакістан неяк аказваўся па-за ўвагай. Хаця ведаю, што на беларускую, напрыклад, у свой час мастацкія творы з урду перакладаў Уладзімір Шчасны.

Спрыяць развіццю беларуска-пакістанскіх літаратурных стасункаў, несумненна, будзе і той факт, што паміж міністэрствамі інфармацыі Беларусі і Пакістана заключана пагадненне аб супрацоўніцтве.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Сталічны час

# ПАЧЫНАЕЦЦА ЎСЁ З ЛЮБОВІ

## У Мінску стартавала свята роднай мовы і культуры

**Раніца суботняга дня ў сталіцы выдалася цёплай і сонечнай, здавалася, само надвор'е вабіла мінчан не сядзець дома, а выйсці ў цэнтр горада. А там іх чакала такая атмасфера любові, што і хмары, якія набеглі былі пасля абеду, не здолелі яе сапсаваць. Жыхары і госці Мінска горача прызнаваліся ў самых шчырых пачуццях — да краіны і горада, і, вядома ж, да сваіх «палавінак».**




Такім чынам у краіне стартавала рэспубліканская акцыя «Беларусь, я люблю цябе», прымеркаваная да Дня ўсіх закаханых, Міжнароднага дня роднай мовы і Года культуры, якім абвешчаны 2016-ты.

«Мы проста яшчэ раз падкрэсліваем нашу любоў да радзімы, да маці, да нашых каханых жанчын. Усё гэта робіць падмурак, на якім будуюцца ўсе астатнія пачуцці», — зазначыў на ўрачыстым адкрыцці імпрэзы **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ.**

Прапанаваная ў Год культуры творчай моладдзю ініцыятыва правесці такое «свята любові» стала выдатным працягам акцыі «Мы — разам», якая праходзіла летась са жніўня па кастрычнік. Дарэчы, менавіта з падвядзення яе вынікаў пачаліся святочныя мерапрыемствы ў межах новай акцыі. У гарадской ратушы прайшла цырымонія ўзнагароджання ўдзельнікаў акцыі «Мы — разам»: кіраўнікоў устаноў культуры, артыстаў эстрады, музыкантаў філарманічных калектываў. Міністр культуры выказаў словы падзякі ўдзельнікам акцыі і ўручыў ганаровыя дыпломы і граматы.

На думку Барыса Святлова, важна своечасова закладваць цікавыя ідэі, якія адгукнуцца ў душах і сэрцах беларусаў. Таму акцыя «Беларусь, я люблю цябе» мае на мэце прышчапіць грамадзянам любоў да свайго, роднага: культуры, мовы, песні, кнігі, кухні...

Варта адзначыць, што ўсяго гэтага на свяце было ўдосталь: падчас канцэрта гучалі песні на беларускай мове, а ў спецыяльных павільёнах можна было пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні — дранікі, мачанку, бліны.

Былі і інтэрактыўныя стэнды, на якіх можна было напісаць валянцінку з прызнаннем у любові да сваёй краіны ці проста з добрымі пажаданнямі і нават прыдумаць верш, як гэта зрабіла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

«У нашай краіне зроблена столькі прыгожага, добрага, што не толькі госці захапляюцца тым, якая сёння Беларусь, але і кожны з нас павінен сказаць: наша родная Беларусь, мы любім цябе, беражом гэтак жа, як беражом і любім родную мову. Будучыня краіны — гэта згуртаванасць, гэта калі мы разам будуем нашу краіну», — сказала міністр, вітаючы ўдзельнікаў свята.

**Першы сакратар Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі (менавіта гэтая арганізацыя ініцыявала мерапрыемствы) Андрэй БЕЛЯКОЎ** падкрэсліў, што такія святы дазваляюць сказаць цёплыя словы, прызнацца ў любові да Айчыны.


Фота Надзеі БУЖАН.

Апроч духоўнай і цалкам сабе матэрыяльнай ежы на кірмашы можна было набыць і адзенне беларускіх прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Тут жа шырока былі прадстаўлены тавары, якія сталі пераможцамі конкурсу «Народная марка».

Тэмы нацыянальнай літаратуры, творчасці беларускіх пісьменнікаў, песень, напісаных на вершы беларускіх аўтараў, сталі асновай канцэртнай праграмы. Кампазіцыі на вершы айчынных паэтаў выконвалі маладыя, але ўжо вядомыя артысты, а таксама маладзёжныя, дзіцячыя калектывы з усіх раёнаў Мінска. На свяце працаваў і кніжны павільён: сюды цягам дня завіталі беларускія літаратары, якія прэзентавалі свае кнігі і раздавалі аўтографы. Так, **старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхаіл ПАЗНЯКОЎ** зазначыў, што кніга ў наш час — запатрабаваная, яна працуе на росквіт нашай краіны. Па яго словах, беларуская літаратура сёння чытаецца больш як у 20 краінах свету.

Свята разгарнулася не толькі каля ратушы, але і непадалёк ад яе, каля Палаца спорту. А ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» творчыя калектывы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прадставілі канцэртную праграму «Моладзь — за родную песню», дзе гучалі беларускія народныя песні.

Арганізатары акцыі «Беларусь, я люблю цябе» абяцаюць даць ёй працяг, прычым не толькі ў Мінску, але і ў іншых рэгіёнах краіны. Пачаўшыся напярэдадні Дня ўсіх закаханых, яна прадоўжыцца мерапрыемствамі да Міжнароднага дня роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага. Падобныя святы будуць праводзіцца цягам усяго Года культуры.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## для атрымання вышэйшай адукацыі могуць з'явіцца для моладзі ў рамках Садружнасці

**Дакументы аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі, узгодненыя экспертамі на пасяджэнні ў Мінску, будуць унесены на разгляд Савета кіраўнікоў урадаў СНД.**

Як паведамляе прэс-служба Выканкама СНД, першы дакумент, унесены на экспертны разгляд, — Пагадненне аб прадастаўленні роўных правоў грамадзянам краін СНД для паступлення і навучання ў навучальных установах дзяржаў Садружнасці.

У праекце дакумента гаворыцца, што грамадзяне будуць мець роўныя правы для паступлення ў навучальныя ўстановы іншых краін Садружнасці на аснове ўзаемна прызнаных дакументаў дзяржаўнага ўзору аб агульнай сярэдняй або сярэдняй прафесійнай адукацыі ў межах дзяржаўных адукацыйных стандартаў (як на бюджэтныя, так і на платныя месцы). Пры гэтым у выпадку неабходнасці замежнікам будзе прадастаўлена магчымасць праходжання моўных курсаў на падрыхтоўчых аддзяленнях.

Бакі, якія падпісалі дакумент, возьмуць на сябе абавязацельствы па прадастаўленні адзін аднаму нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць правілы прыёму ў навучальныя ўстановы, афармленне і выдачу дакументаў дзяржаўнага ўзору адпаведных узроўняў адукацыі.

Акрамя таго, у перыяд навучання маладым людзям будзе гарантавана сацыяльная абарона правоў, ахова жыцця і здароўя, абарона ад усіх формаў дыскрымінацыі.

Другі дакумент — праект Палажэння аб З'ездзе настаўнікаў і работнікаў адукацыі дзяржаў СНД, у якім агаворваюцца пытанні арганізацыі з'езда, яго мэты і задачы.

Эксперты разгледзелі таксама праект Палажэння аб Міжнародным фестывалі педагагічнага майстэрства. Фестываль праводзіцца, як правіла, падчас з'езда настаўнікаў і работнікаў адукацыі. Ён скіраваны на выяўленне таленавітых і паспяховых педагогаў, распаўсюджванне іх вопыту працы на міжнародным узроўні, вызначэнне каштоўнасцяў і прыярытэтаў адукацыі ў грамадстве.

У пасяджэнні ўдзельнічалі ўпаўнаважаныя службовыя асобы Рэспублікі Арменія, Рэспублікі Беларусь, Кыргызскай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Таджыкістан, Сакратарыята Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, а таксама прадстаўнікі Выканаўчага камітэта СНД.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Своечасова пастаўлены дыягназ выратуе жыццё

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— У чым складанасць лячэння злаякасных пухлін і ці можна спадзявацца, што будуць вынайдзены лекі ад раку?***

— Справа ў тым, што не існуе і не будзе ў будучыні аднаго лякарства, якое вылечыць рак. На жаль, для кожнага чалавека неабходна падбіраць сваё лячэнне. Прычым трэба ўлічваць, што пухліна муціруе, з кожным цыклам лячэння яе агрэсіўнасць павялічваецца. Больш за тое, апошнія даследаванні паказалі, што існуюць ствалавыя клеткі — папярэднікі ракавых. Калі ў працэсе лячэння гіне асноўная маса пухліны, частка ствалавых клетак упадае ў анабіёз, у іх адсутнічаюць прыкметы жыцця, і такім чынам яны пераносяць усе нашы лекавыя ўздзеянні. Аднак пры пэўным збегу абставінаў і далучэнні некаторых знешніх альбо ўнутраных фактараў можа адбыцца актывацыя гэтых клетак і вяртанне хваробы.

**Часцей за ўсё беларускія мужчыны хварэюць на рак прастаты, лёгкага, каларэктальны рак. У жанчын найбольш частым застаецца рак малочнай залозы, цела маткі, каларэктальны рак.**

Таму сёння глабальная задача, якая стаіць перад анколагамі ўсяго свету — ранняе выяўленне раку і кантроль за ім пасля праведзенага лячэння. Чым раней хворы трапіць да спецыяліста, тым больш шанцаў перамагчы хваробу.

Пры раку 1-2 стадыі выжывальнасць складае прыкладна 90%. Лячэнне на ранняй стадыі праводзіцца ў асноўным хірургічным метадам, пры гэтым часцей можна абысціся ашчаднымі органазберагальнымі, у тым ліку лапараскапічнымі аперацыямі. А вось лячэнне 3-4 стадыі патрабуе велізарных, у дзясяткі разоў большых сродкаў. Акрамя складаных адкрытых, часта камбінаваных аперацый, прыходзіцца прымяняць хімія- і прамянёвую тэрапію. Прычым усе нашы намаганні часцяком не прыводзяць да радыкальнага вылячэння (у 4 стадыі гэта амаль немагчыма), а служаць для таго, каб падоўжыць хвораму чалавеку жыццё.

***— Што робіцца ў Беларусі для ранняга выяўлення раку?***

— З гэтага года пачнецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады, у якую па даручэнні Прэзідэнта ўключаны раздзел па скрынінгу і ранняму выяўленню анкалагічных захворванняў. Дакумент ужо знаходзіцца ў Савеце Міністраў, пад праграму плануецца выдзяленне значных дзяржаўных сродкаў.

Арганізацыя скрынінгу — гэта амаль што самае галоўнае ў ім: павінна быць неабходнае абсталяванне і падрыхтаваныя спецыялісты. У жанчын на першым месцы стаіць рак малочнай залозы, значыць, трэба аснасціць лячэбныя ўстановы сучаснымі мамографамі. Мы робім гэта, закупляючы мамографы беларускай вытворчасці, дарэчы, добрага ўзроўню. Але маленькую пухліну трэба не толькі выявіць, а і ўзяць з яе біяпсію, інтэрпрэтаваць яе, паставіць дыягназ, а значыць, патрэбны не толькі высокакваліфікаваныя рэнтгенолагі, але і марфолагі. Увесь 2015 год мы рыхтавалі такіх спецыялістаў.

Скрынінг будзе праводзіцца па 4 лакалізацыях раку, якія складаюць прыкладна 60% у структуры захворваемасці: прастаты і малочнай залозы, шыйкі маткі і каларэктальным раку. Менавіта для гэтых відаў анказахворванняў даказана карысць дзяржаўных праграм: калі правільна правяраць насельніцтва, хваробы будуць своечасова выяўляцца, пацыенты — атрымліваць адэкватнае лячэнне і ў выніку радзей паміраць.

Пры абласных і міжраённых дыспансерах мы плануем стварыць спецыяльныя лабараторыі, дзе будзем абследаваць найбольш схільных да гэтага захворвання людзей. Таксама ў бліжэйшы час пачнецца пілотны праект скрынінгу раку лёгкага ў Мінскай вобласці. Думаю, вынікі будуць. У цэлым, мы ставім перад сабой задачу выяўляць прыкладна 70% захворванняў на 1-2 стадыі. З гэтай мэтай у бліжэйшыя 5 гадоў плануем абследаваць каля траціны насельніцтва краіны.

***— Як гэта будзе выглядаць на практыцы?***

— Медыкі будуць запрашаць на абследаванне асоб з групы рызыкі. Напрыклад, жанчынам ва ўзросце ад 55 да 70 гадоў будзем праводзіць мамаграфію з мэтай ранняга выяўлення раку малочнай залозы, у другой узроставай катэгорыі — ажыццяўляць цыталагічны скрынінг раку шыйкі маткі, а мужчыны пэўнага ўзросту прайдуць даследаванні на выяўленне раку прастаты. Больш маладыя таксама хварэюць, але нашмат радзей, таму рабіць суцэльны скрынінг усяго насельніцтва немэтазгодна.

У нас ёсць канцэр-рэгістр. За многія гады мы бачым, у якіх рэгіёнах часта ўзнікаюць і якія пераважаюць пухліны, на аснове гэтага таксама будзем фарміраваць абследаванне груп практычна здаровых людзей для выяўлення захворванняў на даклінічнай стадыі.

Але ў любой краіне ёсць пэўная колькасць асоб, дзесьці 10-15%, якія ніколі не пойдуць абследавацца. Некаторыя, напрыклад, ніколі не кінуць паліць, хоць даказана, што каля 90% тых, хто захварэў на рак лёгкага, курцы. Але гаварыць з імі пра гэта бессэнсоўна, яны не спыняцца, пакуль хвароба не дасягне апошняй стадыі і дапамагчы ім стане немагчыма. Я кожны дзень сутыкаюся з такімі сітуацыямі, калі пацыентаў прыносяць на насілках, прывозяць на каталках... Таму прыходзіцца займацца лячэннем 3-4 стадый, рабіць разгромныя аперацыі, выдаткоўваць велізарныя сродкі, але з гэтым нічога не зробіш.

***— Ці ёсць у нас рэгіёны, дзе больш за ўсё хварэюць на рак?***

— Самую вялікую колькасць ракавых захворванняў (за выключэннем базаліёмы скуры, адносна дабраякаснай пухліны) мы назіраем не на Гомельшчыне, а ў Віцебскай вобласці. Вось такі парадокс: самы «чысты», здавалася б, рэгіён, а дае больш выпадкаў раку, магчыма, за кошт міграцыі насельніцтва з іншых рэгіёнаў.

***— Якія абследаванні вы парэкамендавалі б нашым чытачам, што жадаюць сачыць за сваім здароўем?***

— Рэкамендую кожнаму пасля 50-і хоць бы раз у пяць гадоў рабіць калонаскапію пад наркозам, каб пазбегнуць раку кішэчніка, які мы апошнім часам усё часцей выяўляем, але, на жаль, нярэдка на позніх стадыях. Некаторым нашым установам аховы здароўя неабходна яшчэ абзавесціся абсталяваннем і спецыялістамі для правядзення падобных працэдур, каб людзі мелі магчымасць звяртацца і не запускаць хваробу.

Жанчынам да 40 гадоў трэба штогод рабіць УГД малочных залоз, пасля 50-і — мамаграфію, нават калі доктар не назначае. Калі ў жанчыны маці, цётка, сястра хварэла на рак грудзей, абследаванне малочных залоз трэба пачаць рабіць раней. У рамках скрынінгу ў анкалагічных установах мамаграфію можна прайсці бясплатна, але ёсць платная альтэрнатыва ў іншых клініках, прыватных медцэнтрах.

***— Ці дажывём мы да часоў, калі можна будзе паставіць дыягназ па кроплі крыві?***

— Ужо цяпер аналіз крыві дазваляе выявіць асаблівыя рэчывы (анкамаркеры), якія выпрацоўвае пухліна. На мой погляд, ужо ў бліжэйшай будучыні такія аналізы заменяць на ранніх этапах іншыя абследаванні — мамаграфію, калонаскапію і г.д. Гэта маё асабістае меркаванне. Зараз добра масава працуе аналіз на ПСА для выяўлення раку прастаты, і даволі добра — СА-125, накіраваны на выяўленне раку яечнікаў.

Мяркую, хутка дастаткова будзе здаць аналіз крыві, спецыяльная машына прааналізуе па ім сітуацыю, якая склалася ў арганізме, і выдасць рэкамендацыі, які орган выклікае апасенні і, адпаведна, мае патрэбу ў больш дэталёвым абследаванні. Мы гэта ўжо робім, але цяпер эфектыўнасць анкамаркераў у практычным прымяненні яшчэ дастаткова нізкая. Мы працуем над павышэннем іх эфектыўнасці.

***— Якое новае лячэнне выкарыстоўваецца ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі?***

— Наш цэнтр — не звычайная бальніца. У нас штат супрацоўнікаў складаецца з дактароў і навукоўцаў, працуе шмат аўтарытэтных вучоных. Мы апрабоўваем навінкі, актыўна ўкараняем і свае распрацоўкі, а потым распаўсюджваем іх на ўсю краіну.

Зараз мы ўступаем у эру персаніфікаванай медыцыны, калі кожны пацыент атрымлівае сваё індывідуальнае лячэнне. На вялікае шчасце, наша краіна не адстае ад замежных дзякуючы стварэнню і ўвядзенню ў строй у нашым цэнтры ўнікальных устаноў. Я кажу зараз не столькі пра Цэнтр ПЭТ (такія за мяжой існуюць ужо даволі даўно). Але мы стварылі малекулярна-генетычную лабараторыю канцэрагенезу, якая дазваляе падбіраць лячэнне індывідуальна.

У ідэале, аналізы кожнага нашага пацыента павінны праходзіць праз гэтую лабараторыю для вызначэння малекулярна-генетычнага профілю пухліны, і на падставе гэтага падбіраюцца лекі. У будучыні будзем з дапамогай лабараторыі падбіраць і дозу апраменьвання, і дозу хіміятэрапіі, а таксама кантраляваць эфектыўнасць лячэння. Гэтая лабараторыя — нашы «вочы і вушы».

**Рак — другая па частаце прычына смерці беларусаў.**

Беларусі сёння няма роўных на постсавецкай прасторы ў пытаннях эфектыўнага лячэння анкалагічных захворванняў. Штодня да нас прыязджаюць лячыцца каля 50 замежных грамадзян, у асноўным расіян. Таму ў бліжэйшых планах — будаўніцтва пансіяната для пацыентаў і іх родных, у тым ліку замежнікаў. Дзяржава ўкладвае вялікія сродкі ў анкалогію, але мы даём і аддачу. Летась наш цэнтр зарабіў для краіны больш за 3,7 млн долараў. 60% заробленых сродкаў ідуць у бюджэт дзяржавы, астатняе дастаецца цэнтру. Зароблены грошы — гэта перш за ўсё развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы і зарплата нашых супрацоўнікаў.

На сёння ў нас ёсць усё, што неабходна для дыягностыкі і лячэння раку. Нават самыя складаныя напрамкі, такія як нейраанкалогія, уключаючы вертэбралогію (пухліны пазваночніка), мы развіваем, купляем адпаведнае абсталяванне і дасягаем поспехаў. Усіх стапрацэнтна вылечыць немагчыма ні ў адной краіне свету. Тым не менш я працую ў анкалогіі ўжо шмат гадоў, і хачу сказаць, што калі пачынаў, то не мог і падумаць, што мы дасягнем тых поспехаў, якія маем сёння.

**Святлана БУСЬКО.**
busko@zviazda.by




Фота Надзеі БУЖАН.

### Даведка «Звязды»

*Алег Суконка ў медыцыне амаль 40 гадоў. Пасля заканчэння Віцебскага медінстытута працаваў у Оршы ўролагам. У пачатку 80-х прайшоў стажыроўку па анкаўралогіі, з 1984 года працуе ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Прайшоў шлях ад урача-ўролага і малодшага навуковага супрацоўніка да загадчыка аддзялення анкаўралогіі і загадчыка аддзела анкаўралагічнай паталогіі. З 2010 года — дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава.*

*Абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, прысвечаныя лячэнню хворых на рак ныркі. Прымае актыўны ўдзел у кангрэсах Еўрапейскай асацыяцыі ўролагаў, Амерыканскай уралагічнай асацыяцыі і Расійскага таварыства анкаўролагаў. У 2009—2010 гадах упершыню на еўрапейскім узроўні прадставіў вынікі беларускіх навуковых даследаванняў па анкаўралогіі. Аўтар больш чым 250 навуковых прац, 2 манаграфій, 4 патэнтаў.*

*Падчас працы выканаў больш за 3000 аперацый, укараніў у клінічную практыку шэраг складаных пашыраных і органазберагаючых аперацый пры раку ныркі.*

*Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». Жанаты, ёсць дачка.*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## 35 МІЛЬЁНАЎ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ

**заплаціў Магілёўскай мытні грамадзянін Новай Зеландыі за пакінуты ў краіне матацыкл.**

Па заканадаўстве Еўразійскага эканамічнага саюза замежным гасцям можна наведваць Беларусь на сваіх транспартных сродках без усялякіх мытных плацяжоў. Але пры ўмове, што да заканчэння тэрміну часовага ўвозу яны павінны быць вывезены. У іншым выпадку мытныя плацяжы ўсё ж такі давядзецца плаціць.

Містар Джон Н. з Новай Зеландыі, які ўлетку перасякаў беларускую мяжу на сваім матацыкле SUZUKI DL 1000, ведаў пра гэтыя патрабаванні, але праігнараваў іх. Калі прыйшоў час вярнуцца на радзіму, ён узяў квіток на самалёт, а матацыкл пакінуў у Беларусі. Гэты факт не схаваўся ад вачэй супрацоўнікаў Магілёўскай мытні, і ліст з напамінам паляцеў у Новую Зеландыю. Прыемна, што мотааматар прызнаў сваю віну, адразу ж прыслаў на электронны адрас мытні прабачэнні за свае халатнасць і пагасіў усю мытную запазычанасць у памеры 35 мільёнаў рублёў.

На жаль, такая няпамятлівасць сярод замежных уладальнікаў асабістых аўто не адзінкавы выпадак. Лісты з заклікам аплаціць запазычанасць накіроўваюцца мытнікамі ў Германію, Галандыю, Бельгію, Польшчу, Літву, Латвію і іншыя краіны. Па інфармацыі прэс-службы Магілёўскай мытні, за ўвесь мінулы год з замежных грамадзян, якія парушылі ўстаноўлены тэрмін часовага ўвозу транспартных сродкаў для асабістага карыстання, у бюджэт краіны было спагнана больш за 2 мільярды рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

## ЧЫПСЫ — У КОЖНУЮ КРАМУ

**Усе айчынныя прадпрыемствы гандлю з 10 сакавіка абавязаны мець у продажы чыпсы з сырой бульбы.**

Гэты прадукт уключаны ў асартыментныя пералікі тавараў рознічных гандлёвых аб'ектаў розных відаў і тыпаў. Адпаведнае рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства гандлю, якая апублікавана на Нацыянальным прававым партале і ўступіць у сілу праз месяц.

Традыцыйна вытворцы пры вырабе чыпсаў выкарыстоўваюць як сырую бульбу, так і пелеты, якія робяцца з бульбяной і зерневай сыравіны шляхам экструзіравання (працісканне масы праз фармуючую адтуліну) і сушкі. Тэхналагічна вытворчасць чыпсаў з пелет прасцейшая і больш выгадная.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

# ЧАС ЗАРАБЛЯЦЬ...

## АПТЫМІЗАВАЛІ ШТАТ

Анатоль Чорны праінфармаваў, што зніжэнне на 20% інвестыцый, што прыцягваюцца ў цэлым у эканоміку, адбіліся і на дзейнасці будаўнічага комплексу. Таму летась прадпрыемствы галіны былі недазагружаныя і займаліся пошукам працы.

У такіх умовах трымаць «раздзьмуты» штат стала недазвальняльнай раскошай. А ў выніку было вырашана стабілізаваць колькасць работнікаў будаўнічага комплексу. Калі ў пачатку 2014 года ён налічваў 200 тысяч чалавек, то летась было ўжо 198 тысяч. «Практычна з такой колькасцю мы і завяршылі мінулы год. Намі была дасягнута пэўная раўнавага, праведзена рэструктурызацыя прадпрыемстваў. Давялося правесці аптымізацыю на некаторых спецыяльнасцях», — сказаў Анатоль Чорны.

## ЗНІЗІЦЬ САБЕКОШТ ДАПАМОГУЦЬ ТОРФ І... СМЕЦЦЕ

Міністр адзначыў, што яшчэ пару гадоў таму цэмент і шкло былі галаўным болем галіны, але за апошні час сітуацыя тут значна палепшылася.

Напрыклад, у 2013 годзе сабекошт беларускага цэменту складаў 80 долараў за тону (у эквіваленце), а ў апошні месяц 2015-га — ужо 41,9 долара. Плануецца, што сёлета да красавіка ў Беларусі атрымаецца знізіць сабекошт цэменту да 35 долараў. Значнага зніжэння затрат удалося дасягнуць за кошт працы з пастаўшчыкамі сыравіны:

— Шляхам перамоў мы дабіліся зніжэння кошту сыравіны. У мінулыя гады цэментныя заводы закуплялі вугаль па коште каля 100 долараў за тону. Калі мы выйшлі на прамых пастаўшчыкоў, цана знізілася ўдвая, а гэта дало зніжэнне сабекошту цэменту, — сказаў Анатоль Чорны.

**Плануецца, што сёлета да красавіка ў Беларусі атрымаецца знізіць сабекошт цэменту да 35 долараў.**

Таксама дапамагла актыўная праца над выкарыстаннем мясцовых відаў паліва. Цяпер на кожным з трох беларускіх цэментных заводаў (у Крычаве, Касцюковічах, Краснасельску) зрабілі і дзейнічаюць устаноўкі па спальванні торфу. А гэта дазваляе замяніць 20% імпартнага вугалю ўласнай сыравінай з больш нізкім коштам. Толькі сёлета за кошт замены вугалю цэментныя прадпрыемствы атрымаюць эканомію ў 11 мільёнаў долараў.

Яшчэ адным спосабам эканоміі можа стаць выкарыстанне RDF-паліва, якое магчыма рабіць са смецця. Дарэчы, у краінах Еўропы на цэментных заводах асноўным кампанентам энерганосьбітаў з'яўляецца менавіта такое паліва. А ў нас першыя крокі ў гэтым напрамку зрабілі ў Магілёўскай вобласці. Сёлета ў гэтым рэгіёне плануюць атрымаць пробны варыянт RDF-паліва. У перспектыве можна перавесці ўсе тры заводы на стапрацэнтнае спальванне смецця.

Увогуле па вытворчасці цэменту ў нас нават залішняя магутнасці. Спажываем мы ў краіне не больш за 4 млн тон цэменту, а маем аб'ём вытворчасці толькі сухім спосабам 6,6 млн тон. Сёння заводы ў стане прадаваць цэмент з прыбыткам у Расію. Толькі сёлета туды плануецца экспартаваць каля 1,2 млн тон. Аднак на расійскім рынку нашым вытворцам вельмі складана канкураваць з мясцовымі з-за больш нізкіх цэн на энерганосьбіты. Таму вядзецца актыўная работа па дыверсіфікацыі збыту. Напрыклад, сёлета плануецца прадаць каля 500 тысяч тон на рынкі Еўропы.

## ВЫЙШЛІ НА ПЛЮС І ПА ШКЛЕ

У пачатку 2014 года сабекошт беларускага шкла складаў 2,8 долара за квадратны метр, а прадавалі яго за 1,7 «зялёнага», каб пазбавіцца ад складскіх запасаў. Сёння сабекошт нашага шкла складае ўжо 1,96 долара пры цане на рынку 1,98 долара. Прыбытак невялікі, але добра, што ён з'явіўся.

Значна палепшылася становішча «Гомельшкла», у тым ліку за кошт падаражэння шкла на еўрапейскіх рынках. Цяпер рыхтуюцца да падпісання кантакты на пастаўкі беларускай прадукцыі ў Польшчу і Германію ў аб'ёме 8,5 млн квадратных метраў шкла. Акрамя таго, заключаны кантракты з Украінай на пастаўку 13 млн квадратных метраў шкла, невялікі аб'ём прадукцыі пастаўляецца ў Турцыю і Італію. «Большую частку атрыманага на заводах шкла мы ўжо цяпер прадаём на маржынальныя рынкі і не залежым ад курсу расійскага рубля — тут у нас стабільныя кантракты ў доларах і еўра», — падкрэсліў міністр.

Працягваецца мадэрнізацыя завода. У планах на другое паўгоддзе скончыць наладку і запуск лініі па вытворчасці энергаэфектыўнага шкла. Гэта дазволіць не толькі знайсці новыя рынкі для экспарту, але і адмовіцца ад дарагога імпарту, бо зараз энергаэфектыўнае шкло Беларусь закупляе за мяжой. Новая лінія дасць магчымасць вырабляць на першым этапе каля 4 млн квадратных метраў такога шкла з магчымасцю давядзення аб'ёму да 8 млн квадратных метраў. «Гэта дазволіць выйсці на дадатковыя рынкі, ужо ёсць папярэднія кантракты на пастаўкі энергаэфектыўнага шкла на экспарт», — растлумачыў сітуацыю Анатоль Чорны.

## ТРЭБА БРАЦЬ АБ'ЕКТЫ «ПАД КЛЮЧ»

Далейшая мадэрнізацыя асноўных заводаў і аптымізацыя штату ўсіх праблем галіны не вырашыць. Застаюцца цяжкасці з вырабам цэглы і керамікі. Таксама заводы, якія маюць выгадныя кантракты, сёння паказваюць не лепшыя вынікі фінансавай дзейнасці. У прыватнасці, цэментныя заводы, якія працуюць з рэнтабельнасцю продажаў ад 3% да 8%, лічацца стратнымі.

«Работнікам прадпрыемства цяжка гэта прызнаць. Яны вырабляюць, прадаюць і ўсё роўна атрымліваюць страты. Але страты, якія паказваюцца ў справаздачах, узнікаюць па прычыне абслугоўвання раней узятых крэдытаў. Калі б не было крэдытаў, то прадпрыемствы былі б прыбытковымі», — патлумачыў міністр.

Анатоль Чорны адзначыў, што кіраўніцтва Мінбудархітэктуры актывізавала працу па выхаду на новыя рынкі. Сёлета за экспарце будаўнічых паслуг галіна рэальна разлічвае атрымаць даход 100,3% у грашовым вымярэнні да ўзроўню 2015 года, нягледзячы на ваганні курсу расійскай валюты. У 2015 годзе заданне па экспарце было выканана толькі на 85% да ўзроўню 2014 года. «Калі б курс так моцна летась не вагаўся, то паказчык быў бы на ўзроўні 104%», — упэўнены кіраўнік галіны.

Сёння прадпрыемствы адразу трох рэгіёнаў Беларусі ўдзельнічаюць у будаўніцтве жылля ў Калужскай вобласці Расіі. У перспектыве гэта будзе цэлы жыллёвы комплекс з колькасцю не менш як 6 шматпавярховых дамоў. І галоўнае тут у арганізацыі ўсяго працэсу будаўніцтва з далейшай рэалізацыяй ужо гатовых аб'ектаў. А такую задачу нашы прадпрыемствы могуць выканаць толькі ў складзе адзінага магутнага холдынгу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Сітуацыя

# МАДЭРНІЗАЦЫІ ПАТРАБУЕ... МЕНЕДЖМЕНТ

## Як разблытаць «клубок» праблем у «Мастоўдрэве»?

**Вялізныя сродкі, у тым ліку дзяржаўнай падтрымкі, затрачаны на мадэрнізацыю дрэваапрацоўчай вытворчасці ў горадзе Масты, каб выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю, запатрабаваную на айчынным і замежных рынках. І разам з тым забяспечваць працай і дастойнай зарплатай шматлікіх работнікаў горадаўтваральнага прадпрыемства. Аднак належнай аддачы ад фінансавых затрат пакуль няма. Вытворчыя магутнасці, у тым ліку створаныя ў рамках мадэрнізацыі, загружаны слаба. Сабекошт прадукцыі высокі, а яе збыт — нізкі. Адпаведна, не хапае грошай на зарплату і абавязковыя разлікі.**


Фота БЕЛТА.

Што ж перашкаджае эфектыўнай рабоце прадпрыемства і як распутаць «клубок» праблем? Гэтыя пытанні абмеркавалі на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці з удзелам кіраўнікоў ААТ «Мастоўдрэў», прадстаўнікоў мясцовай улады, канцэрна «Беллесбумпрам», ААТ «Банк развіцця» і іншых структур.

### ПРЫЧЫНЫ НЕ ТОЛЬКІ АБ'ЕКТЫЎНЫЯ

**З матэрыялаў праверкі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці**

*Страты ад рэалізацыі прадукцыі за мінулы год склалі ў ААТ «Мастоўдрэў» 64,6 мільярда рублёў. Загрузка вытворчых магутнасцяў па вытворчасці пліт МДФ, ХДФ — 30,6%, падлогавых пакрыццяў — 5,3%. Сабекошт на 1 рубель прадукцыі ў студзені—лістападзе 2015 года ў параўнанні з тым жа перыядам папярэдняга павялічыўся на 4,5%. Абаротныя сродкі вымываюцца непрадукцыйнымі расходамі: за 2013—2015 гады заплацілі 12,2 мільярда рублёў штрафных санкцый, пені і судовых выдаткаў. Выяўлены факты безгаспадарчасці, сакрыцця звышнарматыўнага расходу сыравіны і паліва-энергетычных рэсурсаў, завышэння сабекошту прадукцыі, парушэнняў у правядзенні тэндараў па закупках тавараў, нямэтавага выкарыстання бюджэтных сродкаў. Апытанне вытворцаў мэблі паказала, што ў большасці выпадкаў прадукцыя ААТ «Мастоўдрэў» іх не задавальняе не толькі па кошце, але і па якасці. Толькі для ўстаранення выяўленых парушэнняў па якасці і стандартызацыі прадукцыі патрэбен час да чэрвеня бягучага года.*

**Ад стану спраў на прадпрыемстве залежаць лёсы многіх мастаўчан і іх сем'яў.**

— Рэдка дзе сустрэнеш такую колькасць парушэнняў, як выявіла гэтая праверка. Зразумела, ёсць аб'ектыўныя прычыны. Аднак маса і прычын суб'ектыўнага характару. Калі падлічыць сумы сродкаў, якія страціў літаральна на «пустым месцы», то становіцца зразумела, што сітуацыя звязана не толькі з падзеннем рынку і цэн, — падкрэсліў **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Васіль ГЕРАСІМАЎ.**

Як, напрыклад, можна ўмудрыцца самому нарыхтоўваць драўніну... даражэй, чым купляць у іншых?

У маі мінулага года, каб зменшыць складскія запасы, прынялі рашэнне знізіць на 30% цэны на мэблю, якая доўгі час не карысталася попытам. Аднак сітуацыя істотна не змянілася, чаго, лічаць у Камітэце дзяржкантролю, і трэба было чакаць. Бо акрамя аб'явы аб зніжэнні цэн на прахадной прадпрыемства, іншымі механізмамі з мэтай разгрузкі складоў не скарысталіся.

Дарэчы, прадаўцы, як пасказала іх апытанне, не задаволены ўпакоўкай мастоўскай мэблі, з-за чаго пры транспарціроўцы на ёй утвараюцца дэфекты — увагнутасці, сколы. Альбо такая «дробязь». Можна было б значна павялічыць рэалізацыю крэслаў пры наяўнасці ўзорaў абівачнай тканіны. Пакупнік мог бы зрабіць папярэдні заказ на крэслы адпаведных расфарбовак.

Вось якое меркаванне выказаў **намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама Дзмітрый БУЛАК**:

— Асноўная памылка, якую зрабілі пры мадэрнізацыі прадпрыемства, — ні рубля не ўклалі ў мадэрнізацыю менеджменту, праграмнага забеспячэння. Груба кажучы, купілі жалеза, а як кіраваць па якасці, персанале, тэхнічным узроўні вытворчасці — аб гэтым не паклапаціліся. Зараз трэба зрабіць усё магчымае, каб выправіць сітуацыю. Для нашага горада гэта вельмі важна, бо ад стану спраў на прадпрыемстве залежаць лёсы многіх мастаўчан і іх сем'яў.

Паколькі зараз прадпрыемства ў вельмі складанай фінансавай сітуацыі, Дзмітрый Булак звярнуўся з просьбай не прымяняць да яго штрафныя санкцыі па выніках праверкі, каб не пагоршыць становішча працоўнага калектыву.

### ШТО ДАЛЕЙ?

**Генеральны дырэктар ААТ «Мастоўдрэў» Сяргей АСОСАЎ** сказаў, што, атрымаўшы прадпісанне Камітэта дзяржкантролю па выніках праверкі, у большасці выпадкаў ужо зрабілі адпаведныя высновы, пакаралі вінаватых у тых ці іншых парушэннях. Але гэтага, канешне, недастаткова. Патрэбны канкрэтныя меры, каб наладзіць нармальную, прыбытковую работу. Якія?

Аб некаторых кроках у гэтым кірунку паведаміў **намеснік старшыні канцэрна «Беллеспаперапрам» Міхаіл КАСЬКО.** Прычым яны тычацца не толькі мастоўскіх дрэваапрацоўшчыкаў, але і іх калег з іншых прадпрыемстваў краіны, якія таксама перажываюць не лепшыя часы.

— Усе бізнес-планы нашых прадпрыемстваў праходзілі дзяржаўную экспертызу, у тым ліку з прыцягненнем незалежных экспертаў. Аднак такога абвальнага падзення цэн на прадукцыю не прадказваў ніхто, — зазначыў Міхаіл Касько. — Мы вымушаны несці пэўныя выдаткі, прытрымліваючы яе на складах у чаканні больш спрыяльнай рыначнай сітуацыі.

Каб цэнавая сітуацыя яшчэ больш не пагоршылася з-за ўнутранай канкурэнцыі паміж айчыннымі прадпрыемствамі, прынялі рашэнне аб цэнтралізаванын продажы іх прадукцыі на экспарт праз Беларускую лясную кампанію. Яна ж дзякуючы мэтаваму крэдыту пад гарантыі Мінфіна (4 мільёны еўра) цэнтралізавана купляе для ўсіх прадпрыемстваў канцэрна смалу. У выніку гэтая важнейшая сыравіна прыкладна на 20% стала таннейшай. Правялі перамовы наконт рэалізацыі прадукцыі буйнейшымі гандлёвымі сеткамі. Асноўныя праблемы — цэны і пашырэнне колеравага асартыменту падлогавых пакрыццяў.

Акрамя таго, Беларуская лясная кампанія сумесна з ААТ «Мастоўдрэў» выступілі сузаснавальнікамі гандлёвага дома ў Польшчы. ААТ «Банк развіцця» разглядае магчымасць яго крэдытавання з мэтай закупкі фанеры і пліт МДФ у вытворцаў і рэалізацыі тавару праз склады на тэрыторыі суседняй краіны. Першыя пастаўкі ўжо пайшлі...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by* ■

# «ГАРАЧАЕ» ПА-КАРЭЙСКУ



## На паўвостраве зноў трывожна

**Паўднёвая Карэя цалкам спыніла падачу электраэнергіі і вады на тэрыторыю памежнага тэхнапарка Кэсон, размешчанага ў КНДР. Комплекс быў адзіным сумесным праектам дзвюх краін, застаючыся адной з асноўных крыніц фінансавых паступленняў для Пхеньяна. Улады Паўночнай Карэі напярэдадні выправадзілі 280 рабочых з Поўдня з тэрыторыі тэхнапарка і перакінулі туды некалькі вайсковых падраздзяленняў. Паўднёвакарэйскія кампаніі спешна вывезлі сваіх супрацоўнікаў і абсталяванне з Кэсона.**

Раней Сеул абвясціў пра прыпыненне аперацый у тэхнапарку Кэсон, прыбыткі ад дзейнасці якога летась склалі для Паўночнай Карэі 616 мільярдаў паўднёвакарэйскіх вон (каля $511 млн). КНДР назвала гэтае рашэнне «аб'яўленнем вайны». Такія меры Паўднёвая Карэя прыняла ў адказ на выпрабаванне ў КНДР ракеты далёкага радыуса дзеяння. А Савет Бяспекі ААН разглядае магчымасць узмацнення санкцый супраць Пхеньяна. Адпаведнае пытанне актыўна абмяркоўваюць Паўднёвая Карэя, ЗША і Японія. Сітуацыя на паўвостраве зноў абвастрылася. Да чаго гэта можа прывесці?

### 12 ТЫС. КМ ЛЁТУ

У канцы студзеня Паўночная Карэя апавясціла ААН пра намер запусціць у лютым уласны спадарожнік. Афіцыйна абвешчана, што гэта павінна паслужыць развіццю паўночнакарэйскай ракетнай тэхнікі далёкага дзеяння.

Гэты намер выклікаў рэзкі пратэст у Токіа і Вашынгтоне. Такая рэакцыя сусветнай грамадскасці на планы КНДР па асваенні касмічнай прасторы звязана з тым, што носьбіты, якія выкарыстоўваюцца для дастаўкі спадарожніка, створаны на аснове балістычных ракет далёкага радыуса дзеяння. Паспяховы запуск спадарожніка азначае прагрэс Пхеньяна ў адпаведнай вайсковай тэхналогіі.

12 студзеня Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва КНДР паведаміла, што паўночнакарэйскія балістычныя ракеты з гэтага часу могуць быць абсталяваны боегалоўкамі з тэрмаядзерным зарадам. Пра тое, што такі зарад прайшоў паспяховыя выпрабаванні, Пхеньян афіцыйна абвясціў 6 студзеня. А 7 лютага ажыццявіў запуск ракеты далёкага радыуса дзеяння. У Пхеньяне заявілі, што на арбіту быў паспяхова выведзены спадарожнік Kwangmyongsong-4 («Яркая зорка — 4»), прызначаны для сачэння за Зямлёй. Ён здзяйсняе віток вакол планеты з перыядычнасцю адзін раз за 94 хвіліны.

Інфармацыя наконт «лёсу» спадарожніка спачатку была негатыўная. Праз некалькі дзён ЗША паведамілі, што ён «куляецца ў космасе» і не працуе.

Пасля з'явілася паведамленне, што спадарожнік, запушчаны КНДР, стабілізаваўся на арбіце. Пра гэта заявіла Reuters са спасылкай на крыніцу ў Вашынгтоне. У той жа час, як мяркуецца, спадарожнік па-ранейшаму не перадае якой-небудзь інфармацыі на Зямлю. Выведзены ў космас апарат, па звестках тэлеканала CBS, важыць каля 100 кілаграмаў. Ён знаходзіцца на вышыні каля 300 міль (480 кіламетраў) ад паверхні Зямлі і рухаецца амаль строга з поўначы на поўдзень. Аднак яго арбіта нестабільная.

Тым часам брытанская The Daily Mail перадала, што паўднёвакарэйскія ВМС выявілі рэшткі паўночнакарэйскай ракеты-носьбіта паблізу берагоў вострава Чэджудо. На здымках, апублікаваных Мінабароны Паўднёвай Карэі, меркаваная галаўная частка ракеты з завадской маркіроўкай.

Як мяркуюць у Сеуле, дадзеная ракета аналагічная ракеце «Ынха-3», запушчанай у снежні 2012 года, аднак валодае большай далёкасцю лёту — больш за 12 тысяч кіламетраў, тады як радыус дзеяння яе папярэдніцы ацэньваўся ў 10 тыс. км.

У сусветнай супольнасці ўсё гэта ўспрынялі як парушэнне рэзалюцый, якія забараняюць КНДР ракетныя запускі з ужываннем балістычных тэхналогій. У той жа дзень, калі стала вядома пра запуск спадарожніка, было праведзена пасяджэнне Савета Бяспекі ААН, які асудзіў дзеянні Паўночнай Карэі і паабяцаў прыняць «сур'ёзныя меры» ў адказ на парушэнні Пхеньянам рэзалюцый міжнароднай арганізацыі.

### АСІМЕТРЫЧНЫЯ МЕРЫ

Па вайсковай магутнасці КНДР катастрафічна саступае сапернікам, перш за ўсё — ЗША і Паўднёвай Карэі. І ўсё ж і Вашынгтон, і Сеул разумеюць, што звязвацца з Пхеньянам — сабе даражэй. Паўночнакарэйскія ўзброеныя сілы выглядаюць вельмі ўнушальна. КНДР, насельніцтва якой не перавышае 25 мільёнаў чалавек, валодае чацвёртым па колькасці войскам свету. У ім служаць каля 1 мільёна 200 тысяч салдат і афіцэраў. У іх распараджэнні знаходзіцца каля 20 тысяч вайсковых прылад, больш за чатыры тысячы танкаў і прыкладна тысяча самалётаў. Служба ў войску абавязковая для большасці грамадзянаў. Пры гэтым аддаваць «ганаровы абавязак радзіме» карэйцам даводзіцца даволі доўга: тэрмін службы складае дзесяць гадоў для мужчын і тры гады для жанчын, якіх у войска сталі прызываць ужо пры Кім Чэн Ыну.

Аднак з якасцю сістэм узбраення ў КНДР справы не з лепшых. Галоўным чынам войска мае савецкую зброю 1960-70-х гадоў. Напрыклад, сярод танкаў пераважаюць савецкія Т-54/55 і Т-62, а таксама іх клоны, вырабленыя ў Кітаі ці ўласна ў КНДР. Як вядома, выпуск гэтых баявых машын у СССР быў спынены яшчэ ў 1970-я. Ёсць, праўда, і адносна сучасныя танкі, у тым ліку і ўласнай вытворчасці, але іх мала.



Яшчэ горш справы з авіяцыяй: адзінымі адносна сучаснымі знішчальнікамі з'яўляюцца МіГ-29 у колькасці 35 адзінак. Астатнія знішчальнікі — гэта шматлікія МіГ-21 і МіГ-23. У якасці кур'ёзу можна згадаць пра прыблізна 200 адзінак безнадзейна састарэлых МіГ-17 і МіГ-19, якія зусім не ўяўляюць ніякай баявой каштоўнасці і могуць лічыцца музейнымі экспанатамі.



Зрэшты, пагардліва ставіцца да паўночнакарэйскага войска не варта: са сваімі задачамі яно спраўляецца. Справа ў тым, што мэты гэтыя ўжо даўно носяць чыста абарончы характар. Прычым у якасці асноўнай крыніцы небяспекі разглядаюцца, вядома, Паўднёвая Карэя і ЗША. Весці з імі вайну на роўных КНДР не ў стане па прычыне несупастаўнасці эканамічных патэнцыялаў, таму галоўная задача паўночнакарэйскіх вайскоўцаў — зрабіць так, каб узброены канфлікт з краінай чучхэ павярнуўся для ворага непрымальнай шкодай. Здзейсніць гэта Пхеньян можа толькі адным спосабам — з дапамогай «асіметрычных мер».

КНДР імкнецца стаць паўнавартаснай ядзернай дзяржавай. Супрацьстаяць куды багацейшаму і больш развітому Поўдню (не кажучы ўжо пра ЗША) у гонцы звычайных узбраенняў нерэальна, таму асаблівыя надзеі ўскладаюцца на ракетна-ядзерны комплекс — ідэальную зброю стрымлівання. У лютым 2005 года КНДР упершыню адкрыта заявіла пра стварэнне зброі гэтага тыпу. Праз год у Паўночнай Карэі быў здзейснены першы атамны выбух. У 2009 і 2013 гадах таксам былі праведзены падземныя выпрабаванні гэтага віду зброі, якія выклікалі асуджэнне з боку міжнароднай супольнасці. У 2009-м Пхеньян пакінуў шасцібаковыя перамовы па сваёй ядзернай праграме, што праходзілі з удзелам Расіі, ЗША, КНР, Японіі, КНДР і Паўднёвай Карэі. У 2012 годзе ў канстытуцыю краіны была ўнесена папраўка пра ядзерны статус.

Паводле інфармацыі з адкрытых крыніц, цяпер у Пхеньяна ёсць ад 30 да 50 кілаграмаў зброевага плутонію — дастаткова для вырабу дзесяці ядзерных зарадаў невялікай магутнасці. Апроч таго, у распараджэнні КНДР, магчыма, ёсць яшчэ некалькі ядзерных прылад на базе ўрану. Гэтыя зарады, найхутчэй, непрыдатныя да выкарыстання ў боегалоўках ракет і ўяўляюць сабою масіўныя і ўразлівыя «ядзерныя выбуховыя прылады». Праца над мініяцюрызацыяй зарадаў у КНДР ідзе, але ад стварэння па-сапраўднаму прыдатнага для баявога выкарыстання ядзернага зарада Паўночную Карэю аддзяляюць некалькі гадоў.

Калі казаць пра носьбіты, то праца над уласнай ракетнай зброяй у Карэі пачалася ў 1970-я, а ўжо ў 1980-я атрымалася закупіць у Егіпце некалькі савецкіх ракет Р-17. На іх базе былі створаны мадыфікацыі ракеты «Хвасон» з дальнасцю 300-400 кіламетраў пасля павялічанай да 600-700 км. Апроч таго, на ўзбраенні паўночнакарэйскага войска маецца і некаторая колькасць ракет «Мусудан» з дальнасцю 3-4 тысячы кіламетраў.

**Як канстатуе карэйскае выданне «Карыа Таймс», цяперашнія дзеянні «вядуць да вяртання ў рэгіён вайсковых блокавых структур часоў «халоднай» вайны».**

Магчымасці гэтых ракет не дазваляюць паражаць цэлі ў ЗША, хоць менавіта гэта патрэбна для паўнавартаснага ядзернага стрымлівання. Праца над ракетамі большай дальнасці ў Карэі таксама вядзецца. Яшчэ ў 1998 годзе ў КНДР адбыўся першы выпрабавальны запуск міжкантынентальнай ракеты. Самі паўночнакарэйцы сцвярджалі, што гэта быў запуск штучнага спадарожніка. Выпрабаванні прайшлі няўдала: ракета звалілася ў Ціхі акіян, што, аднак, не перашкодзіла Пхеньяну заявіць, што спадарожнік паспяхова дастаўлены на арбіту.

Пасля ў КНДР правялі яшчэ тры запускі, якія аказаліся беспаспяховымі. Аднак паўночнакарэйскія інжынеры працягвалі працаваць, і ў снежні 2012-га нарэшце дасягнулі станоўчага выніку — ракета-носьбіт «Ынха-3» сапраўды вывела на арбіту першы паўночнакарэйскі спадарожнік. Зрэшты, гэты поспех з'яўляецца адносным: пры ўсім падабенстве тэхналогій, што выкарыстоўваюцца ў ракетах-носьбітах, якія выводзяць на арбіту спадарожнікі, і баявых міжкантынентальных балістычных ракетах, ідэнтычнымі яны не з'яўляюцца. У прыватнасці, для стварэння баявой ракеты трэба распрацаваць боегалоўку, канструкцыя якой вытрымлівае перагрузкі, высокую тэмпературу і ціск пры ўваходзе ў шчыльныя пласты атмасферы. Пакуль да рашэння гэтай задачы ў КНДР нават не прыступалі.

Такім чынам, нават наяўныя недасканалыя ядзерныя зарады збольшага выконваюць задачу стрымлівання. Аналагічныя функцыі паспяхова выконвае і артылерыйская групоўка, засяроджаная паблізу ад Сеула, якая ўвесь час узмацняецца, у тым ліку новымі артылерыйскімі і ракетнымі сістэмамі.

Галоўная задача паўночнакарэйскіх вайскоўцаў — зрабіць напад на краіну занадта адчувальным нават для такога моцнага суперніка, як ЗША, і задача гэта ў цэлым вырашана.

### ВЯРТАННЕ ДА БЛОКАЎ

«Нашы ядзерныя баявыя сродкі кампактныя і разнастайныя», — заявіў афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага камітэта абароны КНДР. Па яго словах, «ніхто не можа перашкодзіць Паўночнай Карэі абараняць сябе з дапамогай ядзернай зброі». Улады КНДР не зацікаўлены ў абмеркаванні замарозкі ядзернай праграмы і аднабаковай адмовы ад яе. Пра гэта, як перадае інфармагенцтва ЦТАК, заявіў афіцыйны прадстаўнік паўночнакарэйскага міністэрства замежных спраў. «КНДР — ядзерная дзяржава па форме і змесце, і ў яе ёсць адпаведныя інтарэсы», — паведаміў ён. Па словах прадстаўніка замежнапалітычнага ведамства, магчымасці ядзернага стрымлівання — не прадмет гандлю, а патрэбны сродак абароны суверэнітэту краіны ад пагрозы з боку ЗША.

Зразумела, такая пазіцыя выклікала супрацьдзеянне. У Паўднёвую Карэю перакінуць батарэю амерыканскіх супрацьракетных комплексаў THAAD. Таксама стала вядома, што лідары ЗША, Паўднёвай Карэі і Японіі правядуць трохбаковую сустрэчу ў Вашынгтоне падчас міжнароднага саміту па ядзернай бяспецы, які пройдзе ў амерыканскай сталіцы ў канцы сакавіка. Асноўнай яго тэмай стане паўночнакарэйская праблема і сумесныя шляхі рэагавання саюзнікаў на дзеянні Пхеньяна. Наколькі можна меркаваць, Вашынгтон, Сеул і Токіа маюць намер максімальна ўзмацніць жорсткасць падыходу да КНДР.

Цікавая рэакцыя паўднёвакарэйскіх СМІ, якія з занепакоенасцю адзначылі, што хоць усе незадаволены паводзінамі КНДР, але ёсць розніца ў ацэнцы таго, што варта рабіць у адказ. Як канстатуе карэйскае выданне «Карыа Таймс», цяперашнія дзеянні «вядуць да вяртання ў рэгіён вайсковых блокавых структур часоў «халоднай» вайны». З аднаго боку знаходзіцца альянс ЗША і іх саюзнікаў у Паўночна-Усходняй Азіі — Японіі і Паўднёвай Карэі, а з іншай — Кітай і Расія, якія цесна каардынуюць свае падыходы. Бліжэй да іх знаходзіцца і Паўночная Карэя. Масква і Пекін не хочуць прымаць такія санкцыі, якія могуць нанесці сур'ёзны ўдар па народзе КНДР, тады як ЗША і іх саюзнікі прасоўваюць варыянт поўнай ізаляцыі і эканамічнай блакады Паўночнай Карэі.

Фактычна на Карэйскім паўвостраве цяпер вельмі складанае становішча. Як мяркуюць эксперты, тут ёсць усе перспектывы ўтварэння небяспечнай «гарачай кропкі», дзе пераплецены інтарэсы розных бакоў. І ўжо заўважныя прыкметы абвастрэння сітуацыі.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

# ПАТРЫЯРХ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА



У майстэрні, пачатак 2000-х.

Фота Яўгена КОКТЫША.

## Георгію Паплаўскаму — 85!

КОЛЬКІ гадоў таму я апынуўся ў святая святых мастака Паплаўскага — яго майстэрні. Георгія Георгіевіча я застаў за працай — ён «чараваў» каля велізарнага (амаль на ўсю сцяну) жывапіснага палатна. На ім была адлюстравана княжацкая дружына ў баявых даспехах. У цэнтры — сам князь Ігар на белым кані і з мячом у руках. На тварах воаў — рашучая гатоўнасць выступіць у паход, самаахвярна бараніць гонар і славу Айчыны...

Майстар, убачыўшы маю шчырую зацікаўленасць карцінай, патлумачыў:

— Гэта для новай бібліятэкі. Там ствараецца своеасаблівы мастацкі летапіс нашай гісторыі. Я выбраў у якасці сюжэта паход князя Ігара. Работа ўжо практычна закончана...

З гэтага і пачалася наша размова з народным мастаком Беларусі, заслужаным дзеячам мастацтваў рэспублікі, правадзейным членам Расійскай акадэміі мастацтваў, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Г.Г. Паплаўскім.

Пытаюся: гэта карціна — сацыяльны заказ?

— Так, — адказвае мастак, — а што ў гэтым кепскага?

— Абсалютна нічога, — кажу. — Хаця чамусьці многія мастакі лічаць інакш. На іх думку, сацыяльны заказ — гэта нешта ганебнае, малазначнае, што прыніжае талент, ставіць яго ў залежнасць ад дзяржаўнай ідэалогіі.

— Бог ты мой! — ажно падхопліваецца з месца мой суразмоўца. — Але ж усе найлепшыя сусветныя шэдэўры жывапісу зроблены па заказе. Няхай гэта заказ Папы Рымскага, караля ці фараона. Або хоць бы звычайнага купца. Як было, напрыклад, у Расіі. Славутыя мастакі дзевятнаццатага стагоддзя пісалі па просьбе Марозава, Траццякова і іншых багатых заказчыкаў. І што, хіба гэта пазбавіла іх творчай самастойнасці, прынізіла іх талент?

А здаралася нават так. Спецыяльнага заказу мастаку ніхто не рабіў, але, улаўліваючы грамадскі настрой, палітычныя інтарэсы, ён пісаў карціну на актуальную тэму ў поўнай упэўненасці, што пакупнік усё адно знойдзецца.

І сапраўды знаходзіўся! Вось, скажам, Сурыкаў піша «Баярыню Марозаву». Гэта не быў сацыяльны заказ, але карціну набыў Траццякоў. Або той жа Сурыкаў стварае «Сцяпана Разіна». Фармальна яму гэтае палатно таксама ніхто не замаўляў. Але як толькі мастак карціну закончыў, імператар Аляксандр ІІ купіў яе для свайго музея.

Паплаўскі падышоў да акна, моўчкі якую хвіліну ўзіраўся кудысьці ўдалечыню, а пасля зноў прысеў да стала і ўжо больш спакойна працягваў:

— Аднак заказы розныя бываюць. Адзін — як перадавы артыкул у газеце, а другі — натхнёны, глыбока эмацыянальны нарыс на актуальную тэму. Усё залежыць ад ступені таленту, шчырасці і сумлення мастака. Мы жывём у грамадстве, і кожны з нас у рэшце рэшт цесна звязаны з праблемамі гэтага грамадства. І немагчыма, каб грамадства ішло па дарозе, а ты сунуўся па нейкай бакавой сцяжыне.

Канечне, сказанае зусім не азначае, што дзеля грошай мастак можа пайсці на ўсё. Не, вядома. Ёсць рэчы, пераступаць цераз якія ні ў якім разе нельга. Інакш страціш усякую павагу ў прафесійным асяроддзі, страціш у рэшце рэшт свой талент.

Падхопліваю думку аб тым, што мастак не можа стаяць убаку ад грамадска-палітычнага жыцця, ад тых падзей і з'яў, якія адбываюцца вакол яго. У адваротным выпадку ён губляе сувязь з народам, збядняе і высушвае свой талент. Але чаму ж тады такая жывучая тэорыя гэтак званага чыстага мастацтва? Чаму пэўная частка мастакоў працягвае настойваць на сваёй поўнай свабодзе ад усяго і ўсіх, а тлумачаць гэта тым, што, маўляў, творца не павінен умешвацца ў палітыку, не абавязаны распрацоўваць якія б там ні былі тэмы, праблемы, ідэі, ён можа толькі выказваць сябе, свае эмоцыі, выхоўваць у гледача пачуццё цудоўнага?

Паплаўскі не адразу адказвае на гэтыя пытанні. Засяроджана думае, пасля кажа:

— Я не прыхільнік дзяліць мастацтва на левае і правае, на чыстае і нячыстае. Ільф і Пятроў калісьці сказалі пра грошы: або яны ёсць, або іх няма. Тое ж самае можна сказаць і аб мастацтве: або яно ёсць, або яго няма.

САМА па сабе ідэя чыстага мастацтва, «мастацтва для мастацтва» як быццам нежыццёвая. Ёсць нават зінішчальна-грэблівы тэрмін — «салонны мастак». Аднак і ў гэтым напрамку ёсць нямала цудоўных твораў, сапраўдных шэдэўраў. Імі любуюцца, імі захапляюцца, яны прыносяць нам сапраўдную эстэтычную асалоду.Таму сказаць адназначна, што «мастацтва для мастацтва» — гэта дрэнна, а вось сацыяльнае мастацтва — гэта добра, я не магу. Усё залежыць ад таго, у чыіх руках, у чым выкананні і тое, і другое. Бываюць сацыяльныя, заказныя работы такія далёкія ад сапраўднага мастацтва, што, правісеўшы тыдзеньдругі на выстаўцы, яны тут жа знікаюць у небыцці. Гэта работы–аднадзёнкі.

А бывае твор фармальна як бы і не адлюстроўвае нейкіх сацыяльных праблем, але ён выкананы прафесійна, таленавіта — абуджае ў гледача пачуццё цудоўнага. І ў той жа час, канечне ж, увесь змест мастацтва нельга зводзіць толькі да выказвання думак. Мы жывём не толькі ў цудоўным, але і ў жорсткім свеце. Ідзе напружаная сутычка ідэй, адчайная барацьба дабра і зла. Не заўважаць усяго гэтага, выключыць яго са сферы мастацтва — значыць, ігнараваць логіку жыцця, яго дыялектыку.

— Усё залежыць ад таленту, ад глыбіні ведання жыцця, — падсумоўвае свае разважанні мастак. — Я не адкрыю вялікага сакрэту, калі скажу, што ў некаторых творцаў досыць мізэрны запас ведаў аб сваёй краіне. Яны жывуць у замкнутым прафесійным коле, варацца ва ўласным соку. І гэта непазбежна прыводзіць да пэўнай творчай дэфармацыі. Адсюль гэтыя істэрычныя патрабаванні абсалютнай свабоды самавыказвання, без якіх бы там ні было ідэйна-творчых крытэрыяў і без якой-небудзь грамадзянскай адказнасці перад народам. Адсюль імкненне падмяніць няпростую для іх рэалістычную вобразнасць суб'ектыўнымі знакамі, сумнiўнай сімволікай і іншай мішурой.

— У першыя гады Савецкай улады, — заначае мастак, — найбольш тэмпераментныя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі нават выступілі са спецыяльным маніфестам, у якім гучна аб'явілі, што старое мастацтва сябе вычарпала, і трэба ўсё пачынаць спачатку. Па сутнасці гэта быў заклік да разбурэння, да распаду. Трэба, маўляў, шукаць і новыя формы, і новы змест. Існы свет ламаць, драбіць на прызмы, квадраты і іншыя дэструктыўныя формы, а замест партрэта чалавека рабіць мазаіку.

Канечне, абсурднасць гэтых дэкларацый сягоння відавочная. Гэта тое ж, калі б выступіць з патрабаваннем спаліць усе кнігі, усе бібліятэкі і пачаць ствараць новую літаратуру. Але ў той час падобныя маніфесты многімі ўспрымаліся даволі сур'ёзна. Своеасаблівым пунктам адліку стаў шырокавядомы «Чорны квадрат» Малевіча. Нямала шуму нарабілі сваімі супернаватарскімі творамі Кандзінскі, Тышлер, Фальк.

Але зноў-такі я не хачу сказаць, што ў гэтым руху ўсё было выключна негатыўным. Смелы творчы эксперымент, пошук новых формаў выказвання прынёс і пэўныя станоўчыя вынікі. А ў шэрагу выпадкаў — проста цудоўныя вынікі. Менавіта цудоўныя.

— Ці не азначае гэта, — пытаюся я, — што любы эксперымент у мастацтве мае сваю карысць?

— Так, канечне, — адказвае мастак. — Я перакананы: ён абсалютна неабходны. Без гэтага няма развіцця, немагчымы які-небудзь рух наперад.

Такім чынам, скажам, у XIX стагоддзі на змену беспрадметнаму мастацтву — абстракцыянізму — прыйшоў сюррэалізм. Прыйшоў невыпадкова. У тагачасным заходнім грамадстве была нейкая самота па выказванні больш глыбокіх пачуццяў. Аднак сюррэалізм — гэта не проста вяртанне да ранейшага рэалізму, а яго якасна новы ўзровень. Гэта было адлюстраванне нейкіх падсвядомых чалавечых пачуццяў, спалучэнне рэальнага і нерэальнага, фантасмагарычнага. Як, напрыклад, у Сальвадора Далі.



Георгій Паплаўскі з пісьменнікам Васілём Быкавым і народным мастаком Беларусі Анатолем Анікейчыкам, 1989 г.

Паплаўскі кажа, што яму ў свой час пашчасціла пабываць на выстаўцы гэтага геніяльнага мастака. Ён, безумоўна, гіперрэаліст. З пункту гледжання майстэрства кожны яго твор зроблены ашаламляльна. Хаця сам сюжэт, бывае, не паддаецца нармальнаму ўспрыняццю. Гэта нейкі загадкавы свет, нейкае надзвычай суб'ектыўнае бачанне сваіх асабістых праблем. Цяжка нават расшыфраваць, што ўсё гэта значыць.

ГЕНІЙ — гэта заўсёды адхіленне. Але не ўсякае адхіленне геніяльнае. У некаторых мастакоў ёсць несумненныя прыкметы геніяльнасці. А што тычыцца зместу іх карцін, зазначае Маэстра, то я, як нармальны чалавек, гляджу на гэта і стараюся разабрацца і зразумець — гэты «пошук» у імя чаго і для якой групы гледачоў ён прызначаны. Для мяне эталонам, вышэйшым узорам мастака з'яўляюцца старыя майстры эпохі Адраджэння — Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Батычэлі, Перуджына і г.д. І, канечне, майстры рускага рэалізму.

Паплаўскі дастаткова цярпімы да любых напрамкаў і праяўленняў у мастацтве. Гэта як кветкі на лузе: чым іх больш, тым лепш. Нельга ўсё квеценае багацце зводзіць да адной монакветкі. І разам з тым нельга кветку прыраўноўваць да пустазелля. У мастацтве, пры ўсёй разнастайнасці метадаў і напрамкаў, павінна быць галоўнае, вызначальнае, прыярытэтнае.

Пытаюся ў Маэстра, якому з творчых напрамкаў ён аддае перавагу.

— Канечне, рэалізму, — адказвае мастак. — І не таму, што я — творца старэйшага пакалення, мастак рэалістычнага напрамку і абараняю сваю пазіцыю. Найлепшыя творы, якія прайшлі выпрабаванне часам, ствараліся ў рэалістычнай манеры.

Суб'ектывізм заўсёды ўспрымаўся дрэнна і дасягненнем ніколі не лічыўся. Ёсць усё-такі нейкі аб'ектыўны погляд на свет, на прыроду, на чалавечыя ўзаемаадносіны. Дакладней, рэалістычны погляд на акаляючую нас рэчаіснасць.

Акрамя таго, мы не можам пазбегнуць сацыяльнага напрамку ў сваёй творчай працы. Сацыяльныя тэмы закраналіся ў любую эпоху, нават у Сярэднявеччы. Па карцінах старых майстроў мы сягоння аб многім можам меркаваць — аб тым часе, аб стане грамадства, аб чалавеку, аб архітэктуры і пейзажы, гэта значыць аб рэальным свеце. Мы выхоўваліся на рэалістычным мастацтве, і гэты рэалізм у нас у крыві.

— А ці павінен наогул хто-небудзь кіраваць мастаком — няхай гэта будзе дзяржаўны орган ці творчы саюз?

— На маё пытанне Паплаўскі стрымана ўсміхаецца:

— Ну, у прамым сэнсе кіраваць, можа, і не павінен. А вось дапамагаць, накіроўваць — абавязкова. Бо мастацтва — гэта магутны сродак уздзеяння на розум і на душу чалавека. І, канечне, дзяржаве не ўсё роўна, як, у якім напрамку — у разбуральным альбо стваральным — гэта ўздзеянне адбываецца, якім сілам — дабра альбо зла — яно служыць.

Ад самога мастака патрабуецца перш за ўсё высокі прафесіяналізм, каб мастацтва было па-сапраўднаму мастацтвам, а не кан'юнктурай або салоннымі падробкамі. Заўсёды ёсць формы, асновы сапраўднага мастацтва і нельга імі грэбаваць — ні школай, ні традыцыямі, ні вопытам папярэдніх пакаленняў, ні прыкладам сённяшніх майстроў.

— Памятаеце, — кажу я Паплаўскаму, — у савецкія часы ўсе важнейшыя партыйныя дакументы, што тычыліся пытанняў культуры, абавязкова ўтрымлівалі прыкладна такога кшталту заклікі-заклінанні: мастак абавязаны... савецкае мастацтва павінна... І далей ішоў доўгі пералік таго, што яно абавязана і павінна зрабіць. Часам гэты пералік быў надзвычай катэгарычны.

У часы перабудовы, наадварот, у грамадскую свядомасць актыўна ўкараняліся лявацкія лозунгі: ніхто нікому нічога не вінаваты. Мастак — вольная птушка, ён спявае толькі па загадзе душы. І чым менш у яго творы ўсялякіх ідэй — тым лепш. А якія ідэйна-мастацкія установы ў мастацкім асяроддзі сягоння?

— Няпростае пытанне... — задумваецца мастак. — Паколькі ў сілу свайго ўзросту я ўжо не так актыўна ўдзельнічаю ў грамадскім жыцці нашага саюза, то і адказаць на гэтае пытанне з усёй паўнатой наўрад ці змагу. Скажу, як я разумею, зыходзячы з агульных назіранняў.

КАНЕЧНЕ, атмасфера ў нашым асяроддзі сягоння ўжо больш спакойная, узважаная, чым у гады перабудовы. Страсці больш ці менш уляглія. Аднак саюз наш так і не стаў супольнасцю аднадумцаў. Сфарміравалася думка, што здольнасць «прабівацца» вядзе да поспеху больш пэўна, чым талент. Для некаторых гэта стала неабходнасцю і нават формулай жыцця. На вялікі жаль, за гады перабудовы многае страчана. Дэмакратычны лозунг «свабода творчасці» многімі ўспрыняты як «творчая разбэшчанасць».

Ведаю, што Паплаўскі ў свой час шмат падарожнічаў, пабываў у розных, іншы раз самых экзатычных кутках свету. Цікава, што для яго падарожжа: ахвота да перамены месцаў, неабходнасць новых уражанняў, своеасаблівая форма адпачынку?

— Ніколі не задумваўся над гэтым, — крыху здзіўляецца майму пытанню мастак. — Што для мяне падарожжа? У адным выпадку гэта была неабходнасць — прапанавалі творчую камандзіроўку, у другім — самому захацелася пабываць у незнаёмай краіне, у трэцім — напэўна, і адпачынак, і праца.

Вось такім спалучэннем работы і адпачынку стала для яго адна з першых і, бадай, самых памятных, самых яркіх паездак — паездка на гомельскае Палессе. А здарылася гэта вось чаму. Паплаўскі тады шмат працаваў над афармленнем кніг беларускіх пісьменнікаў, і ўвесь час адчуваў, што для больш прадметнага адлюстравання побыту беларусаў, нацыянальнага каларыту не хапае канкрэтнасці, ведання сапраўдных рэалій. І вось спакваля зараджалася і ўсё мацнела жаданне паехаць куды-небудзь у глыбінку, пажыць у самай глухой вёсачцы, убачыць усё на свае вочы, памацаць, як кажуць, сваімі рукамі.

ВЫБРАЎ вёску Тонеж Лельчыцкага раёна. Тады гэта была самая сапраўдная глухамань. Толькі ўсюдыходам можна было даехаць. Але якія вакол цудоўныя мясціны! Якія цікавыя людзі! А ўжо што тычыцца прадметаў побыту, дык Тонеж і яго ваколіцы сталі для мастака сапраўдным Кландайкам. Чаго толькі ён там ні «адкапаў»! І прыстасаванні для пракручвання ў саганку адтуліны цвіком. І унікальную, музейную ступу, у якой пры дапамозе асобнай сістэмы шарніраў можна таўчы крупы нагой. І дзівосны прыгажосці старадаўнія паляшуцкія касцюмы. І тут жа ўсе прыстасаванні для вырабу адзення — кросны, прасніца, мялка, драўляныя прас... Асабліва здзівілі ганчарныя вырабы, пляценні з лазы і саломкі. Да чаго ж багаты і таленавіты наш народ!

мальберта магу прастаяць і сем гадзін, і восем, і болей.

Стаць мастаком ён марыў з дзяцінства. Іншых планаў не было. Маляваць хацелася заўсёды. Але ўмоў для гэтага не было. Вайна, пасляваенная разруха. Ні патрэбнай паперы, ні фарбаў. Ды што там фарба — алоўкі каляровыя і тыя дастаць было цяжка. Аднак ён усё-такі маляваў — чым можна было і на чым папала.

Вялікую ролю ў гэтым дзіцячым захапленні адыграў гурток выяўленчага мастацтва ў Бабруйскім доме піянераў, які кіраваў Барыс Фёдаравіч Бяляеў. Гэта быў чалавек, цалкам захоплены мастацтвам, сапраўдны інтэлігент. Нягледзячы на слабае здароўе, ён шмат працаваў з вулічнай дзятвой. Менавіта яму ўдалося прышчапіць ім шчырую любоў да прыроды і распаліць першае жаданне самому штосьці адлюстраваць. Выхаваныя ім у найлепшых традыцыях рускай рэалістычнай школы, яго вучні пазней паспяхова закончылі спецыяльныя ВНУ і сталі прафесійнымі мастакамі.

У Паплаўскага, напрыклад, за плячамі Мінскае мастацкае вучылішча і тэатральна-мастацкі інстытут, жывапіснае аддзяленне. Да яго дастаткова рана прыйшоў поспех, прызнанне. У 39 — прэмія Ленінскага камсамола Беларусі, у 43 — міжнародная прэмія імя Джавахарлала Неру, у 47 — званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў». Лёс да яго сапраўды быў прыхільны, але ніколі не песціў у агульнапрынятым разуменні.



Георгій Паплаўскі з Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам і Алесем Адамовічам, 1992 г.

Вельмі многае дала Браслаўская зямля. Там, у Рацюнях, каля Масковіч, Паплаўскі некалі купіў стары хутар, перабудаваў яго пад майстэрню з вялікім акном на возера. Багата гадоў гэтыя мясціны былі яго асноўным пленэрам. Рабіў замалёўкі, эцюды, кампазіцыі. Атрымаўся бясконцы цыкл акварэляў — «Браслаўскі альбом», які пазней быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

Калі ўвачавідкі знаёмішся з іншай краінай, з бытам іншага народа, пазнаеш культуру і бачыш, як паказвае нацыянальны каларыт, нацыянальны дух мастак, то гэта — велізарны, неацэнны прафесійны ўрок.

Таму любая паездка, любое знаёмства з новай краінай, перакананы Паплаўскі, — гэта заўсёды набыццё. Набыццё ўражанняў, адчуванняў, ведаў. Можа быць, усё гэта напрамую і не адаб'ецца на творчасці, але ў любым выпадку адчуеш сябе духоўна ўзбагачаным і з радасцю падзеліішся гэтым багаццем.

Цікаўлюся ў Георгія Георгіевіча пра ягоных бацькоў, малую радзіму.

— Мая малая радзіма, — з задавальненнем апавядае мастак, — ціхая, утульная вёсачка Бортнікі, што пад Бабруйскам. Тут прайшло маё дзяцінства, малалецтва і першыя гады юнацтва.

АНарадзіўся ён ва Украіне, у горадзе Роўна. Там жыла ў той час уся маміна радня, і калі ёй прыйшоў тэрмін нараджаць, яна з вёскі паехала да сваіх, у горад. Пасля таго, як усё шчасліва абышлося, вярнулася назад у Бортнікі.

Бацькі яго — рускія, са стараверaў. Бацька доўгія гады працаваў на фанера-дрэваапрацоўчым камбінаце ў Бабруйску. Трэба сказаць, што ўся радня Паплаўскіх — старaверы, былі вялікімі працаўнікамі. Бацька ледзь золак — ужо на нагах і абавязкова што-небудзь майструе, клапоціцца па гаспадарцы. Пасля едзе на працу, а вярнуўшыся вечарам дамоў, зноў з галавою акунаецца ў хатнія турботы. І так з дня ў дзень.

— Павінен сказаць,— зазначае Георгій Паплаўскі, — што, калі мне што-небудзь і ўдалося зрабіць у гэтым жыцці, дык толькі дзякуючы таму, што бацькі змаглі выхаваць ува мне любоў да працы. Хаця, шчыра кажучы, мая працавітасць ужо на парадак ніжэй. Гарадскія ўмовы, напэўна, паўплывалі. Я вось прачынаюся рана, але адразу падымацца не люблю. Ляжу, чытаю, слухаю радыё... Але затое ўжо калі вазьмуся за працу, то раблю ўсё з захапленнем, з азартам. Іншы раз каля

Цяжкасцяў і праблем хапала. Аднак сувязямі або пратэкцыяй не карыстаўся. Усяго дабіваўся ўласнай працай.

Дзякуй Богу, і на дзявятым дзесятку гадоў мастак знаходзіцца ў добрай фізічнай і творчай форме. У чым сакрэт гэтага? Спецыяльная дыета? Зарадка?

— Ды які там сакрэт... — адмахваецца Паплаўскі. — Ніколі я не займаўся ніякай зарадкай. Толькі вось нядаўна, літаральна два тыдні таму, пачаў раніцай крыху размінацца. Але я цэлы дзень у руху, так што фізічнай нагрузкі мне хапае.

— У вас, напэўна, спакойны, вытрыманы характар?..

— Так, звонку, калі бачыць часам маю непарушнасць, можа падацца, што я не перажываю. Якраз наадварот! Я вельмі за ўсё перажываю, вельмі востра на ўсё рэагую. Але маўчу іншы раз таму, што не магу адразу парываваць, дасціпна адказаць. Пачынаю заікацца, гаварыць паспешліва, блытана. І доўга пасля адчуваю сябе хворым. Ціск падымаецца.

Але затое ў мяне ёсць адна добрая якасць — я хутка адыходжу. І не трымаю зла. Я люблю бываць сярод сяброў. Як бы ні быў заняты, але калі прыходзяць сябры — усе справы набок. Няма нічога лепшага, больш карыснага для душэўнага здароўя, як размовы з добрымі, прыемнымі людзьмі. Можа быць, сакрэт у гэтым?

КАЛІ размова заходзіць аб тым, як ён бавіць вольны час, Георгій Георгіевіч запэўнівае:

— Спецыяльна я ніколі не адпачываю. Адзінае месца, дзе я люблю калісьці паваляцца на сонейку, — гэта ўзбярэжжа Чорнага мора, на каменьчыках, на лежаку, каля хваляў. Адпачынкам былі і прагулкі па Браслаўшчыне. Нярэдка мы выязджалі ўсёй сям'ёй на які-небудзь закінуты астравок, удосталь купаліся, загаралі, малявалі з натуры. У горадзе — гэта тэатр, канцэрты, сустрэчы з сябрамі ў майстэрні і на грамадскіх форумах. Наогул адпачынак у нас, у сям'і, заўсёды актыўны і звязаны, як правіла, з чарговым мерапрыемствам — спектаклем, вернісажам або паездкай на машыне за горад з дачкой, унучкай, а зараз яшчэ і з праўнучкай.

Звяртаюся да пытання аб сакрэтах доўгажыхарства, зазначае Паплаўскі, мне цяжка даць вычарпальную формулу. Але я думаю, што для гэтага павінны быць прынамсі дзве галоўныя ўмовы: любімая праца і добрая сям'я. Дзякуй, лёс мяне не абдзяліў ні тым, ні другім.

**Гутарку вёў Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

## Кантрамарка

# ВАЙНА — ГЭТА ЖАХЛІВА

**У медыцыне існуе паняцце фантомнай канечнасці. Пасля ампутацыі чалавек не адчувае страты. Яму падаецца, што рука ці нага па-ранейшаму пры ім. Страчаная канечнасць нават баліць фантомным болем. А калі страціць не руку, а чалавека, які быў часткай цябе? Усё тое ж самае. Проста будзеш не цягнуць за кубкам фантомную руку, а казаць фантомнаму чалавеку: «Саша, вынесі смецце...»**

«Саша, вынесі смецце» — п'еса аднаго з самых вядомых сучасных украінскіх драматургаў Наталлі Варажбіт. Палкоўнік украінскай арміі, начальнік кафедры Вайсковай акадэміі, а для жонкі і падчаркі проста Саша, раптоўна памірае ад сардэчнага прыступу на падлозе ў ванным пакоі. Жонка Кацю і цяжарная падчарка Аксана рыхтуюць памінкі, праз год ставяць помнік на магіле, вучацца жыць без Сашы. Аднак яго фантом увесь час разам з імі. Напачатку — збольшага адмоўны. Кацю з крыўдай за тое, што засталася адна, прыгадвае не лепшыя моманты сямейнага жыцця: піў, усё сама, нічога добрага не бачыла. Праз год боль страты крыху прытупляецца і вобраз Сашы кананізіруецца — такі ўжо быў харошы: і Аксанку за сваю лічыў, і сапраўдны мужык, і жылі за ім як за каменнай сцяной. Нарэшце Саша прыходзіць да сваякоў з таго свету і абвяшчае пра сваё рашэнне вярнуцца, каб прыняць удзел у шостай мабілізацыі. На тым свеце шмат афіцэраў, якія імкнуцца прыняць удзел у ваенных дзеяннях, аднак патрабуецца дазвол родных. Але Кацю і Аксана рашуча адмаўляюцца ад такога ўваскрасення. Невыносна думкі, што Сашу могуць забіць на вайне, куды жахлівей, чым радасць ад яго вяртання...

Антываенную п'есу Наталлі Варажбіт паставіў у Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры рэжысёр больш вядомы шырокай публіцы як драматург — Дзмітрый Багаслаўскі. Адсюль, пэўна, і асаблівая ўвага да тэксту, у якім Н. Варажбіт спалучае містычную фабулу з простымі жыццёвымі дыялогамі. У пэўныя моманты акцёры забываюцца на побытавае маўленне і пачынаюць бясконца паўтараць свае рэплікі, сакралізуючы тэкст, падкрэсліваючы містычнасць таго, што адбываецца.

Уваходзіць і выходзіць з іх толькі Саша. Цвердапаліўны кацёл, у якім з'яўляецца неабходнасць з-за магчымых наступстваў ваенных дзеянняў, увасабляецца чырвонымі водбліскамі акурат на гледачах, уключае залу ў дзеянне, стварае атмасферу трывогі і ілюзію катла ваеннага. У памяці ўсплывае музейны муляж, панарама з танкамі і салдацікамі, а потым кадры з сучасных навін...

Па баках сцэны — шэсць тэлевізараў. На іх экранах часам з'яўляюцца рэмаркі, што яшчэ раз падкрэслівае асаблівую ўвагу рэжысёра да тэксту. У адной са сцэн на экранах візуалізуюцца фрэскі з зямнога жыцця Сашы (гэта ўласна і завяршае кананізацыю яго вобраза). Большую ж частку дзеяння на экранах — тэлевізійны шум. Прывітанне з мінулага, бо дзе ж ты яго ўжо сёння пабачыш па тэлевізары, той шум? Спроба перамясціць гледача ў стан калі ён ноччу прачынаецца каля такога экрана? Прыкмета невядомага, трывожнага, безчасовага?

Гэта спектакль простых і эфектных рашэнняў (сцэнаграфія Вольгі Грыцаевай; касцюмы Вікторыі Ця-Сен). Помнік на магіле Сашы паўстае з кавалка цеста, які Кацю раскатала на памінальныя піражкі. Прасціну цеста вешаюць на аўтэнтычную металічную канструкцыю па левым баку сцэны. Кацю робіць у цэнтры круглую дзірачку... Напачатку такое рашэнне падаецца крыху нязграбным, але праз колькі хвілін цеста выцягваецца — і побач з лампадкай і штучнымі кветкамі паўстае вядомая кожнаму мадэль помніка са скошаным краем і авальным медальёнам унутры.

Акцёры ідуць услед за рэжысёрам у пошуках новай шчырасці ва ўвасабленні сучаснага тэксту. Яны фіксуюць паўсядзённасць, найперш у маўленні. Найлепш для вобразаў, створаных акцёрскім ансамблем (Аляксандр Пашкевіч, Наталля Анішчанка і Любоў Пукіта), падыдзе слова шараговасць. Але ў найлепшым сэнсе, сінонім якога — пазнавальнасць. Падаецца, што за дзвярамі кожнай другой кватэры знойдзецца такая ж сям'я.

Акцёры і рэжысёр дэкларуюць тое, што напісаў драматург. У п'есе «Саша, вынесі смецце» Наталля Варажбіт не займае ніякіх палітычных пазіцый. Яна пераносіць ваенны канфлікт у плоскасць гендарных адносін, звяртаючыся да архетыпаў: мужчынская



Адзін з ключавых момантаў рэжысёрскага рашэння — выбар прасторы. Гэты тэатральны сезон увогуле дазваляе спадзявацца, што даўняя мара тэатральнай супольнасці пра асваенне новых камерных ці нетэатральных пляцовак пачыне спраўджвацца. Адкрылася камерная сцэна ў Купалаўскім, абжыты сутарэнні Маладзёжкі. Так, каб паглядзець «Саша, вынесі смецце» 40 гледачам даводзіцца спускацца ў падвал. Спектакль пачынаецца яшчэ ў момант праходу ўздоўж светлых сцен ды серабрыстых трубаў. Такія сабе 40 Арфеяў, што спускаюцца ў царства мёртвых...

Сцэнічная пляцоўка паўстае перад гледачамі ў аўтэнтычным выглядзе — тэхнічныя канструкцыі, планіроўка захаваны. Адзінае, без чаго не абысціся, — тэатральнае святло. Дарэчы, святло ў спектаклі выконвае функцыю своеасаблівай мяжы ці яе адсутнасці. Так, дзверы ў той светззяюць блакітным.

абавязку ісці на вайну і жадання жанчыны гэтага не дапусціць. П'еса Варажбіт — выразнае антываеннае выказванне. Драматург падкрэслівае, што вайна, абсалютна любая вайна — гэта жахліва. Настолькі, што мёртвыя прагнуць вярнуцца адтуль, адкуль ніхто не вяртаецца. Настолькі, што калі прапанаваць жанчыне вярнуць каханага з таго свету, дзеля таго, каб адправіць яго на вайну, яна адмовіцца...

...Шлях большасці гледачоў, што выходзяць з Маладзёжнага тэатра, пралягае акурат каля Вайсковых могілак. Вайсковых... За агароджай відаць помнікі са скошаным краем і медальёны-фотаздымкі. Мне здаецца, фінал спектакля адбываецца менавіта тут, калі гледачы ідуць пасля прагляду ўздоўж шэрагаў помнікаў...

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

**Согласовано**
Попечительский совет
Фонда «Белый Аист»

**Утверждено**
Правление Фонда
«Белый Аист»

УНП 194902950

## Отчет за 2015 год по использованию Благотворительным Фондом помощи детям «Белый Аист» своего имущества

| № | Наименование сведений | Количество/ден. сумма бел. руб. | Примечание |
|---|---|---|---|
| 1 | Информация о количестве учредителей фонда | один | Усманов С.В. |
| 2 | Имущество, переданное учредителем фонда, а именно деньги | нет | |
| 3 | Поступления от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий, а именно: | | |
| | Акция «Подарки для детей из детских домов» | 80 подарков оценочная стоимость 40 240 000 рублей | Переданы ГУО «Вилейская специальная школа-интернат для детей с тяжелыми нарушениями речи» |
| | Акция «Подарки для детей из детских домов» | 11 749 000 белорусских рублей | Переданы ГУО «Вилейская специальная школа-интернат для детей с тяжелыми нарушениями речи» |
| | Акция «Подарки для детей из детских домов» | 17 721 400 белорусских рублей | Переданы ГУО «Вилейская специальная школа-интернат для детей с тяжелыми нарушениями речи» |
| | Акция «Новогодние подарки для детей из детских домов» | 140 подарков оценочная стоимость 61 980 000 рублей | Переданы ГУО «Вилейская специальная школа-интернат для детей с тяжелыми нарушениями речи» |
| | Акция «Новогодние подарки для детей из детских домов» | 1 334 676 белорусских рублей | Переданы ГУО «Вилейская специальная школа-интернат для детей с тяжелыми нарушениями речи» |
| 4 | Доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности | нет | |
| 5 | Иные не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления, а именно: пожертвования физических лиц, безвозмездная (спонсорская) помощь юридических лиц | 88 371 315 | |
| 6 | Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе | 121 485 465 | |
| 7 | Информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии фонда в таких юридических лицах | нет | |

Директор Усманов С.В.

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,

***опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16***

**строительство 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Сморговский тракт г. Минск:**

«...Стоимость **1 кв.м нежилых помещений** на 1 этаже составляет **700 (семьсот) долларов США** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.»

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90 пн–пт (9.00–18.00, обед 13.00–14.00).**

УНП 101019973

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ №1.<br>Транспорт – трактор «Беларус» 1221.2, 2008 г.в., регистрационный знак ВА 2 7054, инв. № 25, заводской № 12027078, начальная стоимость лота – 171.046.945 белорусских рублей (Залог ОАО «Беларусбанк»)** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Витебская область.<br>Право хозяйственного ведения, правообладатель:<br>КУПМС «Шумилинское ПМС», УНП 300433458, юридический адрес: Витебская область, г.п. Шумилино, ул. Северная, д. 13 |
| **Местонахождение имущества** | г. Полоцк<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору КУПМС «Шумилинское ПМС» Войтенкову Александру Егоровичу (раб. тел. 802130-4-19-49) |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Беларусбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5<br>29 февраля 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск,<br>ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5<br>Судебный исполнитель<br>Колядко Александр Михайлович,<br>тел. (0212) 61 40 09, т.м. 37533-687-91-20,<br>эл. почта opi3@tut.by<br>Начальник отдела<br>Бураков Игорь Вячеславович,<br>тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 26 февраля 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62**

**Продавец:** ОАО «Плисский льнозавод», Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвиле, ул. Советская, 83, (029) 598-99-44

Лот №1. Трактор кат. «А» Беларус 82.1, рег. знак ВВ-2 6910, 2005 г.в. с оборудованием ПМС-0,8 инв. №427, 2004 г.в.; подшипник №7611; подшипник №210 2 шт.; подшипник инв. №311 3 шт.; подшипник №864,904 6 шт.; подшипник №7508 2 шт.; крышка подшипника; подшипник №3кк20*26*34 9 шт.; подшипник №405 руб; подшипник №943/30 2 шт.; ремень ЛКВ 08.003 зажимной 3 шт.; муфта привода НШ-100; сальник 75*100-2.2 2 шт.; манжета 140*168 2 шт.; цепь ПР-19,05-31,8 3 шт.; зуб ворошилки ВЛК-01-302 9 шт.; звездочка ЛКВ 07,101 3шт; звездочка ЛКВ 07,101 5 шт.; ограждение ЛКВ 00,03А; болт М 14*34 МР1 10,9 4 шт.; болт 4,8 ГОСТ 7786 12*45 0,5 кг; долото усил. правое МТЗ - 7 шт.; вставка ППЛ 02.00.002 5 шт.; ремень ПРЛ-1; ремень В (Б)-3000 5 шт.; венец маховика; диск сцепления вед. 451-1601130; диск сцепления вед. Д- 240; диск сцепления МТЗ; а/лампа 24*1,2 2 шт.; элем. фильтрующий 6 шт.; ремень В(Б) 23 шт. Нач. цена: – 153 046 200 бел. руб. с НДС. Задаток: 15 304 600 бел. руб. Шаг аукциона – 7 653 000 бел. руб.

Лот №2. Трактор МТЗ 82.1 рег. знак 2266 ВА, 2001 г.в. с оборудованием ПМС-0,8 инв. №428, 2004 г.в.; подшипник №312 2 шт.; подшипник №32311; подшипник №6-7609; подшипник №60206; подшипник №76307 3 шт.; подшипник №312 5 шт.; подшипник №1000921; подшипник №62303; подшипник №80202 32 шт.; подшипник №208 26 шт.; подшипник №80208 9 шт.; подшипник №60209 13 шт.; подшипник №209; подшипник №60209 7 шт.; подшипник №210 20 шт.; подшипник №180312 23 шт.; подшипник №7308; подшипник №207 2 шт.; подшипник №208 15 шт.; подшипник №209 14 шт.; подшипник №210 6 шт.; подшипник №307 14 шт.; ремень №1320 14 шт.; ремень ЛКВ 08.003; ремень ЛКВ SPB 2240 2 шт.; ремень В(Б) 2240 8 шт.; сальник зад. ступ. Зил; манжета 28*10; сальник зад. ступ.307267-П; сальник 42*58; сальник п/оси 42*58. Нач. цена: 152 265 600 бел. руб. с НДС. Задаток: 15 226 600 бел. руб. Шаг аукциона – 7 614 000 бел. руб.

Лот №3. Трактор Белорус 82.1, рег. знак ВА-2 5599, 2007 г.в.; палец попер.тяги 120; вкладыш попер.тяги 130 2 шт.; вкладыш 5320 нижн.наруж.внутр. 2 шт.; ось сателлитов МТЗ 3 шт.; сателит 70*422024 3 шт.; наконечник оборотной стойки 120 3 шт.; ось качания 50-3000011 перед.; ось качания МТЗ; ось качания 50-3000011 перед.; крышка Р-351-500; шпилька ступ. зад. пр.МАЗ 3 шт.; шпильки Зил 6 шт.; шестерня 70-1701045; токоизмеряющие клещи 5 шт.; шкаф КТП; реле д.120м 2 шт.; регулятор напряжения 112-Б; реле 507 стартер; гайка пальца тяги 130; шайба д.10 медн. 16 шт.; гайка пер.лев.120-3103019 3 шт.; гайка МАЗ 4 шт.; полозок нижн. ЛНС 4 шт.; пила дисковая б/у; зап. уст-во указ. уровня 2 шт.; кран трехходовой 11б 5 шт.; кабалка В/П ф-10-12 30 м.; сальник 38*58 6 шт.; прокладка ГБЦ-243-100320; прокладка 240-1003109 2 шт.; болт кардан.М10*1*28 20 шт.; лампа 12В10Вт 10 шт.; лампа 12В21ВТ 10 шт.; лампа А24 В5-10Вт 10 шт.; фильтр гидравл.5322М 10 шт.; звездочка ЛВК 14 шт. Нач. цена: 147 586 800 бел. руб. с НДС. Задаток: 14 758 700 бел. руб. Шаг аукциона – 7 380 000 бел. руб.

Лот №4. Трактор Белорус 1221-В2, рег. знак ВА-2 5597, 2006 г.в.; эл. фильтр.масл. 260.1017.060; эл. фильтр. МТЗ-80; фильтр топл. МТЗ; фильтр масл. 5322 2 шт.; стекло ветровое; лист 3509-2912103-20 2 шт.; лист 5509-2912105-20; лист 6509-2912106-20; лист 8509-2912108-20; рем. комплект НШ-32,50 2 шт.; элемент ведом. ЮМЗ; рем. комплект цил. ПФ-0,8; рем. комплект системы охлажд. 2 шт.; рем. комплект ЦС-125; рем. комплект ЦС-125; рем. комплект 2ПТС-4 2 шт.; рем. комплект рулевых тяг 2 шт.; ремень В(Б)-1400 27 шт.; ремень В(Б)-2240 20 шт.; ремень ЛВК; ремень 2120; трос гр. 112.050.028 2 шт.; рукав РВД 2 шт.; РВД 820-460 51-15; колпачок м/с 6 шт.; лист рессоры 452 2 шт. Нач. цена: 194 977 200 бел. руб. с НДС. Задаток: 19 497 700 бел. руб. Шаг аукциона – 9 749 000 бел. руб.

Лот №5. Трактор МТЗ 1221, рег. знак 2818 ВА, 2004 г.в.; рассеиватель МТЗ; стекло МТЗ; стекло переднее МТЗ-1221; телескопический вал 2 шт.; огражд. вход. ЛВК 13.050 2 шт.; контактная пара 2 шт.; вал ведомый ЛВК; вал ЛВК 07.602 2 шт.; полевая доска длин. 073609; ось качания длин. МТЗ; чистик 60*6*130 Лемкен 19 шт.; зуб ротац. бороны 110*15 (3377022) 2 шт.; зуб ротац. бороны 110*15(3377022) 2 шт.; зуб фрезы левый МТЗ; зуб фрезы правый МТЗ 3 шт.; отвал лев. 073291,прав. 073290; чистик СП.6.200.00.11-01 10шт.; крыло стойки Лемкен лев., прав. 7 шт.; насок стойки Лемкен 337.4388 5 шт.; защита стойки Лемкен 4 шт.; замок А4-300 2 шт.; подшипник № 32009 2 шт.; подшипник №7509; рукав РВД 2SN16 2 шт.; масловлагоотделитель 555-361457; РВД 10.33.20.2000. Нач. цена: 149 694 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 14 969 400 бел. руб. Шаг аукциона – 7 485 000 бел. руб.

Лот №6. Трактор МТЗ 1221, рег. знак 2810 ВА, 2003 г.в. Нач. цена: 123 000 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 12 300 000 бел. руб. Шаг аукциона – 6 150 000 бел. руб.

Лот №7. Трактор МТЗ 82.1, рег. знак 2267 ВА, 2001 г.в.; вал промежуточный 2 шт.; клапан ускорит.16.3518010; рем. комплект Р80; болт М14*34 лемешн. 12 шт.; подшипник № 202 13 шт.; подшипник № 207 4 шт.; сальник 30*52 2 шт.; венец маховика; лампа 12В-21 9 шт.; лампа 24В-10 9 шт.; фильтр топл. вставка 2401105010 2 шт.; фильтр МАЗ топл.201 2 шт.; фильтр топл. груб. очист.7511840; фильтр МТЗ 3022; рем. комплект рул. тяг 803003010 3 шт.; палец 1012-3405103 3 шт.; втулка ПС-10.04.05 30 шт.; втулка ПС-10.05.05 30 шт.; шестерня 52-2302015-А; подшипник № ЛЕ-308; загортач ВМРЗ 353 7054 15 шт.; чистик ВМРЗ 349.2001 20 шт.; шланг ПВХ для СЗР армир. 13 шт.; т-фитинг д.16 30 шт.; фильтр топл. МТЗ 3022; фильтр масл.МТЗ; подшипник № 206 7 шт.; насос НШ 50 плоск. 2 шт.; ремень генератора 11*10-1250; ремень 11*10-1180 2 шт.; ремень помпы 16*11-1220; сальник 75*100 6 шт. Нач. цена: 113 402 400 бел. руб. с НДС. Задаток: 11 340 200 бел. руб. Шаг аукциона – 5 671 000 бел. руб.

Лот №8. Трактор МТЗ 80, рег. знак БЯ 1792, 1991 г.в. Нач. цена: 43 080 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 4 308 000 с бел. руб. Шаг аукциона – 2 154 000 бел. руб.

Лот №9. Льнокомбайн ЛКВ-4А, инв. №399, 2002 г.в. Нач. цена: 9 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 960 000 бел. руб. Шаг аукциона – 480 000 бел. руб.

Лот №10. Льнокомбайн ЛК-4А, инв. №411, 2003 г.в. Нач. цена: 8 160 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 816 000 бел. руб. Шаг аукциона – 408 000 бел. руб.

Лот №11. Льнокомбайн ЛК-4А, инв. №439, 2005 г.в. Нач. цена: 8 160 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 816 000 бел. руб. Шаг аукциона – 408 000 бел. руб.

Лот №12. Льнокомбайн ЛК-4А, инв. №441, 2005 г.в. Нач. цена: 8 160 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 816 000 бел. руб. Шаг аукциона – 408 000 бел. руб.

Лот №13. Льнокомбайн ЛК-4А, инв. №469, 2006 г.в. Нач. цена: 8 160 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 816 000 бел. руб. Шаг аукциона – 408 000 бел. руб.

Лот №14. Льнокомбайн ЛК-4А, инв. №405, 2003 г.в. Нач. цена: 8 160 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 816 000 бел. руб. Шаг аукциона – 408 000 бел. руб.

Лот №15. Автопогрузчик ДВ грузоподъемностью 3 тонны, инв. №260а, 1989 г.в. Нач. цена: 48 360 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 4 836 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 418 000 бел. руб.

Лот №16. Автомобиль легковой седан ВАЗ 21074 120-21, рег. знак 2071 ВА, 2007 г.в.; накладка тормозная ВАЗ; прокладка г/ц Д-65; прокладка Камаз 3шт.; прокладка впускного коллектора Зил 4 шт.; прокладка впускного коллектора Зил 3 шт.; диск сцепления 451-1601090; шланг тормозной Камаз; наконечник для 01 2 шт.; подушка двигателя задняя Зил; подушка двигателя передняя Зил; палец руг. торм. Камаз 2 шт.; вкладыш рул. к-ца Камаз 4 шт.; шпилька ступ. зад. лев. Зил; шпилька ступ. зад. лев. Зил 7 шт.; реле коммун. Камаз; стекло; набор колец поршневых Д 240; вкладыш 5320 верх.Камаз 2 шт. Нач. цена: 14 088 000 бел. руб с НДС. Задаток: 1 408 800 бел. руб. Шаг аукциона – 705 000 бел. руб.

Лот №17. Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 533603-220, рег. знак АА 7608-2, 2007 г.в. Нач. цена: 106 920 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 10 692 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5 346 000 бел. руб.

Лот №18. Автомобиль грузовая специальная пожарная машина ГАЗ-53А, рег. знак 5690 ВТН, 1979 г.в. Нач. цена: 21 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 160 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 080 000 бел. руб.

Лот №19. Автомобиль легковой УАЗ 31519, рег. знак 5635 IE-2, 2005 г.в.; накладка торм.перед.500 20 шт.; накладка торм.130 8 шт.; прокладка гбц пд-10; глушитель 3302; заклепка алюмин. 8*28 2 шт.; заклепка алюмин. 8*28 3 шт.; заклепка алюмин. 8*28; резинка щеток УАЗ; крестовина 72-2203030 УАЗ 9 шт.; прокладка впуск. коллект. Урал; прокладка 5320 4 шт. Нач. цена: 34 088 400 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 408 900 бел. руб. Шаг аукциона – 1 705 000 бел. руб.

Лот №20. Автомобиль грузопассажирский вагон ГАЗ 2705, рег. знак АА 2181-2, 2005 г.в. Нач. цена: 15 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 560 000 бел. руб. Шаг аукциона – 780 000 бел. руб.

Лот №21. Прицеп бортовой тентовый МАЗ 837810 014, рег. номер А 1258 А-2, 2008 г.в. Нач. цена: 75 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 7 560 000 бел. руб. Шаг аукциона – 3 780 000 бел. руб.

Лот №22. Токарный станок SN-402, инв. №180, 1979 г.в. Нач. цена: 38 400 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 840 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 920 000 бел. руб.

Лот №23. Станок фрезерный, инв. №182, 1979 г.в. Нач. цена: 14 400 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 440 000 бел. руб. Шаг аукциона – 720 000 бел. руб.

Лот №24. Токарный станок 1Д-95, инв. №279, 1990 г.в. Нач. цена: 15 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 560 000 бел. руб. Шаг аукциона – 780 000 бел. руб.

Лот №25. Механическая ножовка 872m, инв. №369, 1997 г.в. Нач. цена: 16 320 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 632 000 бел. руб. Шаг аукциона – 816 000 бел. руб.

Лот №26. Гидравлический пресс, инв. №366, 1997 г.в. Нач. цена: 14 160 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 416 000 бел. руб. Шаг аукциона – 708 000 бел. руб.

Лот №27. Станок деревообрабатывающий КЛ-96, инв. №181, 1979 г.в. Нач. цена: 17 760 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 776 000 бел. руб. Шаг аукциона – 888 000 бел. руб.

Лот №28. Комбайн льноуборочный КЛС-3,5, рег. знак ВВ-2 1512, 2008 г.в. Нач. цена: 343 200 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 34 320 000 бел. руб. Шаг аукциона – 17 160 000 бел. руб.

Лот №29. Комбайн льноуборочный самоходный КЛС-3,5 Полессе LS35, рег. знак БХ 9339, 2009 г.в. Нач. цена: 387 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 38 760 000 бел. руб. Шаг аукциона – 19 380 000 бел. руб.

Лот №30. Прицеп тракторный 2ПТС-4, рег. знак БХ 0960, 1991 г.в. Нач. цена 16 320 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 632 000 бел. руб. Шаг аукциона – 816 000 бел. руб.

Лот №31. Плуг ПГП-4-40, инв. №165, 2004 г.в. Нач. цена: 12 070 800 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 208 000 бел. руб. Шаг аукциона – 604 000 бел. руб.

Лот №32. Культиватор КЧ, инв. №429, 2004 г.в. Нач. цена: 14 040 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 404 000 бел. руб. Шаг аукциона – 702 000 бел. руб.

Лот №33. Культиватор КЧ, инв. №436, 2004 г.в. Нач. цена: 14 040 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 404 000 бел. руб. Шаг аукциона – 702 000 бел. руб.

Лот №34. Культиватор ККЧ-4,2, инв. №438, 2005 г.в. Нач. цена: 15 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 560 000 бел. руб. Шаг аукциона – 780 000 бел. руб.

Лот №35. Разбрасыватель удобрений РДУ-1,5, инв. №406, 2003 г.в. Нач. цена: 13 485 600 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 348 600 бел. руб. Шаг аукциона – 675 000 бел. руб.

Лот №36. Прицеп ОДАЗ 885, рег. знак 6400 ВТ, 1980 г.в. Нач. цена: 7 920 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 792 000 бел. руб. Шаг аукциона – 396 000 бел. руб.

Лот №37. Дискатор АДН-4Р, инв. №525, 2009 г.в. Нач. цена: 62 799 600 бел. руб. с НДС. Задаток: 6 280 000 бел. руб. Шаг аукциона – 3 140 000 бел. руб.

Лот №38. Сверлильный станок 2Н-118, инв. №10, 1966 г.в. Нач. цена: 9 840 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 984 000 бел. руб. Шаг аукциона – 492 000 бел. руб.

Лот №39. Сверлильный станок Н-135, инв. №185, 1979 г.в. Нач. цена: 11 040 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 104 000 бел. руб. Шаг аукциона – 552 000 бел. руб.

Лот №40. Машина раскладочная МР-1400, инв. №533, 2010 г.в. Нач. цена: 130 192 759 бел. руб. с НДС. Задаток: 13 019 300 бел. руб. Шаг аукциона – 6 510 000 бел. руб.

Лот №41. Машина слоеформирующая МС 6,97, инв. №534, 2010 г.в. Нач. цена: 325 481 898 бел. руб. с НДС. Задаток: 32 548 200 бел. руб. Шаг аукциона – 16 278 000 бел. руб.

Лот №42. Машина трясильная ТН-112-01, инв. №539, 2010 г.в. Нач. цена: 222 681 838 бел. руб. с НДС. Задаток: 22 268 200 бел. руб. Шаг аукциона – 11 135 000 бел. руб.

Лот №43. Агрегат мяльно-трепальный МТА-2Л, инв. №538, 2010 г.в. Нач. цена: 2 110 623 691 бел. руб. с НДС. Задаток: 211 062 400 бел. руб. Шаг аукциона – 105 532 000 бел. руб.

Лот №44. Машина мяльная М-110-Л, инв. №537, 2010 г.в. Нач. цена: 293 446 362 бел. руб. с НДС. Задаток: 29 344 700 бел. руб. Шаг аукциона – 14 673 000 бел. руб.

Лот №45. Панель автоматизации, инв. №551, 2011 г.в. Нач. цена: 6 155 392 бел. руб. с НДС. Задаток: 615 600 бел. руб. Шаг аукциона – 308 000 бел. руб.

Лот №46. Сушилка СКП-10КУ, инв. №165, 1979 г.в. Нач. цена: 174 921 590 бел. руб. с НДС. Задаток: 17 492 200 бел. руб. Шаг аукциона – 8 747 000 бел. руб.

Лот №47. Сушилка СКП-10КУ, инв. №166, 1979 г.в. Нач. цена: 174 921 590 бел. руб. с НДС. Задаток: 17 492 200 бел. руб. Шаг аукциона – 8 747 000 бел. руб.

Лот №48. Сушилка СКП-10КУ, инв. №169, 1979 г.в. Нач. цена: 174 921 590 бел. руб. с НДС. Задаток: 17 492 200 бел. руб. Шаг аукциона – 8 747 000 бел. руб.

Лот №49. Сушилка СКП-10КУ, инв. №170, 1979 г.в. Нач. цена: 174 921 590 бел. руб. с НДС. Задаток: 17 492 200 бел. руб. Шаг аукциона – 8 747 000 бел. руб.

Лот №50. Трясильная машина ТГ-135, инв. №173, 1979 г.в. Нач. цена: 21 159 952 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 116 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 058 000 бел. руб.

Лот №51. Трясильная машина ТГ-135, инв. №174, 1979 г.в. Нач. цена: 21 159 952 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 116 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 058 000 бел. руб.

Лот №52. Трясильная машина ТГ-135, инв. №175, 1979 г.в. Нач. цена: 21 159 952 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 116 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 058 000 бел. руб.

Лот №53. Трясильная машина ТГ-135, инв. №176, 1979 г.в. Нач. цена: 21 159 952 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 116 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 058 000 бел. руб.

Лот №54. Трясильная машина ТГ-135, инв. №178, 1979 г.в. Нач. цена: 21 159 952 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 116 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 058 000 бел. руб.

Лот №55. Трясильная машина ТГ-135-Л, инв. №236, 1985 г.в. Нач. цена: 21 159 952 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 116 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 058 000 бел. руб.

Лот №56. Пресс РП-5, инв. № 179, инв. №179, 1979 г.в. Нач. цена: 17 691 870 бел. руб. Задаток: 1 769 200 бел. руб. Шаг аукциона – 885 000 бел. руб.

Лот №57. Пресс РП-5УМ, инв. №187, 1979 г.в. Нач. цена: 20 545 400 бел. руб. с НДС. Задаток: 2 054 600 бел. руб. Шаг аукциона – 1 028 000 бел. руб.

Лот №58 Машина СМТ-200, инв. №235, 1985 г.в. Нач. цена: 36 260 698 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 626 100 бел. руб. Шаг аукциона – 1 814 000 бел. руб.

Лот № 59. Машина МТА-1Л, инв. №256, 1988 г.в. Нач. цена: 324 778 042 бел. руб. с НДС. Задаток 32 477 900 бел. руб. Шаг аукциона – 16 239 000 бел. руб.

Лот № 60. Размотчик рулонов, инв. №435, 2004г.в. Нач. цена: 38 374 182 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 837 500 бел. руб. Шаг аукциона – 1 919 000 бел. руб.

Лот № 61. Кудельно-приготовительный агрегат КПЛМ-2М, инв. №167, 1979 г.в. Нач. цена: 12 758 660 бел. руб. с НДС. Задаток: 1 275 900 бел. руб. Шаг аукциона – 638 000 бел. руб.

Лот № 62. Циклон ЦН-15, инв. №322, 1992 г.в. Нач. цена: 32 211 682 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 221 200 бел. руб. Шаг аукциона – 1 611 000 бел. руб.

Лот № 63. Пневмотранспортер, инв. №100, 1961 г.в. Нач. цена: 13 633 944 руб. с НДС. Задаток: 1 363 400 бел. руб. Шаг аукциона – 682 000 бел. руб.

Лот № 64. Пресс паковочный РП-5, инв. №50, 1972 г.в. Нач. цена: 24 809 989 руб. с НДС. Задаток: 2 481 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 241 000 бел. руб.

Лот № 65. Пресс паковочный РП, инв. №51, 1974 г.в. Нач. цена: 45 501 272 руб. с НДС. Задаток: 4 550 200 бел. руб. Шаг аукциона – 2 276 000 бел. руб.

Лот № 66. Пресс НВВ, инв. №57, 1990 г.в. Нач. цена: 34 627 474 руб. с НДС. Задаток: 3 462 800 бел. руб. Шаг аукциона – 1 732 000 бел. руб.

Лот № 67. Станок СМТ-200, инв. №59, 1991 г.в. Нач. цена: 21 496 040 руб. с НДС. Задаток: 2 149 700 бел. руб. Шаг аукциона – 1 075 000 бел. руб.

Лот № 68. Куделеприготовительный агрегат, инв. №46, 1988 г.в. Нач. цена: 10 156 309 руб. с НДС. Задаток: 1 015 700 бел. руб. Шаг аукциона – 508 000 бел. руб.

Лот № 69. Трепальное колесо, инв. №104,1965 г.в. Нач. цена:18 805 620 руб. с НДС. Задаток: 1 880 600 бел. руб. Шаг аукциона – 941 000 бел. руб.

Лот № 70. Машина разрывная (гидропресс), инв. №63, 1996 г.в. Нач. цена: 23 665 480 руб. с НДС. Задаток: 2 366 600 бел. руб. Шаг аукциона – 1 184 000 бел. руб.

Лот № 71. Волокно-отделительная машина, инв. №42, 1988 г.в. Нач. цена: 4 725 390 руб. с НДС. Задаток: 472 600 бел. руб. Шаг аукциона – 237 000 бел. руб.

Лот № 72. Циклон, инв. №299, 1991 г.в. Нач. цена: 1 840 507 руб. с НДС. Задаток: 184 100 бел. руб. Шаг аукциона – 93 000 бел. руб.

Лот № 73. Циклон-6, инв. №103,1992 г.в. Нач. цена: 11 586 950 руб. с НДС. Задаток: 1 158 700 бел. руб. Шаг аукциона – 580 000 бел. руб.

Лот № 74. Машина сушильная СКП-10КУ, инв. №39, 1985 г.в. Нач. цена: 16 780 465 руб. с НДС. Задаток: 1 678 100 бел. руб. Шаг аукциона – 840 000 бел. руб.

Лот № 75. Станок СМТ-200М, инв. №250, 1987 г.в. Нач. цена: 19 346 436 руб. с НДС. Задаток: 1 934 700 бел. руб. Шаг аукциона – 968 000 бел. руб.

Лот № 76. Машина МТА-2Л, инв. №188, 2005 г.в. Нач. цена: 1 439 061 607 руб. с НДС. Задаток: 143 906 200 бел. руб. Шаг аукциона – 71 954 000 бел. руб.

Лот № 77. Куделеприготовительный агрегат (машина КПАЛ), инв. №291, 1991 г.в. Нач. цена: 7 587 618 руб. с НДС. Задаток: 759 000 бел. руб. Шаг аукциона – 380 000 бел. руб.

Торги состоятся **18.03.2016 в 14.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 16.02.2016 с 8.30 по 17.03.2016 до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с №3012470594456 в РКЦ №39 филиала ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление код 424, УНП 300019491. Получатель платежа: ОАО «Плисский льнозовод». Движимое имущество расположено по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83. Имущество бывшее в употреблении.

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со для проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. **Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

■ Свой погляд

# «КУЛЬТУРА ІДЗЕ З СЯМ'І...»

**Гэты год, як вядома, аб'яўлены Годам культуры.**
**Нехта з так званых простых людзей з глыбінкі можа сказаць: што з таго?.. Мы ж, маўляў, не артысты, не мастакі, не пісьменнікі. Мы тут ні пры чым... Але ці так гэта?**
**Мне здаецца, што наша культура пачынаецца з таго, як жылі, як працавалі, што святкавалі і спявалі нашы продкі, як яны выхоўвалі сваіх дзяцей.**

Мая мама, напрыклад, ніколі не клала спаць брацiка ці сястрычку, не заспяваўшы ім пра катка, што «пайшоў пад масток, злавіў рыбку за хвасток...» ці якую іншую песеньку. Маленькія пад гэты спеў вельмі хутка засыналі, і на тварыках у іх было столькі цiхай радасці!.. Дзіва дзіўнае: здавалася б, малое, нічога не разумее яшчэ, не ўмее размаўляць, але ж адчувае, што перадаецца гэтай цёплай мелодыяй, гэтым голасам. Тады перад сном дзіцяці не патрэбны былі ніякія мульцікі. Большым дзеткам, дарэчы, таксама, бо ў іх была добрая казка ад той жа матулі альбо ад бабулі. А падросшы, яны ўжо самі пачыналі чытаць.

Скажаце, што цяпер гэта не актуальна, змяніўся час?

Мне здаецца, што не. І для таго, каб пераканацца ў тым, трэба зусім няшмат. У добрую хвіліну, напрыклад, пакажыце дзіцятку таго ж катка, дайце патрымаць яго, дайце пагладзіць, раскажыце:

*Ходзіць коцік шэранькі,*
*Хвост у кіскі беленькі,*
*Вочкі загараюцца,*
*Мышкі разбягаюцца...*

І вось пабачыце: ваша малое абавязкова папросіць паўтарыць гэтыя радкі яшчэ і яшчэ раз, пакуль, гладзячы ката, не вывучыць на памяць, не панясе па жыцці гэтае замілаванне — пяшчотай ды прыгажосцю.

Альбо вось яшчэ — вячэра перад Калядамі, куцця. Уся наша сямейка збіраецца вячэраць. Мама кладзе на стол трохі сена, паверх яго — бялюткі абрус. На яго ставіць рытуальныя стравы. Але ж найперш пры запаленай свечцы чытае малітву, нам, малым, перадае таямніцу: свята, нарадзіўся Хрыстос!

Потым гэты звычай і гэтую веру мы, дзеці, панясём далей, як і няпростую навуку любіць сваіх бліжніх, паважаць «дальніх», ніколі не рабіць нічога благога: не падманваць, не красці, не забіваць. Культура ідзе з сям'і, з нашых традыцый, з нашых каранёў.

Я, дарэчы, ведаю нямала сем'яў, дзе саромеюцца размаўляць па-беларуску. Дзеці ў такіх бацькоў не паспеюць ад зямлі адрасці, а ўжо, глядзіш, «акультурыліся», адмовіліся ад роднай мовы. І спытай у такіх, чым беларуская горшая, скажам, за ўкраінскую, малдаўскую нейкую іншую, — не адкажуць, бо ніколі не думалі. Проста бралі «прыклад» з іншых: я, маўляў, як большасць...

Але ж, дзякаваць Богу, не ўсе!.. Я, бывае, пачую беларускую песню — па радыё, па тэлевізары — і такі мяне возьме гонар, што аж слёзы з вачэй! Так і хочацца папрасіць: «Людзі, размаўляйце ў сем'ях па-беларуску! Хай чуюць гэтую мову вашы дзеці і «гарадскія» ўнукі, хай любяць яе! Спявайце народныя песні, расказвайце казкі, каб яны не прапалі!».

У нас жа большасць людзей лічаць сябе беларусамі, але ўвесь час размаўляюць па-руску і лічаць гэта нармальным. Ды яшчэ і ганарацца, што мовы беларусаў не разумеюць... Гэта, на іх погляд, таксама прыкмета «культурнасці»?

Не, я зусім не хачу, каб нехта падумаў, што я супраць ведання іншых моў. Яны адкрываюць нам свет. Іх трэба вучыць. Але ж свая мова мае быць даражэй, калі, вядома ж, любіш Радзіму. І калі ты — чалавек культурны.

**Лідзія ЛУК'ЯНАВА,**
*в. Швабы, Лагойскі р-н*

■

■ Верш з канверта

## Шчасце

*Не шукаў я шчасця*
*пад вярбою*
*І падкоў пад стрэхі*
*не хаваў —*
*Здабываў яго*
*на полі бою,*
*Як Радзіму-маці ратаваў.*

*Я дайшоў да самага*
*Берліна,*
*Хоць не раз, падбіты,*
*падаў ніц —*
*Каб жыццё ў маім краі*
*бурліла,*
*Як бурліць бальзам*
*жывых крыніц.*
*Не шукаў я шчасця*
*пад вярбою.*
*Там шукаць не раю і табе.*
*Я яго выносіў*
*прама з бою —*
*Гартаваў яго ў барацьбе.*

**Васіль ЛАЎРЫНОВІЧ,**
*г. Глуск.*

**Ад рэдакцыі:**

Як паведамілі спецыялісты цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, аўтар гэтых радкоў Васіль Апанасавіч Лаўрыновіч нарадзіўся ў 1923 годзе. Пасля заканчэння Тамбоўскага вышэйшага артылерыйскага вучылішча ваяваў пад Ленінградам і Масквой, быў паранены, браў удзел у вызваленні Украіны, Беларусі, Польшчы і сапраўды «дайшоў да самага Берліна». Пасля дэмабілізацыі Васіль Апанасавіч працаваў у школе — настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, завучам; праз усё жыццё пранёс любоў да прыгожага пісьменства! Ды і цяпер, нягледзячы на ўзрост, па-ранейшаму піша вершы, шмат чытае, цягам многіх дзесяцігоддзяў выпісвае газету «Звязда».

Так трымаць, шаноўны Васіль Апанасавіч! Дзякуй за навуку! У тым ліку — і як шукаць шчасце

■

■ Чалавек — чалавеку

# БУДЗЕШ ПРАЦАВАЦЬ — БУДЗЕШ НЕШТА МЕЦЬ

**«Прыдбаць свой кут» — мара са знакамітай «Новай зямлі». І, як на мой погляд, дык яна не страціла сваёй актуальнасці і да сёння.**

Не скажу, што праца на зямлі кожнаму пад сілу. Наадварот — гэта справа для тых, хто не баіцца цяжкасцяў. Вялікіх грошай тут таксама не заробіш. І тым не менш: у гарадах ёсць багата людзей са сціплымі пенсіямі і такімі ж заробкамі. Ім трэба неяк пражыць самім. І дзецям дапамагчы часам хочацца...

У такіх умовах найлепшым выйсцем я бачу працу на зямлі.

Па сённяшнім часе атрымаць яе цалкам магчыма: шмат закінутых вёсак, шмат сядзіб, што зарастаюць бур'янам. Можна танна набыць жыллё і нават з патрэбнымі пабудовамі. А далей... Працуй, гадуй што можаш — кароў, свіней, птушку, вырошчвай гародніну, трымай пчол. Будзеш старацца — будзеш нешта мець.

Я, напрыклад, жыву на зямлі і з зямлі. Хацеў бы пабачыць аднадумцаў. Гатовы нават падтрымаць...

**Іосіф КВАЧ,**
*в. Жукоўшчына, Шаркаўшчынскі раён*

■

■ Вопыт!

# СУСТРЭЧА З КНІГАЙ. І... АЎТАРАМ

**Мы прызвычаіліся думаць, што бібліятэка — гэта цішыня і паліцы кніг. Але ж і сярод іх, як высвятляецца, можна цікава ды весела бавіць час. У гэтым пераканаецеся, калі разам з дзеткамі наведаеце сталічную дзіцячую бібліятэку №10.**

Асаблівасць яе ў тым, што тут шмат памяшканняў. Акрамя абанементаў і чытальных залаў (для старэйшага ўзросту з камп'ютарамі, для малодшага — са столікамі і «мядзведжым куткам»), ёсць яшчэ некалькі пакояў: у тым ліку для мерапрыемстваў — з авальным сталом, для гульняў — з цацкамі і дыванком, з каляровымі кнігамі для дашкольнікаў.

Маючы такія магчымасці, такую прастору, бібліятэка ў рамках «педагагічнай майстэрні» прапануе маленькім чытачам школу ранняга развіцця «0+. Чытаем дзецям», сутнасць якой заключаецца ў арганізацыі навучальнага працэсу праз гульнявую, даследчую дзейнасць, праз творчасць. Школа складаецца з дзвюх груп: для дзетак ад 1 года да 2 і ад 2 да 5.

Малых тут чакаюць сустрэчы з кнігамі і іх аўтарамі, знаёмствы з цікавымі людзьмі, майстар-класы і шмат-шмат іншага. Ну а вядуць заняткі ў «школе» самі бібліятэкары, прычым на добраахвотных пачатках, так што займацца можна бясплатна. Гэта добрая альтэрнатыва дзіцячым цэнтрам. Да таго ж бібліятэка з маленства прывівае дзецям любоў да кніг і чытання, а таксама — да роднай мовы.

Нядаўна, да прыкладу, у рамках рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне», адным з арганізатараў якой з'яўляецца Выдавецкі дом «Звязда», у бібліятэцы адбылася сустрэча з пісьменнікам Анатолем Зэкавым. На мерапрыемства былі запрошаны вучні сталічнай гімназіі №11, дзе праходзіў Тыдзень беларускай мовы. Таму дзеці з асаблівай цікавасцю слухалі аўтара, разгадвалі загадкі, атрымлівалі каляндарыкі, а напрыканцы — аўтографы, ад якіх кнігі станавіліся нашмат даражэйшымі.

**Святлана ТОЎСЦІК,**
*г. Мінск*

■

■ І жартам, і ўсур'ёз

# КОЛЬКІ ЧАЛАВЕКУ ТРЭБА?

**Можа, гэта з гадамі?.. Але ж, калі ў пакоі цёмна і ціха, а сон не ідзе, памяць пачынае падкідваць нейкія выпадкі.**
**Гэты адбыўся шмат гадоў таму і пачаўся са звычайнай аб'явы: кіраўніцтва жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў чарговы раз заклікала жыхароў навесці парадак у пад'ездах, прыбраць тэрыторыю вакол дома.**



Прачытаў і, шчыра кажучы, не надта задумаўся, пакуль вечарам...

Вечарам я падымаўся на свой паверх. Падымаўся ў поцемках (бо лямпачку альбо нехта выкруціў, альбо перагарэла) і ўвесь час на нешта натыкаўся. А калі нарэшце, ужо на сваёй пляцоўцы, наступіў на пастаўленыя кімсьці... граблі, то міжволі стаў думаць аб нашай культуры.

«Не, — разважаў я, седзячы на кухні і прыціскаючы да набітага гузака дзедаўскую медзяную манету, — у побыце мы пакуль дзікуны. Ужо не высыпаем вёдры са смеццем пасярод вуліцы, не выкідваем праз вокны лупіны ад бананаў ды агрызкі яблыкаў, але ж ад падобнага адышлі зусім нядаўна. Для таго, каб убачыць гэта, варта зірнуць на пашкоджаныя дзверы пад'езда, на скарабачаныя паштовыя скрынкі, на скрэмзаныя сцены...

І ў дварах не намнога лепш: клумбы папатаныя, дзіцячыя арэлі вывернуты з зямлі, пясочніцы, ператвораныя ў сабачыя туалеты...»

Пасля такога вось «філасофскага» роздуму тут жа, на кухні, я цвёрда вырашыў прыслухацца да заклікаў камунальнай службы — прыняць удзел у навядзенні парадку ў доме і навакол яго.

А для гэтага назаўтра, прыхапіўшы з сабой новы венік і анучку з вядром, я накіраваўся ажыццяўляць задуманае. Пачаў з пустых скрынак на лесвічнай пляцоўцы і нейкую колькасць нават спарадкаваў, калі аднекуль зверху пачуліся гучныя крокі. Ну, думаю, падмога ідзе, будзе такі суботнік, будуць паплечнікі ў пачэснай справе!

Аказваецца, не. Аказваецца, гэта сусед шыбуе ў краму, бо зранку, што называецца, «трубы гараць».

Але ж каля мяне спыніўся, пытае:

— Гэта ты тут бардак развёў?

Ад здзіўлення я нават заікацца пачаў:

— Як табе такое ў галаву ўзбрыло?! Я проста па аб'яве... Вунь на дзвярах вісіць. Парадак трэба навесці. Вясна ідзе...

— А табе, што, больш за ўсіх трэба?!

Мой настрой прыкметна сапсаваўся. Але адступаць не было куды, і я ўзяўся саскрабаць са сцяны надпіс нейкага прыхільніка гурту «Дзюна», які да непрыстойнасці перайначыў песню «Наш Борка — бабнік».

Я ўжо даціраў апошняе брыдкае слова, калі з кватэры вышэй выйшла маладзіца з дзяўчынкай.

— Мама, ты казала, што на сценах нельга пісаць, — залапатала яна, — а дзядзька вунь, бачыш...

Не паспеў я і рот адкрыць, каб штосьць запярэчыць, як мама выдала:

— Дзядзька — дрэнны. Пагразі яму пальчыкам: «Ну, ну... Нядобра гэтак рабіць!».

— Гэта не я, — пачаў тлумачыць, чырванеючы, — гэта іншы хтосьці панапісваў! А я — саскрабаю. Суботнік сёння!

Але жанчына ўжо прыклала палец да намаляваных вуснаў: маўляў, не трэба, я ведаю... Гэта — у мэтах выхавання.

— Добра, я больш не буду пісаць на сценах, — паабяцаў я малечы.

Як тут на верхняй пляцоўцы «намалявалася» бабуля:

— Паглядзіце на яго! Ён абяцае, што не будзе! Ведаем мы такіх! Піска... У вас у крыві ўжо крэмзаць! На нешта добрае вы не здатныя...

Мае нервы напяліся як струна, гатовая вось-вось лопнуць. Асудзіўшы ў думках свой чыстаплюйскі парыў, я падаўся дамоў, дзе і прыйшоў да высновы, што сусед мой меў рацыю: мне трэба такі не больш, чым іншым.

А ў выніку першы суботнік у нашай пяціпавярхоўцы так і не адбыўся.

Але ж гэта — палова бяды. Бяда, калі не адбудуцца і наступныя, бо мы тады ніколі не навядзём належнага парадку ў сваім пад'ездзе, у сваім доме, у горадзе. Мы па-ранейшаму будзем адчуваць сябе нейкімі часовымі людзьмі, якім разам няма пра што клапаціцца.

Ці не так?

**Мікалай ГЛЕБ,**
*Ляхавіцкі раён*

■

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

■ Гэта цікава

# З ВІДАМ НА ГОМЕЛЬ

## Аглядная вежа адкрылася пасля рэстаўрацыі

**Яна знаходзіцца ў паўднёвай частцы Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, недалёка ад памяшкання Зімовага саду. Гэтыя два будынкі звязвае агульная гісторыя, якая бярэ пачатак яшчэ з сярэдзіны XIX стагоддзя.**

З 1840 года будынак Зімовага саду служыў адным з наземных карпусоў цукровага завода ўладальніка гомельскага маёнтка Івана Фёдаравіча Паскевіча. У падземным памяшканні вытворчага корпуса знаходзілася кацельня, якая давала параву энергію машынам. Для адводу прадуктаў гарэння і стварэння цягі для топкі на высокім беразе ракі Сож была ўзведзена высокая цагляная выцяжная труба.

Па жаданні новага ўладальніка гомельскага маёнтка Фёдара Іванавіча Паскевіча вытворчасць салодкага прадукту перайшла ў Добруш. А ў пачатку 1880-х гадоў пабудовы цукровага завода былі часткова пераабсталяваны. Іх прыстасавалі для патрэб парка (гэтую ж функцыю яны выконваюць і сёння). У наземным вытворчым корпусе размясцілася аранжарэя — «Зімовы сад». Выцяжная труба пасля рэканструкцыі стала выкарыстоўвацца як вежа агляду.

Вежа выконвала ролю паркавага аб'екта і за савецкім часам. У гады Вялікай Айчыннай вайны будынак пацярпеў ад абстрэлаў. Сляды аскепкаў і куль відаць на ёй і сёння.



У паваенны час аглядная вежай карысталіся аж да пачатку 2000-х гадоў. Але з-за аварыйнасці лесвічных пралётаў у 2007 годзе яна была зачынена на рэстаўрацыю. Падчас рамонтных работ замянілі металічныя канструкцыі, часткова ўмацавалі і рэстаўравалі цагляны мур, правялі электрычнасць. Разам з назіральнай пляцоўкай і шпілем вышыня агляднай вежы дасягае 40 метраў.

Ахвотным палюбавацца на Гомель з вышыні птушынага палёту трэба заплаціць усяго 15 тысяч рублёў. Уваходны квіток з бінoклем каштуе 50 тысяч рублёў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# МАГІЛЁЎСКАЕ БАРОКА ЦІ КЛАСІЦЫЗМ?

**На вуліцы Вялікая Грамадзянская ў Магілёве чакаюцца істотныя змены. Там плануюць аднавіць Свята-Пакроўскую царкву, рэстаўраваць і музеефікаваць знойдзеныя падмуркі званіцы. Акрамя таго з'явіцца некалькі новых будынкаў, прылеглая тэрыторыя вуліцы будзе добраўпарадкавана. Магіляўчане могуць выказваць свае меркаванні адносна новага праекта падчас грамадскага абмеркавання, якое праходзіць да 26 лютага ў холе Магілёўскага райвыканкама. Праз свае заўвагі і прапановы можна паўплываць на канчатковае рашэнне — якім быць храму?..**



Класічны варыянт завяршэння будучай Свята-Пакроўскай царквы.

По заказе Свята-Мікольскага жаночага манастыра эскізную прапанову праекта выконвалі спецыялісты Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (дарэчы, гэтая распрацоўка стала лаўрэатам XI рэспубліканскага конкурсу на лепшы архітэктурны праект у намінацыі «рэстаўрацыя»). Іх прапанова зроблена на падставе комплексных навуковых даследаванняў і прадугледжвае аднаўленне царквы ў традыцыях магілёўскай архітэктурнай школы XVII—XVIII стагоддзяў, калі яна была пабудаваная, — так званага магілёўскага барока.

Далейшую працу выконвалі ў «Магілёўграмадзянпраекце», дзе зрабілі архітэктурны праект. Аднак іх распрацоўка прадугледжвае аднаўленне царквы ў тым выглядзе, які яна атрымала пасля перабудовы 1863—1866 гадоў, калі некаторыя арыгінальныя рысы стылю ў выніку праведзеных прац аказаліся страчанымі.

У чым жа істотная розніца двух праектаў?.. Першая прапанова прадугледжвае шаломападобнае завяршэнне царквы. Другі ж варыянт прапануе выканаць завяршэнне царквы ў класічным стылі — у выглядзе цыбулін.

Пра вартасці адметнай архітэктурнай школы, якая была на Магілёўшчыне, распавёў **старшыня Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон АСТАПОВІЧ:**

— Аднаўленне Свята-Пакроўскай царквы ў стылістыцы магілёўскай рэгіянальнай школы барока — гэта не толькі адраджэнне страчанага архітэктурнага аб'екта, але і вяртанне культурнай з'явы, традыцыі архітэктуры, генэзіс якой можна прасачыць яшчэ з эпохі Рэнесансу, з пачатку XVI стагоддзя. Гэта правва еўрапейская дойлідства, якое прыйшло да нас з Люблінішчыны, а далей праз Вільню, Мінск на паднякроўскія землі, дзе ў Магілёве трансфармавалася пад уплывам мясцовых культурных традыцый і нарадзіла ўнікальны стыль, які пазней распаўсюдзіўся далёка за межы Беларусі.



Завяршэнне царквы ў традыцыі магілёўскага барока.

Варта дадаць, што менавіта з магілёўскага барока ў XVIII стагоддзі выйшла знакамітае ўкраінскае мазепінскае барока. Яго лепшыя прыклады можна ўбачыць у канструкцыі сабораў у Чарнігаве, Палтаве, Кіеве. Справа ў тым, што тэрыторыя Левабярэжнай Украіны панесла страты ў Паўночнай вайне. Менавіта магілёўскія арцелі майстроў пачалі актыўна запрашаць туды для рэканструкцыі храмаў і пабудовы новых. Такім чынам магілёўская школа прыйшла на Украіну.

Ці будзе абраны праект аднаўлення царквы ў традыцыйным для гэтай мясцовасці стылі, залежыць у тым ліку ад грамадскага абмеркавання. Да ўвагі будуць прымацца прапановы, абгрунтаваныя заканадаўчымі актамі і тэхнічнымі нормамі. Пасля іх разгледзяць на абласной экспертызе, у якую ўваходзяць архітэктары, канструктары, спецыялісты па стандартызацыі. Яны прааналізуюць прапановы, што паступяць падчас грамадскага абмеркавання, і калі знойдуцца іх слушнымі, могуць іх падтрымаць. Дарэчы, у нашай краіне дастаткова прыкладаў, калі пасля грамадскага абмеркавання лёс некаторых будынкаў істотна змяняўся: яны ўвогуле не ўзводзіліся або планы па іх пабудове істотна карэкціраваліся.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Калекцыя

# ПАДАРОЖЖА РАЗАМ З РАДЗІВІЛАМІ

**Яго можна здзейсніць у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Тут адкрылася выстаўка, арганізаваная пры падтрымцы кампаніі JTI. Гэты творчы праект ажыццёўлены сумесна з шэрагам літоўскіх музеяў. Выстаўка дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца з падзеямі даўніны, якія не так добра вядомы большасці з нас, але з'яўляліся вельмі важнымі для свайго часу. Удзел у іх бралі прадстаўнікі знакамітага роду Радзівілаў і іх сучаснікі.**

Беларускі бок разам з іншымі экспанатамі паказвае матэрыялы «Трайчанскага» архіва» — комплексу дакументаў XVI—XIX стагоддзяў, якія былі сабраныя ў Слуцкім Свята-Троіцкім праваслаўным манастыры. Гэтыя тэксты адлюстроўваюць разнастайныя бакі жыцця грамадства мінулых стагоддзяў. Большасць



За шклом музейных вітрын рэдкія выданні вялікай эпохі князёў.



Пячатка з гербам «Ляліва» — узор майстэрскага ліцця і гравіроўкі.



Зброя, якая служыла магнатам і іх сучаснікам.



Медаль у гонар 25-годдзя навуковай дзейнасці Эмерыка Гутэн-Чапскага.

з іх дагэтуль не выносілася на публічны агляд.

Сярод экспанатаў з Літвы — вырабы мастацкага ліцця і кавальства, паліхромная кафля. Маюцца тут і рэдкія кніжныя выданні той эпохі. Самае прыкметнае з іх — Біблія, якая надрукавана ў Брэсце ў 1563 годзе на замову Мікалая Радзівіла Чорнага. Гэты экзэмпляр паказваецца ў Беларусі ўпершыню.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара**

■ Прагнозы



# ЕЖЫ — МЕНШ, РОБАТАЎ — БОЛЬШ

## Што чакае чалавецтва ў наступныя 15 гадоў

**Кніга Мэцью Бароўза «Будучыня: рассакрэчана» распавядае пра самыя важныя трэнды, якія вызначаць, як будзе выглядаць свет праз 15 гадоў. Урыўкі з яе прапануем нашым чытачам.**

### ЧАЛАВЕЦТВА ПАСТАРЭЕ

Не менш важная і тэндэнцыя росту сярэдняй працягласці жыцця, якую мы назіраем ва ўсім свеце. У маі 2013 года Сусветная арганізацыя аховы здароўя ААН апублікавала звесткі, якія дэманструюць «павышэнне сярэдняй працягласці жыцця ў свеце з 64 гадоў у 1990 годзе да 70 гадоў у 2011-м», і гэта істотны рост. Зніжэнне назіралася толькі ў Паўночнай Карэі, ПАР, Лесота, Зімбабвэ і Лівіі.

Хутка старэючыя краіны могуць сутыкнуцца з запаволеннем росту ВУП і нават стагнацыяй. «Пажылым» дзяржавам будзе нялёгка правесці рэформы пенсійнай сістэмы і праграм па ахове здароўя — і арганізаваць фінансаванне для падтрымкі маламаёмных пенсіянераў, — пры гэтым не абцяжарваючы маладыя пакаленні, якія вымушаны будуць аплачваць пенсійныя праграмы. Урады краін з адносна высокім сярэднім узростам — 45-50 гадоў — могуць быць вымушаны істотна скараціць выдаткі і павялічыць падаткі. Хуткі рост колькасці азіяцкіх і афрыканскіх меншасцяў у заходнееўрапейскіх краінах з нізкім узроўнем нараджальнасці рызыкуе падарваць народную згоду і выклікаць рост рэакцыйных настрояў у палітыцы. І мы не ведаем, да чаго ўсё гэта прывядзе.

Грамадства, якое старэе, можа і не стаць той катастрофай, якой яно было б, калі б фізічная праца ўсё яшчэ была жыццёва важнай патрэбай, як на многіх гістарычных этапах. Прагрэс у галіне аховы здароўя, пра які ішла гаворка крыху вышэй, напэўна палепшыць якасць жыцця пажылых, што дазволіць ім даўжэй заставацца працаздольнымі.

### ПАМОЧНІК АБО КАНКУРЭНТ?

У пачатку 2014 года прайшло паведамленне, што адзін з наймагутных суперкамп'ютараў у свеце — японскі K. — стварыў найбольш дакладную сімуляцыю чалавечага мозгу з тых, якія калі-небудзь існавалі. Ёй патрабуецца 40 хвілін на тое, каб прайграць адну секунду чалавечай мазгавой дзейнасці. Навукоўцы мяркуюць, што сімуляцыя працы мозгу ў поўным аб'ёме будзе магчымая тады, калі з'явяцца яшчэ больш магутныя камп'ютары. Хутчэй за ўсё, гэта адбудзецца ў наступныя 10 гадоў. Разуменне канструкцыі чалавечага мозгу і здольнасць стварыць яго макець шырокае прымяненне ў медыцыне пры лячэнні такіх захворванняў, як хваробы Альцгеймера, Паркінсона і мноства іншых парушэнняў працы мозгу. Гэта таксама дасць істотны стымул у працы над стварэннем штучнага інтэлекту і выкарыстанні вялікіх даных.

Даследаванні ў вобласці штучнага інтэлекту некалькі прасунуліся наперад у тым, што тычыцца імітацыі мазгавой дзейнасці, але ўдалая сімуляцыя дзейнасці чалавечага мозгу, зробленая не так даўно японскім камп'ютарам, дапаможа рушыць наперад у яе разуменні. Тут неабходна таксама зрабіць крок наперад у развіцці алгарытмаў, якія выкарыстоўвае камп'ютарная праграма для аднаўлення працы мозгу. Пошук больш эфектыўных алгарытмаў вырашэння праблем стаў для даследаванняў у вобласці штучнага інтэлекту першачарговай задачай.

Алгарытмы і інтэрнэт рэчаў, які ўсё часцей называюць інтэрнэтам усяго, — саюз, заключаны на нябёсах, які ўносіць істотны ўклад у навуку, ахову здароўя, эфектыўнае выкарыстанне рэсурсаў і разумныя гарады. Аднак разам вялікія даныя і алгарытмы могуць прывесці да масіраванай атакі на асабістую інфармацыю. Больш за тое, ёсць вялікі патэнцыял для злоўжыванняў алгарытмамі прагназавання. Ужо сёння страхавыя кампаніі і камісіі па ўмоўна-датэрміновым вызваленні выкарыстоўваюць прагнозныя алгарытмы, каб вылічыць рызыкі; у ЗША ўсё больш месцаў, дзе праца паліцыі ажыццяўляецца на аснове прагназавання, пасля апрацоўкі звестак выбіраюцца вуліцы, групы або асобныя людзі, якія становяцца аб'ектамі больш пільнай увагі.




### АТАКА РОБАТАЎ

Нават у краінах, якія развіваюцца, робаты могуць замяніць мясцовую рабочую сілу ў такіх галінах, як электроніка, што адмоўна адаб'ецца на ўзроўні мясцовых заробкаў. Кампанія Foxconn — кітайскі вытворца прадуктаў Apple — як вядома, плануе замяніць 80% супрацоўнікаў робатамі.

Выкарыстанне робатаў не будзе абмяжоўвацца рабочым месцам або побытам. Аўтаномныя рухальныя апараты, у тым ліку культавы беспілотны аўтамабіль ад Google, могуць ужо ў бліжэйшыя 10 гадоў запоўніць нашы аўтастрады. Доўгатэрміновым наступствам укаранення беспілотных аўтамабіляў і іншых аўтаномных транспартных сродкаў можа стаць радыкальнае змяненне спосабаў выкарыстання аўтамабіляў, якое адаб'ецца на транспартнай інфраструктуры і выкарыстанні гарадскіх тэрыторый. Беспілотныя аўтамабілі падштурхнулі б да рэарганізацыі гарадоў і змен у гарадскім ладзе жыцця. Рабатызаваныя транспартныя сродкі, асабліва калі разам з іх з'яўленнем змяняюцца схемы валодання імі і іх выкарыстання, мелі б разбуральныя наступствы для сусветнай эканомікі, у першую чаргу для аўтамабільнай прамысловасці.



Вялікую пагрозу абяцаюць прарывы ў праграмным забеспячэнні, з'яўленне праграм, якія могуць выконваць працу высокакваліфікаваных працаўнікоў хутчэй і акуратней. Неверагодныя магчымасці пошукавых машын, такіх як Google Search або Microsoft Bing, заснаваных на магутных алгарытмах ранжыравання, істотна пераўзыходзяць чалавечыя: пашукавікі могуць прасейваць мільярды пунктаў звестак у пошуках адказу на запыт. Іншыя магутныя алгарытмы замяняюць адвакатаў пры дапамозе функцыі eDiscovery, скануючы мільёны юрыдычных дакументаў з велізарнай хуткасцю, неверагоднай дакладнасцю і меншымі матэрыяльнымі выдаткамі, чым людзі. Рэнтгенаўскія здымкі камп'ютарамі апісваюцца нашмат больш дакладна, чым рэнтгенолагамі. Пастаянна павышаецца якасць анлайн-перакладчыка Google Translate за кошт аналізу велізарных аб'ёмаў інфармацыі і прасунутых алгарытмаў. Адным словам, многія прафесіі або нават сферы дзейнасці будуць з часам цалкам ліквідаваныя са з'яўленнем рэвалюцыйнага праграмнага забеспячэння.

Гэта падводзіць нас да важнага пытання: ці будзе пры гэтым ствараецца больш працоўных месцаў, чым знішчаца. На справе ніхто гэтага з упэўненасцю сказаць не можа, але асцярогі выказваюць нават тыя эканамісты, чые тэорыі прадракаюць з'яўленне з попелу знішчаных працоўных месцаў такіх новых прафесій, якія мы сёння і ўявіць сабе не можам. Нядаўняя справаздача АЭСР адкрыла нам вочы на некаторыя факты, якія палохаюць: згодна з праведзенымі даследаваннямі, новыя тэхналогіі былі на 80% вінаватыя ў 4-працэнтным памяншэнні долі сусветнага ВУП, што прыпадае на працоўны клас, якое адбылося за апошнія 20 гадоў. Затое тыя нешматлікія, хто валодаў кваліфікацыяй і талентам у тых галінах, дзе пачалі прымяняцца новыя тэхналогіі, а таксама менеджмент і ўладальнікі карпарацый, — памножылі свае багацце.

*theoryandpractice.ru*

■ Дайджэст

# АД КАНТРОЛЕРАЎ ДА ДУМАК

**Робататэхнікі з Масачусецкага тэхналагічнага інстытута ствараюць робата HERMES. Гуманоідная машына рэфлекторна кіруецца чалавекам, апранутым у спецыяльны экзашкілет.**

Падобную сістэму кіравання, толькі больш маштабную, вы маглі бачыць, напрыклад, у фантастычным фільме «Ціхаакіянскі рубеж». За выключэннем, мабыць, таго, што тут чалавек не сядзіць унутры робата. Ды і не для таго ў рэальнасці вядуцца падобныя распрацоўкі. Асноўнай задачай падобных робатаў у будучыні будуць выратавальныя аперацыі.

Жоаа Рамас, адзін са стваральнікаў робата, апісвае гэты праект як «спробу ўкаранення чалавечага мозгу ў робата». HERMES мае дзве нагі і дзве рукі, на кожнай з якіх па тры пальцы. Дзякуючы рэфлекторнаму кіраванню робат здольны не толькі разбурэць, скажам, гіпсакардонныя сценкі,



але і далікатна наліваць вам каву. Аднак галоўная інавацыя ў гэтым робаце не яго рукі, галоўнае тут — сэнсары. Каб рухі робата больш нагадвалі чалавечыя, яго сэнсары падаюць сігналы зваротнай аддачы ў экзашкілет чалавека, які ім кіруе і той можа карэкціраваць яго рухі, як гэта б зрабіў любы іншы чалавек у той ці іншай сітуацыі.

Дзякуючы такому «запазычанню» рэфлексаў робат здольны вучыцца. Кіраванне рукамі робата адбываецца дзякуючы двум убудаваным у экзашкілет кантролерам. Альберт Ванг, яшчэ адзін спецыяліст, які працуе з HERMES, кажа, што наступная версія робата будзе кіравацца чалавечымі думкамі

■ А вы ведалі?

# ХОЧАШ ЗАРАБІЦЬ — ХАДЗІ!

**У свеце з'явілася новая крыптавалюта Bitwalking, якую можна зарабіць фізічнай актыўнасцю.**



У 2016 годзе ў свабоднае абарачэнне паступіць новая крыптавалюта — долары Bitwalking (BW $), зарабіць якія зможа кожны, хто шмат ходзіць пешшу. Проста ўсталяваўшы на сваім смартфоне спецыяльную праграму, уладальнік гаджэта зможа атрымліваць па адным BW $ за кожныя пройдзеныя 10 тысяч крокаў, што складае прыкладна 7—8 км.

Як менавіта будуць падлічвацца зробленыя крокі, пакуль не раскрываецца, для верыфікацыі будуць выкарыстоўвацца даныя GPS і злучэнні па Wi-Fi. Японская кампанія Murata ўжо працуе над стварэннем фітнес-бранзалета, здольнага паказваць уладальніку, колькі BW $ той зарабіў. Японскія інвестары ўклалі ў фінансаванне праекта Bitwalking каля $10 млн, а адзін з брытанскіх банкаў цяпер вядзе перамовы аб тым, каб стаць яго афіцыйным партнёрам.

У далейшым да ўдзелу ў праекце планууецца прыцягнуць таксама кампаніі, якія спецыялізуюцца на вытворчасці спартыўнага адзення і абутку, службы аховы здароўя і арганізацыі па абароне навакольнага асяроддзя, а таксама працадаўцаў, якія жадаюць прэміраваць сваіх супрацоўнікаў за тое, што тыя вядуць здаровы лад жыцця. На думку аўтараў праекта, на першапачатковым этапе курс BW $ будзе прыроўнены да аднаго долара ЗША. Пры гэтым крыптадаларамі можна будзе разлічвацца ў адмысловым інтэрнэт-магазіне альбо абменьваць іх на больш традыцыйную валюту. Пасля арганізатары праекта спадзяюцца павялічыць колькасць кампаній, якія прымаюць BW $ у якасці аплаты за свае тавары і паслугі.

«Для некаторых гэта — бясплатны кубак кавы штотыдзень, прапанаваны мясцовымі кавярнямі, якія імкнуцца прыцягнуць новых кліентаў. Для іншых гэта магчымасць змяніць жыццё, пачаўшы зарабляць і кіраваць грашыма. І адначасова гэта будзе нас падахвочваць абараняць планету і заставацца здаровымі», — патлумачыў адзін з заснавальнікаў праекта Bitwalking Фрэнк Імбес.

У развітых краінах сярэднестатыстычны ўдзельнік праекта Bitwalking, як мяркуецца, зможа зарабляць каля 15 BW $ у месяц. Аднак месцам тэставання Bitwalking абранаа Малаві. У гэтай беднай афрыканскай краіне сярэдняя зарплата сельскіх жыхароў складае каля $1,5 у дзень, і арганізатары праекта разлічваюць, што менавіта тут BW $ будуць асабліва запатрабаваныя. Зрэшты, бізнес-кансультант Карэн Чынквіта з кампаніі Jubilee Enterprises асцерагаецца, што многія мясцовыя жыхары зусім кінуць працаваць, бо проста хадзіць апынецца больш выгадна

Матэрыялы падрыхтаваў
Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

Вниманию акционеров

## ОАО «БЕЛСОЛОД»

**17 марта 2016 г.**
**по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32**
**состоится очередное общее собрание акционеров.**

**Начало работы собрания в 13.00.**
**Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 12.00 до 12.55.**
**Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – также доверенность или договор).**
**С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 10 марта в рабочие дни с 9.00 до 16.00.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белсолод» в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Белсолод» за 2015 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2015 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Белсолод». Ознакомление Общества с заключением аудиторов.
4. Утверждение годовых отчетов, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2015 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2015 год. О выплате дивидендов за 2015 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Белсолод» на 2016 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Белсолод»
8. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О продаже гражданам жилых помещений.

УНП 200075434 *Наблюдательный совет.*

## Вниманию кредиторов ЗАО «ДГ-Центр»

Закрытое акционерное общество «ДГ-Центр» уведомляет кредиторов о том, что 08.02.2016 внеочередным общим собранием акционеров ЗАО «ДГ-Центр» (далее – Общество) **принято решение о реорганизации Общества путем выделения из него нового юридического лица.**

Переход активов и обязательств к выделяемым юридическим лицам согласно разделительному балансу будет произведен пропорционально, в связи с чем права кредиторов не нарушаются.

Требования кредиторов о досрочном прекращении обязательств принимаются ЗАО «ДГ-Центр» в месячный срок с момента публикации настоящего объявления по адресу: 220053, г. Минск, а/я 27.

УНП 690557618

УНП 300042199

## ОАО «Нафтан»

### РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

| Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| Прицеп 2 ПТС-4, 5 | 06260523 | 2003 | 25 200 000 |
| Прицеп тракторный ПСЕ-Ф, гос. № БХ 2871 | 16150639 | 1996 | 18 000 000 |
| Валторна ROY BENSON | 16315245 | 2006 | 4 440 000 |
| Баритон ROY BENSON | 16315247 | 2006 | 4 800 000 |

<u>Состояние удовлетворительное.</u>
Предложения принимаются по адресу:
**211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 17 марта 2016 года с пометкой на конверте: «Реализация неликвидов.17.03.2016».**
Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by.**
Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (продавец) ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ИМУЩЕСТВА:**

**здание административного корпуса, общ. пл. 2168.9 кв.м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25.8 кв.м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл. 65 кв.м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414.3 кв.м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв.м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв.м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440,2 кв.м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора** на земельном участке, площадью **3.1450 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1;

**трансформаторная подстанция, общ. пл. 40,2 кв.м (инв. № 640/С-27297); насосная станция (станция 2 подъема), общ. пл. 116.9 кв.м (инв. № 640/С-51797)**. на земельном участке, площадью **0,1960 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко;

**скважина № 8** (инв. № 640/С-27298) и **ограждение**.

Начальная цена с НДС – 5 433 261 360 бел. руб. ***<u>(стоимость снижена на 70%)</u>***. **Задаток 10% от начальной цены (543 326 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 28.01.2016. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **29.02.2016 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.02.2016 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 22.03.2016 г. в 10.30 по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 4 этаж, актовый зал.**

**Организатором аукциона является**

### РУП «Белпочта» в лице Гродненского филиала РУП «Белпочта»,

**находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29.**

<u>На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:</u>

**ЛОТ №1.** Помещение на 3 этаже площадью 13,9 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29, пом. 6, изолированное помещение, помещение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 417 000, размер задатка – 41 700 рублей, целевое использование – размещение офисов, организации производств (кроме вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения.

**ЛОТ №2.** Помещение на 2 этаже площадью 13,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Максима Горького, 24-38, изолированное помещение, отделение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 411 000 рублей, размер задатка – 41100 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств).

Арендная плата устанавливается в соответствии с Положением о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 года № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» (далее – Положение). При установлении коэффициента от 0,5 до 3 включительно, определенного п. 8.2 Положения, при расчете арендной платы применяется коэффициент в размере 3.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 17.02.2016 г. по 21.03.2016 г. в рабочее время (с 8.30 до 17.15) по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 3 этаж, каб. 302. Документы, поданные после 16.00 21.03.2016 г., не рассматриваются.**

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. №1049.

<u>Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:</u>

- перечисляет задаток на субсчет № 3012000060006 в филиале №400 ГОУ «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, код 752, УНП 500826554, Гродненский филиал РУП «Белпочта»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

<u>Помимо указанных документов:</u>

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации, документ, удостоверяющий личность;

- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

В случаях, если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин.

Договор аренды по результатам проведения аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Телефон для справок: (8-0152) 74-61-47, факс (8-0152) 72-31-23.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 50%) по продаже имущества ОАО «Хоневичи»

| Предмет торгов, краткая характеристика | Лот №1 | | |
|---|---|---|---|
| | **Капитальное строение с инв. № 413/С-20736** (здание основного корпуса кирпичного завода), общей площадью 1297,3 кв.м, кирпичное, одноэтажное, 1948 г.п., составные части и принадлежности – пристройка | | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., Свислочский р-н, Свислочский с/с, д. 23 около д. Гончары | | |
| **Информация о земельном участке** | Имущество расположено на земельном участке площадью 1,0 га с кадастровым номером 425282400001000110, назначение – для размещения объектов иного назначения (для обслуживания здания основного производственного корпуса кирпичного завода). Ограничения (обременения) прав: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи (0,1320 га). Имущественные права – право аренды по 02.02.2065 год | | |
| **Начальная цена** | **282 540 000 рублей с учетом НДС** | **Сумма задатка (10%)** | **28 254 000 рублей** |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Хоневичи», Гродненская обл., Свислочский р-н, а/г Хоневичи, ул. Школьная, 1, тел. 8(01513) 23686 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 3 марта 2016 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | **по 26 февраля 2016 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по телефонам: 8(0152) 74 49 11, 77 23 79 | Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 21.08.2015 г., от 07.10.2015 г. | | |

## ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 8»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без учета НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Объект недвижимости: Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-122236, площадью 153,2 кв.м (назначение: административное помещение, наименование: изолированное помещение), находящееся в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-38868, расположенном на земельном участке с кадастровым номером 140100000001003204, площадью 0,9603 га | 846 000 000 | 84 600 000 |
| **Местонахождение объекта** | г. Брест, ул. Гродненская, 47/1. | | |
| **Характеристики замельного участка** | Земельный участок выделен продавцу на праве постоянного пользования | | |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Строительный трест №8» | | |
| **Организатор торгов** | ОАО «Строительный трест №8» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Шаг аукциона** | 5% от начальной цены лота | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012121884440 в Региональной Дирекции № 100 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, получатель платежа ОАО «Строительный трест № 8» | | |
| **Аукцион состоится <u>26 февраля 2016 г. в 11.00</u> по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний ОАО «Строительный трест № 8» каб. 230, 231** | | | |

<u>Для участия в аукционе необходимо предоставить:</u>

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ОАО «Строительный трест № 8».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, каб. 418 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**<u>Последний день приема заявлений</u> – 26 февраля 2016 г. до 10.00.**

**Контактный телефон организатора аукционных торгов: 8-(0162)-22-01-72.**

УНП 200002603



Ірына ЛЯПАРСКАЯ:

# «АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ — ГЭТА НАЙБЛІЖЭЙШЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ДА... БОГА»

## Чалавек, які ведае сакрэт поспехаў, расказвае пра самы прыгожы і медальны спорт у краіне

**Здаецца, яна лепш за іншых у беларускім спорце ўмее шукаць таленты. Ужо не адзін дзясятак гадоў пад яе чулым кіраўніцтвам нашы грацыі пакараюць спартыўны свет. У 1988 годзе алімпійскі медаль у мастацкай гімнастыцы выйграла першая савецкая спартсменка — Марына Лобач, менавіта Ляпарская знайшла гэтую дзяўчынку ў Смалявічах і параіла перабрацца ў Мінск, каб працягнуць трэніроўкі на больш высокім узроўні. Прайшло 28 гадоў, сярод сусветных лідараў у самым грацыёзным відзе спорту — Станюта і Галкіна, якіх на вяршыню прывяла ўсё тая ж Ірына Юр'еўна. А паміж мінулым і сучаснасцю былі Лук'яненка, Паўліна, Жукава, Рудалава, Чаркашына — і за ўсімі стаяла яна.**

У спартыўным свеце Ляпарскую абагаўляюць, гімнасткі яе паважаюць, а журналісты пабойваюцца, бо Ірына Юр'еўна заўсёды аб'ектыўная, прамалінейная і вельмі крытычная. Мне хацелася б даведацца пра яе трохі больш, як пра чалавека: чым яна жыве за межамі гімнастычнай залы і што для яе звычайнае чалавечае шчасце, але, мабыць не гэтым разам... Год алімпійскі, а значыць, вельмі складаны і вельмі важны, і размовы тут толькі пра гімнастыку, дзяўчат і спаборніцтвы. Ды і аддзяліць спорт ад паўсядзённага жыцця Ляпарскай аказалася немагчыма.

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай напярэдадні асноўнага старту чатырохгоддзя ў інтэрв'ю газеце «Звязда» расказвае пра падрыхтоўку беларускіх спартсменак, працяг традыцый нашай школы, сучасных дзяцей і рэакцыю грамадства на перспектыву з'яўлення новага спартыўнага палаца.

### ПРА ПАДРЫХТОЎКУ ДА АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

*У мінулым годзе на чэмпіянаце свету беларускія грацыі заваявалі максімум алімпійскіх ліцэнзій — тры. У Бразіліі нашу краіну прадставяць дзве гімнасткі ў асабістых відах і каманда дзяўчат у групавым практыкаванні. Падобнага поспеху па ліку заваяваных пуцёвак у Рыа-дэ-Жанэйра, акрамя нашай краіны, дамаглася толькі Расія.*

— Алімпійскія гульні — гэта старт, якога чакаюць спартсмены ўсяго свету. Пяцігадовыя дзеці прыходзяць у залу і ў іх перад вачыма ў першую чаргу ўзнікае алімпійскі п'едэстал. Таму гэта вялікая псіхалагічная адказнасць і сур'ёзная фізічная нагрузка. Галоўнае, каб зараз у дзяўчат хапіла здароўя і ніякія эпідэміі нам не пашкодзілі.

Што тычыцца падрыхтоўкі, то як мы пачалі, як толькі сышлі з п'едэстала чэмпіянату свету. Сабраліся і пачалі абмяркоўваць праграму наступнага года, заняліся пошукамі музыкі і падборам касцюмаў, якія ўжо, дарэчы, шыюць.

У снежні з камандай правялі збор у Ізраілі, дзе ўжо канчаткова трэнерскім складам праглядалі і зацвярджалі праграмы, у студзені прайшлі першы ранні старт у Лос-Анджэлесе. Мы заўсёды любім ездзіць менавіта туды, далей ад чужых вачэй, з асноўных канкурэнтаў на турніры за акіянам была толькі каманда Украіны. Такія паездкі важныя, таму што ў зале дома вочы «замыльваюцца», а там з трыбуны мне многае становіцца зразумела, што правільна, што — не. Пасля гэтага старту мы заняліся вельмі актыўнай пераробкай практыкаванняў, наогул працы яшчэ шмат, і яна кіпіць. Першы асноўны старт, дзе мы павінны паказаць, што паспелі падрыхтаваць, — гэта Гран-пры ў Маскве. На чэмпіянаце Еўропы ў Ізраілі, гэта чэрвень, у нас павінна быць ужо 80-працэнтная гатоўнасць, там мы пакажам усе алімпійскія праграмы, у тым ліку і групавічак.

**Я адказнасці не баюся, калі не я, то — хто?**

Трэба памятаць, што мая праца — гэта не толькі падрыхтаваць Станюту і Галкіну да Алімпійскіх гульняў. Працягвае існаваць беларуская школа мастацкай гімнастыкі, таму я працую і з юніёркамі, сачу і вяду іх, яны таксама возьмуць удзел у кантынентальным першынстве ў Ізраілі. У нас нядрэнная лаўка запасных, шмат роўных дзяўчат, з 6-8 мне трэба выбраць 3-4, таму я стараюся трапляць на іх спаборніцтвы, гэта ж наша будучыня.

### ПРА ЗАДАЧЫ

— Перад намі задачы на Алімпійскія гульні ставіць не трэба, дзяўчаты калі прыйшлі ў залу ў 4-5 гадоў ужо паставілі перад сабой асноўную мэту, а я паставіла яе сабе, як толькі прыйшла працаваць трэнерам. Вышэй чым мы самі сабе задачы ўжо не паставіць ніхто, а ці атрымаецца іх рэалізаваць, будзе залежаць не толькі ад нас. Усе ведаюць, што ўдача для спартсмена шмат значыць, Алімпійскія гульні — гэта найбліжэйшыя спаборніцтвы да Бога, трэба яшчэ вельмі сумленным і чыстым туды прыйсці.

### ПРА САКРЭТ ПОСПЕХАЎ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

— Для мяне асабіста гэта будзе ўжо шостая алімпіяда і кожны раз за вынік даводзіцца адказваць, але вы ведаеце, я адказнасці не баюся, калі не я, то — хто? Я не ўзвальваю ўсё на сябе, гэта не правільна, у нас вынікі ў мастацкай гімнастыцы столькі гадоў трымаюцца на высокім узроўні менавіта таму, што трэнерскі склад, пачынаючы з 1996 года (як я ўзначаліла зборную) не мяняўся. Мы працуем усе, як адно цэлае: і Таццяна Нянашава, якая ўзначальвае групавое практыкаванне, і Ларыса Лук'яненка з Марынай Лобач, якія працуюць з юніёркамі, і многія іншыя (харэографы, урачы — радкоў не хопіць, каб усіх згадаць). Мы ўсе ў адной запрэжцы, таму вынікі можна рабіць з года ў год па напрацаванай схеме. Ніхто мне ніколі не адказаў, што гэта мая праца, а гэта — твая. Яна ў нас ва ўсіх адна. Пастаянна прыходзяць да нас маладыя трэнеры, былыя гімнасткі, як Люба Чаркашына, Юля Бічун, Марына Ганчарова — усе нашы выхаванкі. Я ім даваряю ўсё, пачынаючы ад працы ў зале, і заканчваючы тым, каб вывесці гімнастку на дыван падчас самых высокіх стартаў. Усё роўна, вядома, пакуль нічога не адбываецца без майго ўдзелу, нават калі яны недзе адны, я ўсё адсочваю анлайн, кожны выхад гімнасткі на дыван пачынаецца з sms і ёю заканчваецца.

Мы не збіраемся нікуды сыходзіць, але на кожнае месца я рыхтую па дзве памочніцы, каб мастацкая гімнастыка ў Беларусі не скончылася, хочацца выбудаваць сваю сістэму, якая працавала б многія гады.

### ПРА ПАПУЛЯРНАСЦЬ У КРАІНЕ

— Моцна ўзрасла цікавасць пасля Пекіна, дзе мы выйгралі медалі, дадалася пасля Лондана. Людзі ўбачылі, што ў гэтага віду спорту ёсць перспектыва, і павялі дзяцей. Яны вядуць іх і да гэтага часу ў вялікай колькасці, нам прыйшлося адкрыць ужо платныя групы, таму што штатны расклад не вытрымлівае такога аб'ёму.

Наш бум, вядома, не параўнаецца з тым бумам, які цяпер у Расіі, але мы разумеем, у якой краіне жывём: не вялікай, але з годнасцю. Таму стараемся з таго, што ёсць, знаходзіць адзінкавы матэрыял і з іх спрабаваць рабіць канкурэнтаздольных гімнастак.

Стараемся адкрываць аддзяленні ў малых гарадах, але вось напярэдадні паўстала праблема: закрываецца аддзяленне па мастацкай гімнастыцы ў Рагачове. Мы два гады яго адкрывалі, шмат намаганняў прыклалі, каб там з'явіўся дыван, інвентар, там ужо 30 дзяўчынак займаецца і яшчэ ахвотных не злічыць. А закрываюць таму, што там няма спецыяліста, які мае права на трэнерскую дзейнасць. Для мяне асабіста — гэта трагедыя, будзем прасіць, звяртацца, пісаць. Проста так я не збіраюся здавацца.

### ПРА ДЗЯЦЕЙ

— Сёння я ўжо ведаю пайменна ўсіх дзяўчынак да 2009 года нараджэння, якія вартыя маёй увагі, як будучыя члены нацыянальнай каманды. У нас ёсць кандыдаты, якіх мы рыхтуем да II юнацкіх Алімпійскіх гульняў і нават тых, каго мы рыхтуем да галоўных Гульняў-2020. У нас далёкасяжныя планы, для ўсяго трэнерскага калектыву мастацкая гімнастыка — гэта ўжо лад жыцця, мы дадому з'язджаем толькі пераначаваць.

### ПРА НОВЫ ПАЛАЦ

— Я заўсёды імкнуся паказаць, як развіваецца Беларусь, якія спартыўныя збудаванні ў нас з'яўляюцца, каб не толькі спартсменаў, але і турыстаў зацікавіць прыехаць і паглядзець.

Пасля таго, як было прынята рашэнне пабудаваць у Мінску Палац мастацкай гімнастыкі, пасыпаліся водгукі такога кшталту: «Навошта яшчэ адзін палац, лепш бы пабудавалі бальніцу». Я таксама не пярэчыла б супраць прыгожай, чыстай, светлай бальніцы, але каб у нас было заўтра менш бальніц, сёння трэба больш палацаў спорту. Калі ўсе дзеці, якія займаюцца ў гэтых комплексах, зараз выйдуць на вуліцу, мы потым не будзем ведаць, колькі яшчэ пабудаваць бальніц, наркалагічных цэнтраў і папраўчых установ.

Будаўніцтва нашага палаца і замарожвалася, і прыпынялася, але цяпер бачым бы ўсё нармальна, да канца 2017 года паабяцалі яго адкрыць. Люба Чаркашына падарыла мне кулон у выглядзе ключа, буду насіць, пакуль не адкрыюць наш цэнтр. Мне б не хацелася, каб палац, калі яго пабудуюць, пачынаў з дрэннай аўры, з нейкіх асуджэнняў, бо гэта для нашых дзяцей, унукаў і праўнукаў.

**Каб у нас было заўтра менш бальніц, сёння трэба больш палацаў спорту.**

Мастацкая гімнастыка засталася адзіным жаночым відам спорту, які паказвае вынік на працягу ўжо 20 гадоў. Калі камусьці ён не падабаецца, то хаця б падумайце пра тое, што заняткі гімнастыкай, пачынаючы з малодшага ўзросту, і дзяўчынкам і хлопчыкам, акрамя карысці, нічога не прынясуць.

Я хачу, каб гэты палац стаў цэнтрам прыгажосці, здароўя, грацыі і спартыўнай славы Беларусі, я яго вельмі чакаю.




Гэта і яе ўзнагароды...

---

## ■ Бліц-навіны

# Змагацца і перамагаць

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра выступленне гандбольнага СКА ў Кубку ЕГФ, хакейнай зборнай на турніры ў Славакіі і перамогу Аліны Талай у Лінцы.**

**1. Гандбольны СКА з вікторыі стартаваў у групавым этапе Кубка ЕГФ.** У першым матчы армейцы сустракаліся з швейцарскім «Вінтэртурам» і на сваёй пляцоўцы былі мацнейшыя 31:27. Самым выніковым у складзе беларускіх гандбалістаў стаў **Уладзіслаў КУЛЕШ**, на яго рахунку 9 закінутых мячоў.



*— Перамаглі ў першую чаргу дзякуючы абароне, важна, што «зачапіўся» за мяч Слава Салдаценка. Дзякуючы гэтаму, у самым пачатку гульні мы стварылі невялікі зачын, а затым паспяхова яго адстойвалі,* — адзначыў пасля фінальнага свістка Уладзіслаў.

Паядынак праходзіў у абноўленым Палацы спорту «Уручча», гульню наведалі 2300 заўзятараў. Напярэдадзе ў каманды Спартака Міранавіча два матчы на выездзе, каманда адправіцца спачатку ў Францыю (20 лютага), а затым у Данію (27 лютага). 6 сакавіка СКА вернецца дадому, дзе згуляе з Б'ерынгбро (Данія).

*— Сёння ў нас шмат унутраных клопатаў. У клуба юбілей — 40 гадоў, мы адкрылі новую арэну. Упершыню на яе прыйшло столькі гледачоў, і гэта накладвала на нас вялікую адказнасць, хацелася згуляць як мага лепш.*

*Добра, што некаторыя нашы гульцы атрымалі вопыт выступлення на чэмпіянаце Еўропы ў Польшчы. Бо ў чэмпіянаце Беларусі ў нас няма такіх паядынкаў, і мы не маглі дакладна вызначыць свае магчымасці. Нягледзячы на перамогу, у нас паўстала шмат праблем у матчы. Думаю, мы выправім недахопы ў ходзе работы. Усё ж такі ў нас маладая перспектыўная каманда,* — сказаў **галоўны трэнер СКА Спартак МІРАНОВІЧ.**

**2. Аліна Талай перамагла ў бегу на 60 м з бар'ерамі на міжнародным турніры ў Лінцы.** У фінальным забегу беларуска паказала час 7,97 сек. і апярэдзіла славенку Марыну Томіч — 8,21 сек.

Наступным стартам для Аліны стане чэмпіянат Беларусі, які пройдзе з 19 па 21 лютага ў магілёўскім спарткомплексе «Алімпіец».

**3. Нацыянальная зборная Беларусі па хакеі заняла другое месца на турніры Slovakia cup, які завяршыўся ў Жыліне.** У першым матчы падапечныя Дэйва Льюіса саступілі славакам 1:2, а ў наступнай гульні былі мацнейшыя за швейцарцаў — 3:1.

*— Не турбуюся з нагоды колькасці закінутых намі шайбаў. Галоўнае, што мы выйграем. У кожным матчы стараемся забіць больш галоў, але моманты не заўсёды рэалізуюцца. Задаволены дзеяннямі маладзёжнага звяна. Казаў хлопцам, што на чэмпіянаце свету яны павінны быць гатовыя да штодзённых матчаў. Важна было пагладзець, як яны сябе адчуваюць у такім рэжыме. Мы хочам пашырыць рэестр зборнай. Таму на маючым адбыцца чэмпіянаце свету будуць новыя прозвішчы,* — падвёў вынік **галоўны трэнер зборнай Дэйв ЛЬЮІС.**

**4. Вікторыя Азаранка апусцілася на адзін радок у абноўленым рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі (ВТА) і цяпер займае 15-е месца.**

Адзначым, што ў першую сотню сусветнага рэйтынгу ўваходзяць яшчэ дзве беларускі — 74-е месца ў Вольгі Гаварцовай, на 98-й пазіцыі Аляксандра Сасновіч.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

# ПЫТАЎСЯ ЛЮТЫ, ЦІ ДОБРА АБУТЫ



**По гарызанталі:**

**4.** Майстэрня, куды вяскоўцы прыходзілі 21 лютага, у дзень прарока Захара, з сабой абавязкова бралі сярпы. **7.** Шэры заяц, у адрозненне ад беляка, захоўвае аднолькавую афарбоўку і летам, і зімой. **8.** Снежная бура, завіруха, даволі частая ў лютаўскую пару. **9.** Невялікі лясны грызун, корміцца ягадамі, арэхамі, жалудамі, якія назапашвае на зіму ў дуплах, шарападобных гнёздах. **11.** Фантастычная істота, што, па павер'і старажытных славян, карачыла зіму. **16.** Традыцыйны пачастунак, на які бацькі маладой запрашалі зяця і яго радню ў масленічную сераду. **17.** Свята народнага календара напрыканцы лютага, у гэты дзень пяклі і асвячалі ў царкве жытні хлеб. **22.** Незамёрзлы ўчастак на паверхні вадаёма, дзе зімой звычайна трымаецца аляпка, іншыя птушкі. **24.** Вечназялёны куст з ягадападобнымі чорна-сінімі пладамі, якімі ахвотна ласуецца чорны дрозд у заснежаным лесе. **26.** Любімае месца зімовых дзіцячых забаў. **27.** Спецыяльнае, паглыбленае ў зямлю памяшканне для захоўвання гародніны, прадуктаў. **28.** Хто ў вядомай казцы С. Маршака «Дванаццаць месяцаў» выратоўвае падчарку, якую злая мачыха выгнала ў зімовы лес?

**Па вертыкалі:**

**1.** Казка Алены Міхаленка «Калядны...». **2.** Калі ён часта надараецца ў лютым, чакалі дажджлівага лета. **3.** Цёплы абутак, звалены з воўны. **5.** Абрад, што па народным павер'і мог прадказаць будучае, найлепшай парой для яго лічыўся час зімовага сонцавароту. **6.** Некранутая заснежаная прастора. **12.** Лядовае збудаванне Снежнай каралевы. **15.** Лыжны маршрут на лагойскіх схілах. **18.** Зімовыя пасядзелкі, на якія вясковыя дзяўчаты прыходзілі з прасніцамі і калаўроткамі, да іх нярэдка далучалася хлапечая кампанія з гарманістам. **19.** Птушка атрада вераб'інападобных, што ў лютым чародамі вандруе ў нашых лясах, павольна скіроўваючы на поўнач. **20.** Пакрытая лёдам пляцоўка для катання на каньках. **21.** Прыкмячалі ў народзе: калі ён бый моцным у дзень Трохсвяцця (12 лютага), чакаўся мокры год. **25.** Ежа, якой у зімовым лесе ласуюцца ласі.

**Па дугах:**

**10.** Масленічны абрад, галоўныя персанажы якога — хлопцы-пераросткі, «пакараныя» жаночым гуртам. **13.** Свята, што ўшаноўваецца напрыканцы лютага як ахоўніца і заступніца сям'і. **14.** Зімовае логава мядзведзя. **23.** Масавая народная гульня, традыцыйная на грамнічныя святкі.

**Склаў Іосіф КАРПЫЗА,**
*г. Ляхавічы.*

**Заўвага!**
Крыніцы тлумачэння:
*1. А. Русецкі. «Дзень за днём». Мінск, 2008.*
*2. А. Лозка. Беларускі народны каляндар. Мінск, 2002.*
*3. Энцыклапедыя прыроды Беларусі. У 5 т. Мінск, 1983—1986.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

*Па гарызанталі:* 4. Кузня. 7. Русак. 8. Завея. 9. Вавёрка. 11. Карачун. 16. Блін. 17. Улас. 22. Палонка. 24. Ядловец. 26. Горка. 27. Склеп. 28. Мароз.
*Па вертыкалі:* 1. Узор. 2. Туман. 3. Валёнак. 5. Варажба. 6. Неруш. 12. Палац. 15. Траса. 18. Вячоркі. 19. Чачотка. 20. Каток. 21. Вецер. 25. Кара.
*Па дугах:* 10. «Калодка». 13. Аксіння. 14. Бярлога. 23. Карагод.

## СЁННЯ

| **Сонца** | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.28 | 18.19 | 9.51 |
| Віцебск — | 8.21 | 18.06 | 9.45 |
| Магілёў — | 8.19 | 18.09 | 9.50 |
| Гомель — | 8.11 | 18.10 | 9.59 |
| Гродна — | 8.43 | 18.35 | 9.52 |
| Брэст — | 8.40 | 18.39 | 9.59 |

**Месяц**
*Першая квадра 15.02-21.02.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**
*Пр.* Ганны, Івана, Мікалая, Рамана, Сямёна, Уладзіміра, Цімафея.
*К.* Дануты, Юльяны, Даніэля, Юльяна.



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +1..+3°C | КІЕЎ | 0..+2°C | РЫГА | +1..+3°C |
| ВІЛЬНЮС | -1..+1°C | МАСКВА | -5..-3°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ | -2..0°C |

Даты | Падзеі | Людзі

**16 ЛЮТАГА**



**1568** год — іспанская інквізіцыя вынесла смяротны прысуд усім жыхарам Нідэрландаў. Асаблівы царкоўны суд каталіцкай царквы пад назвай «Інквізіцыя» быў створаны яшчэ ў 1215 годзе папам Інакенціем III. Гэты інстытут дасягнуў свайго апагея ў 1478 годзе, калі кароль Фердынанд і каралева Ізабэла з санкцыі Папы Сікста IV заснавалі іспанскую інквізіцыю. Асноўнай задачай інквізіцыі з'яўлялася вызначэнне, ці з'яўляецца абвінавачаны вінаватым у ерасі. Вынікі знішчальнай дзейнасці іспанскай інквізіцыі толькі ў перыяд ад 1481 да 1498 года вызначаюцца наступнымі лічбамі: каля 8 800 чалавек было спалена на вогнішчы; 90 000 чалавек падпалі пад канфіскацыю маёмасці і царкоўныя пакаранні. Іспанская інквізіцыя ў Нідэрландах была ўсталявана Карлам V у 1522 годзе для барацьбы з пратэстантамі. І ў 1523 годзе ў Антверпене на вогнішчы спалілі двух першых пратэстанцкіх пакутнікаў. Для барацьбы з пратэстантамі прымаліся самыя суровыя меры. А некаторыя з рашэнняў інквізіцыі — такія, як смяротны прысуд усім (!) жыхарам Нідэрландаў (вядома ж, не выкананы), засталіся як своеасаблівыя кур'ёзы гісторыі. Увядзенне інквізіцыі ў Іспанскіх Нідэрландах стала адной з прычын Нідэрландскай рэвалюцыі 1566–1609 гадоў, у выніку чаго Нідэрланды распаліся на дзяржаву пратэстантаў і дзяржаву католікаў.

**1891** год — нарадзіўся Мікалай Фаміч Красінскі, беларускі тэатральны дзеяч. Скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай драматычнай майстроўні ў Вільні, дзе ў 1922 годзе паставіў спектаклі «У зімовы вечар» Э. Ажэшкі і «Лес шуміць» У. Караленкі. З 1925 г. — намеснік старшыні секцыі мастацтва і старшыня тэатральнай падсекцыі Інбелкульта. У 1926–1928 гадах — дырэктар БДТ-2. У 1938 годзе быў арыштаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960 годзе.

**1925** год — нарадзіўся (вёска Васілевічы Рэчыцкага раёна) Іван Навуменка, беларускі пісьменнік і літаратуразнаўца, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, народны пісьменнік Беларусі. У 1973—1982 гадах — дырэктар Інстытута літаратуры АН Беларусі, у 1982—1992-м — віцэ-прэзідэнт АН Беларусі, у 1992—2002-м — саветнік Прэзідыума НАН Беларусі, з 2002 года — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры НАН Беларусі. Апублікаваў больш за 200 навуковых прац, больш за 80 выдадзеных асобнымі кнігамі мастацкіх твораў. Аўтар раманаў «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці», «Асеннія мелодыі» і іншых. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972). У 2006 г. узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені. Памёр у 2006 годзе.

**Было сказана**

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса:**
*«Лёс — ён лёс. Не выпрасіш вякоў».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Муж на гадзіну — выдатная праца. Забіваеш цвік у сцяну, думаеш: чорт, усё жыццё мне сапсавала, пайду ад яе! І сыходзіш, яшчэ і плацяць за гэта.**

На 4-м тыдні вегатарыянскай дыеты галава літаральна праяснілася і стала працаваць нашмат лепш. Я разумею, што пара завязваць з гэтым глупствам.

**Званок мужу:**
**— Алё, дарагі, забярэш мяне?**
**— Не!**
**— Чаму?**
**— Ну ты ўчора купіла супервыдатныя і зручныя туфлі, на абцасе ў 15 см, які НАОГУЛ не адчуваецца! Вось і ідзі цяпер пешшу. І галоўнае, ад сцягна, дарагая, ад сцягна!..**

— Вось не ведаю, як і выкручвацца. Усё даражэе! Крухмал, бульба, мука, рыс, манка, ячныя і пярловыя крупы...
— Прабачце, а дзе вы працуеце?
— Я дырэктар кілбаснай фабрыкі.




Малюнак Аляксандра ПЯТРОВА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў несуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.108. Індэкс 63850. Зак. № 678.
Нумар падпісаны ў 19.30 15 лютага 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12